№ 18 (424) 13 траўня 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



## Соф’я Валадароўна, каралева Даніі

Сэнсацыйнае адкрыцьцё: дачка менскага князя Валадара Глебавіча з дынастыі Рагвалодавічаў была жонкай аднаго з наймагутнейшых каралёў Даніі. Іхныя дзеці сядзелі на дацкім, швэдзкім і францускім тронах. Між тым пра Sophie av Minsk og Polotzk няма нават згадкі ў шасьцітамовай «Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі».

старонка 12

ТЭМА

**Пасьля параду**

Віталь Тарас, Анатоль Сідарэвіч і Сакрат Яновіч пра шумны юбілей Перамогі. **Старонкі 2, 5.**
Фундамэнтальная гісторыя акупацыі, калябарацыі й супраціву ў Беларусі «Штодзённасьць за лініяй фронту» Бэрнгарда К’яры па-беларуску. **Старонка 8.**

СПОРТ

**Беларускі стыль пінг-понгу**

Сухая статыстыка пратаколаў шанхайскага чэмпіянату сьвету ня здольная адлюстраваць маштаб падзеі: у Беларусі склаўся свой пазнавальны стыль настольнага тэнісу. Гульня з доўгімі розыгрышамі можа цягнуцца не адзін дзясятак хадоў, калі ініцыятыва неаднаразова пераходзіць з рук у рукі і калі само валоданьне ёю не азначае роўна нічога. Піша Андранік Антанян. **Старонка 21.**

З УСІХ СТАРОН

**Блэр перамог**

Блэр можа сыходзіць. **Старонка 10.**

МУШТАРДА

**Сымбіёз Сынгапуру й Патаі**

Новая аўтарская рубрыка ў «НН»: Алесь Белы правым вокам у рубрыцы «Муштарда». **Старонка 7.**

ЗРАБІ САМ

**Унесьці помнік**

у Дзяржаўны сьпіс гістарычных каштоўнасьцяў — справа двух тыдняў. **Старонка 11.**

ХРОНІКА

**Лекавыя ўласьцівасьці партрэтаў**

Актывісты руху «Лімон» былі затрыманы ў Горадні падчас раздачы партрэтаў Лукашэнкі, якія нібыта мелі цудадзейныя ўласьцівасьці. Супрацоўніца аблвыканкаму запатрабавала ў іх сэртыфікат на лекавыя ўласьцівасьці. **Старонка 6.**

# Незалежнасьць ад Скарыны



Аляксандар Лукашэнка марыць пра вечнасьць і не забывае пры гэтым надзённых палітычных задачаў. Машэраў адказаў за дачку, заадно на задворкі гораду прыйшлося адправіцца Скарыну. Нашчадкі Машэрава: «Мы абражаныя, але ня зьдзіўленыя». Пратэстоўцы на Кастрычніцкай плошчы з партрэтамі Скарыны. Апазыцыя: «Гэта самадурства. Назвы вернем адным пакетам». Праспэкт Пераможцаў стане праспэктам Лукашэнкі? Старонка 3.

## Быў Сыс

У золкі дзень 9 траўня ў рытуальнай залі Дому літаратара ля труны, пакрытай бел-чырвона-белым сьцягам, сабраліся шэсьць дзясяткаў чалавек. Разьвіталіся з **Анатолем Сысом**. Адным з найбольшых беларускіх паэтаў XX стагодзьдзя.

Апошняй, хто бачыў Сыса жывым, была суседка-паэтка Ала Канапелька. Яна і зьвярнула ўвагу на тое, што трое сутак у яго менскай кватэры гарыць сьвятло. Выклікала міліцыю ды Анатолеву сястру Валянціну. Выбілі дзьверы. 45-гадовы паэт быў ужо колькі дзён нежывы. Дактары сказалі — ад 4 траўня. Прычыны сьмерці дагэтуль няясныя. Сьпярша называлі сардэчны прыступ, потым — магчымую язву, з-за якой у Сыса пайшла горлам кроў: у кватэры была крывавая пляма каля ваннага пакою.

«Я паэт, а вы ўсе пралятаеце», — ганарліва казаў Сыс лепш уладкаваным калегам. І чараваў сваімі шаманскімі вершамі, народжанымі з суплёту трох стыхіяў, трох цывілізацыяў — стэпу, лесу і гораду.

Сысова пакаленьне — тое самае, што «ў цемры расло». Інтуітыўныя шукальнікі беларушчыны. Праз кніжкі, раскопкі, адмаўленьне прапанаванай афіцыёзам схемы. Сыс апавядаў, як на занятківў «Гомельскі дзяржаўны ўнівэрмаг» яны хадзілі ў куфайках і гумовых ботах, падчас лекцыяў дэманстратыўна елі сала з цыбуляй, станавіліся кардонам перад уваходам на дыскатэку і пускалі толькі тых, хто цалаваў чырвона-зялёны БССРаўскі сьцяг... Чысты панк позьнесавецкай эпохі, з дапамогай якога імкнуліся намацаць, зразумець — што ж яно такое, *твая* Беларусь.

Беларусяй Сыса была паэзія. Да яе ён, блюзьнер і бажаволак па жыцьці, які пасьля рэфэрэндуму 1995 году бадзяўся па Менску зь вялізнай чырвона-зялёнай значкай на грудзёх, ставіўся надзвычай сур’ёзна. Ведаў сваю сілу.

**Працяг на старонцы 18.**

## 50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

СПЫНІЦЕ РАЗМОВЫ ПРА РАСКОЛАТУЮ АПАЗЫЦЫЮ. Падтрымка палітвязьняў ці сем’яў зьніклых, абарона Ліцэю ці гарадзкой тапанімікі — у кожным прынцыповым пытаньні незалежнае грамадзтва дзейнічае выключна салідарна. Людзі розных поглядаў, мовы і веры выяўляюць выяўляе поўнае адзінства на грамадзянскім узроўні, у базавых пытаньнях. Гэта непазьбежна знойдзе свой адбітак на палітычным узроўні. Хроніка грамадзянскага супрацiву — на **старонцы 6**.
ПУЦІН НЕ ЗГАДАЎ БЕЛАРУСІ ў сваёй прамове на Краснай плошчы 9 мая. Не згадаў і Ўкраіны, Польшчы. Не было мовы пра нашы краіны і ў ягоных шматлікіх інтэрвію эўрапейскім СМІ. Гэтага можна было чакаць, хоць гэта, у прынцыпе, абуральна. Усё ж менавіта нашы краіны найбольш пацярпелі ў той вайне. Па справядлівасьці, дык і з трыбуны мусіў бы выступіць не адзін Пуцін, а хоць бы хтосьці з цэнтральнаэўрапейскіх кіраўнікоў разам зь ім. Перамога належыць Беларусі, Украіне ў роўнай ступені з Расеяй. На жаль, у Расеі былі занятыя самасьцьвярджэньнем, а кіраўнікі Беларусі і Ўкраіны занадта розныя, каб салідарна дзейнічаць у інтарэсах дзьвюх краінаў.
ЗАСТАЕЦЦА ЗАГАДКАЙ, ЧАМУ ЛУКАШЭНКА, ЯК І СААКАШВІЛІ, Адамкус і Руйтэль, манкіраваў парад 60-годзьдзя ў Маскве, насуперак ранейшым плянам. Прычыны гэтае прыніжальнае адсутнасьці будуць, трэба думаць, у цэнтры ўвагі СМІ на гэтым тыдні.
ЗА ПОМПАЙ І ПАТЭТЫКАЙ сьвяткаваньня Дня перамогі прасьвечваў фармалізм і цынізм. Абы не парушыць зацьверджаны сцэнар параду ў Менску, парадкаў трымалі пад халодным дажджом. Усё дзеля таго, каб зрабіць з вайны пачатак беларускай гісторыі. Пра гэта піша Віталь Тарас.
ГЭТЫ НУМАР “НН” сабраўся з гістарычных матэрыялаў. Драматычная і рамантычная гісторыя жыцьця былога вязьня Ўладзімера Лялькова — гэта гісторыя каханьня, мацнейшага за турэмныя муры. Яна будзе цікавая ня толькі старэйшаму пакаленьню, якое памятае сьцюжныя гады сталінізму. **Старонка 14.** Іншую гісторыю каханьня апавядае Ўладзімер Содаль. Яе героі — пэрсанажы рэальныя і гістарычныя, Зоська Верас і Фабіян Шантыр. **Старонка 13.** Нарэшце, на старонцы 17 — новыя акцэнты ў палеміцы вакол Саюзу вызваленьня Беларусі, што працягвае публікацыі мінулых нумароў. Але вядома ж, пачніце з Соф’і Менскай. І як толькі гісторыкі не заўважалі такой гісторыі?

### Дык падпісвайся!

Падпісны індэкс «Нашай Нівы» 63125. Падпіску на «НН» прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку».
Цана на месяц — 3820 рублёў на поштах або 3530 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Перамога над Скарынам, альбо Дзякуй за мірнае жыцьцё!



Дэмакратыя — гэта фашызм. Гэта не цытата з раману Оруэла «1984». Гэта асноўны ідэйны пасыл Беларускага тэлебачаньня нашых дзён. Другая сусьветная вайна назаўсёды адыходзіць у эпоху мітаў — разам з дырыжаблямі. Але тапаніміку ўсё яшчэ спрабуюць выкарыстоўваць для зьвядзеньня рахункаў з палітычнымі апанэнтамі. Піша **Віталь Тарас**.

Напярэдадні 9 траўня 2005-га беларусы даведаліся аб перайменаваньні дзьвюх галоўных вуліц сталіцы. Праспэкт Скарыны цяпер будзе праспэктам Незалежнасьці, праспэкт Машэрава — Пераможцаў. Прынясеньне нацыянальнай гісторыі ў ахвяру сучаснай палітыцы сталася амаль рытуальным. Затушоўваньне імёнаў нядаўняга мінулага — характэрная прыкмета нашага часу. Імя Пятра Машэрава пакінута за меншай вулічкай. Выкарыстаньне тапанімікі ў мэтах зьвядзеньня рахункаў з палітычнымі апанэнтамі (у дадзеным выпадку — з дачкой былога кіраўніка БССР) сустракалася і ў ранейшай гісторыі...

Працяг на старонцы 4.

# Кіпучая дзейнасьць

Яшчэ не астылі дэбаты наконт улучэньня цэнтральнага праспекту Менску ў сьпіс спадчыны ЮНЭСКА ў якасьці ўнікальнага горадабудаўнічага ансамблю 1940—50–х гадоў, як аб’ект ізноў перайменаваны. Піша **Гары Куманецкі.**

І калі новаперайменаваны ўсё ж уключаць у сьпіс ЮНЭСКА, то Беларусь будзе рэпрэзэнтавацца ў сьвеце спадчынай савецкага таталітарызму, што да беларушчыны ня мае аніякага дачыненьня. Як бы ні называлі гэтую магістраль — імем Сталіна, Леніна ці нават Скарыны, — сутнасьць яе духу не мяняецца. Гэта цалкам штучнае ўтварэньне, што паўстала на руінах старажытнага гораду, яго сьвятынях й курганах. Яго архітэктура ніяк не вынікае з нашых традыцый.
Шанец, што быў атрымаў гэты ансамбль пасьля перайменаваньня ў 1991 годзе, быў страчаны. За гады незалежнасьці на праспэкце не паўстаў помнік Скарыну, не зьявілася нават мэмарыяльнае шыльды. Ён не набрыняў нічым “скарынаўскім” — знакамі, мэмарыяцыямі, шрыфтамі, дэкорам. Сталінскі праспэкт застаўся сталінскім, увесь усыпаны таталітарнай сымболікай, зь яе неадэкватнай пампэзнасьцю, з помнікамі Дзяржынскаму й Калініну. Не хапіла тады волі паставіць мэмарыял ахвярам сталіншчыны, уславіць тут БНР. Уласна беларускага тут — мізэр! Таму нічога сутнасна для нас не зьмянілася.
Як і ня зьменіцца нічога на праспэкце Машэрава, што па завядзёнцы старэйшыя людзі завуць і будуць зваць Паркавай.
Нічога наагул ня зьменіцца ў беларускай сталіцы, пакуль тут будуць вуліцы Інтэрнацыянальная й Камуністычная, Камсамольская й Рэвалюцыйная.
Дзівіць іншае — чым занятая галава Лукашэнкі. Цяпер ён вырашыў перайграць нават блізкую сабе савецкую гісторыю. І, падазраю, гэта толькі пачатак вялікае кампаніі. Мабыць, пасьля рэканструкцыі плошчы Незалежнасьці ёй вернуць “гістарычнае” імя Леніна. А там паедзе…

## СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ

### Праспэкт Юдзіфі

Мая Юдзіф убок адклала плэер.
Падняла меч. Пайшла на прамэнад.
Яна ніколі не прамовіць never —
нават калі па пчолах б’юць з гармат.
Мая Юдзіф імкнецца ў стан варожы,
між “мэрсэдэсаў”, танкаў і трыбун,
кінапрэм’ераў, VIP-пэрсон і ложаў
(няшлюбных і масонскіх), праз табун
асьліцаў баявых, сланоў з фарфору
і зайцаў з шакаляду. Ёй ісьці
й глядзець на сэрфінг — той, што ў прэсным моры,
пляваць на бл.дзтва — тое, што ў жыцьці.
Мая Юдзіф шукае Алафэрна,
каб без прэлюдый скончыць парнафільм,
у сэнсе — перарваць, спыніць. Напэўна
ёй засталося толькі пару хвіль,
каб зьдзейсьніць плян і рушыць на праспэкты
пад цёплы дождж сапраўдных перамог.
Каб ганьба зьнікла ў снах плюсквампэрфэктаў.
Каб віншаваньні на мабільнік скінуў Бог.

*9 траўня 2005 г.*

# Незалежнасьць ад Скарыны

Напярэдадні Дня Перамогі, 7 траўня, Аляксандар Лукашэнка падпісаў указ аб перайменаваньні галоўных сталічных праспэктаў і некалькіх вуліц. Праспэкт Скарыны ён назваў праспэктам Незалежнасьці, Машэрава — Пераможцаў. Вуліцы Дразда, Ерусалімская і Варвашэні аб'яднаныя ў пакручасты праспэкт Машэрава, а Старабарысаўскі тракт на паўночным усходзе Менску стаў вуліцай Ф.Скарыны. Спачатку людзі думалі, што ўказ аб перайменаваньні — кепскі жарт апазыцыі, піша **Сяргей Будкін**.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Навіне, што выставіў партал TUT.BY, спачатку не давалі веры. Аднак аказалася, што праўда. Паўсотні маладых людзей пратэставалі супраць такога рашэньня ўвечары ў аўторак у цэнтры Менску.

У пачатку 1990-х менскім вуліцам паспрабавалі вярнуць гістарычныя назвы, але саветафільскія ўлады ідэю замялі. Гісторык Захар Шыбека кажа, што патрэба перайменаваньня мусіравалася штогод напярэдадні Дня Перамогі. Аднак далей за абмеркаваньне справа пакуль не заходзіла. Так, тры гады таму ішла гаворка пра наданьне праспэкту Скарыны назвы Пераможцаў. Перайменаваньне — працэдура цяжкая і нязручная: зьмяненьне прапіскі, перааафармленьне дакумэнтаў, для юрыдычных фірмаў — перарэгістрацыя.

## Пачалося з «7 дней»

Ёсьць і маральны аспэкт. Нашчадкаў Пятра Машэрава рашэньне А.Лукашэнкі абразіла, але ня стала нечаканасьцю. «Для нас была нечаканай сьмерць Пятра Міронавіча. Што да гэтых рашэньняў, дык ранейшыя публікацыі ў прэсе дазволілі нам зрабіць высновы і маральна падрыхтавацца да такой хады падзей, для нас гэта не навіна, — кажа муж Натальлі Машэравай Уладзімер Пятроў. Зь ягоных словаў, яны прадчувалі падрыхтоўку адпаведнага рашэньня, пасьля таго як пра неабходнасьць вяртаньня праспэкту Машэрава ранейшай назвы — Паркавая магістраль — загаварыла газэта агенцтва БелТА «7 дней». Аўтарцы артыкулу «журналістцы і настаўніцы Н.Петрыкавай» сучасная назва праспэкту падавалася недарэчнай: «Мне незразумела, навошта 20 год таму вуліцы з такой удалай назвай надалі імя Машэрава».

Сама Натальля Машэрава цяпер адсутнічае ў Менску.

«Апошнія навіны яе ня ўзрадавалі, але пазыцыя жонкі такая: гісторыя ўсё расставіць па сваіх месцах, раней ці пазьней», — гаворыць У.Пятроў.

## Абнуліць гісторыю

Палітоляг Уладзімер Мацкевіч рашэньне ўладаў уважае за бязглузды энтузіязм: «Старабарысаўскі тракт меў такую назву і да вайны, і да рэвалюцыі — гэта вынішчэньне гістарычнай памяці. Новай уладзе прыйдзецца вярнуць ранейшую тапаніміку адным пакетам», — падтрымлівае ён прапанову Вінцука Вячоркі. Дарэчы, толькі Старабарысаўскі тракт зьнікне з мапы гораду, іншыя вуліцы будуць проста перанесены. За рашэньнем «панізіць Скарыну» праглядаецца жаданьне панізіць беларускую культуру ў сымбалічнай герархіі гістарычных падставаў нацыі.

А ў «паніжэньні Машэрава» многія бачаць каньюнктурны палітычны падтэкст. Аляксандар Казулін, кіраўнік грамадзкай ініцыятывы «Воля народу», выказаўся катэгарычна: «Такое рашэньне можна прыняць хіба ў неадэкватным стане — у гонар Перамогі перайменаваць праспэкт імя героя вайны Машэрава, ды яшчэ нібыта па просьбе вэтэранаў!» Дачка Машэрава адкрыта заяўляе пра сваё непрыманьне дзяржаўнай палітыкі, вось улады і скарысталі момант, каб абнуліць гісторыю. Каб прынізіць маштаб

> Уладзімер Арлоў: «У працяг я б прапанаваў па просьбах вэтэранаў, працоўных і беспрацоўных нашу сталіцу перайменаваць у Саўмінск».

постаці Пятра Машэрава. «Але ж Скарына ня ставіў подпісу пад нашым зваротам!» — іранізуе Казулін.

Зяць Пятра Машэрава мяркуе, што перайменаваньне на адаб'еццца на масавай сьвядомасьці: «Яшчэ ў савецкія часы казалі пра змаганьне з «культам Машэрава» — змагаюцца і дагэтуль. Аднак зьмена назваў ня зьменяць стаўленьня людзей».

## На Быкава няма сродкаў

Падобнай думкі, што справа перайменаваньня зьвязана з палітычнай дзейнасьцю Н.Машэравай, трымаецца й Вольга Іпатава. Пісьменьніца зьвяртае ўвагу і на гістарычную падаплёку. «Мы вяртаемся ў савецкія часы. Тады казалі, што наша гісторыя пачынаецца з 1917 г., цяпер — з 1945 г. Скарына вырваны з кантэксту сёньняшняй ідэалёгіі». Пісьменьніца нагадвае, што на ініцыятыву грамадзкасьці назваць вуліцу ў гонар Быкава чыноўнікі аднагалосна спасылаліся на адсутнасьць сродкаў. Цяпер сродкаў, відаць, бракаваць ня будзе.

У прэс-службе прэзыдэнта рашэньне пра перайменаваньні тлумачаць наступным чынам: «Паколькі ў раёне плошчы Незалежнасьці ў 1944 г. адбыўся партызанскі парад у гонар вызваленьня сталіцы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, заканамерна і гістарычна справядліва, каб галоўная артэрыя Менску — праспэкт, які пачынаецца ад плошчы, — мела назву праспэкту Незалежнасьці».

Гісторыкам з адміністрацыі пярэчыць гісторык Другой сусьветнай вайны Аляксей Літвін, які зазначае, што партызанскі парад 1944 г. прайшоў у раёне сёньняшніх вуліц Першамайская—Кастрычніцкая—Лодачная, на старым іпадроме, але ні ў якім разе не «ў раёне плошчы Незалежнасьці». Пра ягонае месца няцяжка было спытацца ў былых удзельнікаў параду, напрыклад, Янкі Брыля.

## Піяр-ход прэзыдэнта

Перайменаваньне праспэкту Машэрава зьдзейсьнена, паводле прэс-службы прэзыдэнта, дзеля ўшанаваньня вялікага подзьвігу салдат, партызан і падпольшчыкаў, працаўнікоў тылу. І ў гонар той жа Перамогі вуліцы Ерусалімская, Дразда і Варвашэні аб'яднаныя ў праспэкт, які «названы ў гонар выдатнага партызанскага камандзіра, Героя Савецкага Саюзу, дзяржаўнага дзеяча Беларусі Пятра Міронавіча Машэрава». «Можа, праспэкт Дзяржынскага пераймянуем у праспэкт Варвашэні, праспэкт Жукава — у праспэкт Дзяржынскага, а Партызанскі — у праспэкт Жукава?» — іранізуюць на інтэрнэт-форумах. Дарэчы, паводле вынікаў апытаньня, што праходзіла на «Tut.by», 98% адмоўна паставіліся да піяр-ходу прэзыдэнта.

## Наступае туркмэнбашызм

Першая акцыя пратэсту супраць перайменаваньняў адбылася 10 траўня. На Кастрычніцкай плошчы сталіцы сабралася некалькі соцень маладых людзей. Прысутныя пастроіліся ў ланцуг. Але празь некалькі хвілін ланцуг разагнаў АМАП, а самых актыўных зацягнулі ў міліцэйскі аўтобус.

На 12 траўня заплянаваны смарт-моб: а 18-й кожны можа засьведчыць сваю неабыякавасьць ды напісаць крэйдай на бруку назвы сваіх праспэктаў. 15 траўня моладзь плянуе выйсьці на Кастрычніцкую плошчу з партрэтамі Скарыны.

Удзельнікі акцый пратэсту называюць рашэньне каньюнктурным. «Краіна ўступіла ў пэрыяд поўнага самадурства. Пачынаецца туркмэнбашызм», — сказаў мне малады чалавек з значкам Скарыны на грудзях.

Назіральнікі выказваюць меркаваньне, што А.Лукашэнка «зарэзэрваваў на будучыню» назву другое па значэньні магістралі сталіцы для сябе як для галоўнага айца нацыі. «Праспэкт Пераможцаў» — назоў неканкрэтызаваны, гучыць як часовы. А вось вартасьць Незалежнасьці больш ня ставіцца пад пытаньне. Хоць гэтае слова розныя палітычныя сілы разумеюць па-рознаму. Праўда, ёсьць падставы засумнявацца, ці доўга пратрымаюцца новыя назвы пры палітычнай сыстэме, якая так мала шануе традыцыі і так часта мяняе тапаніміку.

## СЬЦІСЛА

### Працэс дзевяцёх

У Беластоку ў сераду адбыўся папярэдні разгляд справы сяброў Праграмнай Рады штотыднёвіку «Ніва». Пракуратурай «Беласток—Поўдзень» яны вінавацяцца ў неадпаведным выкарыстаньні бюджэтных сродкаў. «Ніўцы» ўважаюць справу за спробу ўціску беларускага жыцця ў Польшчы. Паводле заканадаўства, пры ўмове прызнаньня сваёй віны, сябры Праграмнай рады маглі без разгляду атрымаць мінімальнае пакараньне — умоўнае закрыцьцё справы і па 600 злотых штрафу кожны. Але такі падыход іх не задаволіў, будзе суд, артыкул крымінальнага кодэксу прадугледжвае да васьмі год пазбаўленьня волі. Дзень суду яшчэ ня вызначаны.

### Арыштаваны дырэктар «Песьняроў»

Перад 9 траўня ў Менску быў арыштаваны дырэктар «Дзяржаўнага ансамблю «Песьняры» Валер Скаражонак. Паводле «Хартыі, 97», яго вінавацяць у буйных фінансавых растратах. Скаражонак быў прызначаны кіраўніком «Песьняроў» пасьля сьмерці Ўладзімера Мулявіна ў студзені 2003 г.

### Начная варта музэю

Нацыянальны мастацкі музэй (НММ) у ноч з 14 на 15 траўня, напярэдадні Сусьветнага дня музэяў, будзе адчынены з 21-й да 1-й гадзіны ночы. Галоўныя падзеі разгарнуцца на пляцоўцы перад самім музэем і ў фае: будзе прадстаўлена выстава мастацкай фатаграфіі, а таксама паказ твораў мастакоў бодзі-арту. Адмыслова да гэтай падзеі дырэктар НММ Уладзімер Пракапцоў напісаў карціну «Кажан».
«Ноч музэяў» праводзіцца ў рамках акцыі «Вясна музэяў», у якой удзельнічаюць больш чым 2 тыс. музэяў Эўропы. Беларусь бярэ ўдзел у акцыі другі год.

### Ваенны інтэрас

Беларусь не плянуе скарачаць экспарту ўзбраеньня і ваеннай тэхнікі, заяўляюць ў Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэце краіны. Спэцыялісты камітэту ня бачаць «нічога няправільнага» ў тым, што Беларусь прадае лішкі запасаў узбраеньня і ваеннай тэхнікі з рэзэрву Мінабароны на міжнародным рынку. Дзяржваенпрам адзначае, што наша краіна ўвайшла ў дзясятку вядучых экспартэраў узбраеньня ў сьвеце.

### Мінюст тармозіць Казуліна

У Міністэрстве юстыцыі заяўляюць, што, як вынікае з пададзеных матэрыялаў, 10 красавіка на пазачарговым зьезьдзе Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) пытаньне пра аб'яднаньне партыі не разглядалася. Нагадаем, што месяц таму ў Сеньніцы пад Менскам было прынята рашэньне аб уваходжаньні Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады ў склад БСДП (НГ), кіраўніком аб'яднанай партыі быў абраны Аляксандар Казулін.

### Знак рубля

Нацыянальны банк зацьвердзіў графічны знак нацыянальнай валюты. Графічны знак беларускага рубля пададзены ў выглядзе дзьвюх літар лацінскага альфабэту «Br». «B» азначае беларускі, «r» – рубель. На конкурс было пададзена каля пяці тысяч варыянтаў. Пераможца атрымае прэмію ў памеры 50 базавых велічыняў.

**АГ; charter97.org, svaboda.org**

# Перамога над Скарынам,
## альбо Дзякуй за мірнае жыцьцё!

Працяг са старонкі 2.

У астатнім 9 траўня было амаль такім самым, як заўжды. Начныя рэпэтыцыі параду, сьвяточныя трыбуны — вялікія й малыя, з высокім і ня надта высокім начальствам на іх, дэфіляда тэхнікі, шэрагі вэтэранаў, сагнутых пад цяжарам узнагародаў, зухаватыя суворáўцы, начны салют і гуляньні. Але ў той самы час цяжка было пазбавіцца ўражаньня, што ўсё гэта назаўжды адыходзіць у нябыт. Так бы мовіць — апошні парад наступае...

### Абы не было вайны

Расьцяжкі й транспаранты на вуліцах: «9 мая — 60 год Вялікай Перамогі!» — усе былі на аднолькавы лад, як быццам па зацьверджанай недзе невядомымі ваеннымі цэнзарамі кальцы. На гэтым тле віншаваньне ад фірмы «Вэлком» магло падацца нават арыгінальным. На бігбордзе зь лягатыпам гэтай кампаніі можна было прачытаць: «Дзякуй за 60 гадоў мірнага жыцьця!». А з плякату ўсьміхаюцца маладыя сэксапільныя дзяўчаты... Аднак жа і тут зусім відавочна скарыстаная на новы лад старая няхітрая формула: абы не было вайны.

Дык яе й не было. І не магло быць. Проста ня можа быць тае вайны, пра якую пісалі савецкія пісьменьнікі, якую малявалі савецкія мастакі, паказвалі ў савецкім кіно, пра якую распавядалі з экранаў тэлебачаньня савецкія вэтэраны. Тая праўда аб вайне, аб якой здолелі напісаць Адамовіч, Быкаў, пахаваная пад тонамі твораў баталістаў-марыністаў, сьмершаўцаў-гэбістаў, рознага рангу запісных партыйных кіраўнікоў. Некалькі адносна праўдзівых фільмаў і тэлеперадач сталіся толькі дадаткам, заўвагай на палях шматтомнай афіцыйна-патрыятычнай эпапэі «гісторыя Вялікай айчыннай».

Клімаўская карціна «Ідзі й глядзі» паводле Адамовіча, якая выйшла ў 1985-м, была прыхільна сустрэтая часткай тагачасных кінакрытыкаў і вельмі халодна — беларускімі кінематаграфістамі. А далей, як у вядомай п᾽есе — цішыня. Адзін суцэльны бясконцы кінафотарадыётэлесэрыял пра гераічных воінаў і партызанаў.

60 — лічба магічная. Ва ўсходнім календары, як вядома, ёсьць 12-гадовы цыкл, дзе за кожным годам замацаваная назва пэўнай міталягічнай жывёлы. Кожны знак мае пяць розных праяваў — паводле колеру й прыналежнасьці да розных відаў стыхіі. Пяць 12-гадовых пэрыядаў утвараюць поўны завершаны цыкл.

З гледзішча чалавечага веку, 60 гадоў — гэта той адрэзак часу, які чалавек здольны ўсьвядоміць як нешта цэласнае і агляднае, тое, што можна супаставіць са сваім жыцьцём. Далей пачынаецца гісторыя. Альбо міталёгія... Гэта ўжо залежыць ад таго часу, у якім жыве чалавек. І ад яго ўласных здольнасьцяў, зразумела. Напрыклад, ад уменьня й жаданьня думаць.

Ня толькі штатныя ідэолягі ды інжынэры чалавечых душаў канструявалі міт пра вайну. Самі яе ўдзельнікі-вэтэраны ахвотна прымалі ўдзел у стварэньні ідэалізаванага (паводле савецкіх узораў) аблічча вайны. Ім не навязвалі вобразаў герояў — яны самі хацелі сябе такімі бачыць. Дакладней, лічылі, што так трэба. І не памыляліся, бо гэтага вымагала ад іх дзяржава, заснаваная на мітах. Пры гэтым вэтэраны самі добра ведаюць цану сваім расказам «на тэлекамэру».

Гераіні кнігі Алексіевіч «У вайны не жаночае аблічча» распавядалі ёй пра сваё вайсковае жыцьцё так, як распавядалі б сваім сяброўкам. Але ўбачыўшы свае апавяданьні надрукаванымі, абурыліся і нават падалі на аўтарку ў суд. Вядома, аб вайне так пісаць няможна. Яны ж павінны быць гераінямі, прыкладам для нашчадкаў...

### Склероз як сымбаль

Апатэозам такой манеры можна лічыць 10-сэрыйную стужку, паказаную на БТ адмыслова да сёлетняга юбілею.

Фільм распачынае закадравы аповед старога чалавека, які спрабуе ўспомніць нешта пра 22 чэрвеня 1941 году, але хутка пачынае плакаць, не разумеючы цалкам, пра што і да чаго ён гаворыць. Рэжысэр, які ў адмысловай тэлеперадачы назваў яго «новым словам у дакумэнтальным кіно», без усялякага сораму выстаўляе гэты маразматычны плач як свайго роду сьцяг, эмацыйны зачын... Амнэзія выдаецца за... праўду аб вайне. Вось ужо сапраўды сымбаль сучаснай кінадакумэнталістыкі!

Рэжысэру й заказчыкам фільму не прыходзіць да галавы, што выкарыстаньне сьлёз няшчаснага склеротыка дзеля ілюстрацыі «народнага подзьвігу» ў вайне выглядае амаральна — хаця б у дачыненьні да самых вэтэранаў.

Зразумела, што міты паасобку не нараджаюцца. Часьцей за ўсё яны ствараюцца парамі. Так, побач зь мітам пра савецкага, чыстага, як крышталь, воіна або партызана створаны міт пра паліцая-калябаранта. А паколькі ў сучаснай Беларусі паліцаяў не павінна было застацца, бо тады, хочаш ня хочаш, губляецца вобраз беларусаў, якія «ўсе як адзін» сталі на абарону Радзімы, то ворагаў шукаюць у суседніх Польшчы ці краінах Балты. І знаходзяць, зразумела. У асобе былых жаўнераў Вафэн-СС, напрыклад. «Гэтыя фашысты», маўляў, шпацыруюць па вуліцах Рыгі ці Таліна, прыцясьняюць рускае насельніцтва ды пагражаюць мірнаму стваральнаму жыцьцю новай Беларусі...


Юлія Дарашкевіч

Пра тое, колькі засталося тых вэтэранаў, ці могуць яны камусьці чымсьці пагражаць, гаворкі няма. Гэта трэба глытаць з тэлеэкрану, таксама як і міт пра гераічны подзьвіг савецкага народу, без разважаньняў — рэфлекторна.

Прапагандысцкія міты ствараюцца не дзеля таго, каб у іх верылі. Міты ствараюцца дзеля зручнасьці, каб кожны хутка мог вызначыцца на практыцы: свой— чужы. Савецкі (значыць, чысьцей за ўсё, расейскі) — свой, беларускі нацыяналіст — чужы. Масква — надзея і апірышча. Захад — асяродак зла й распусты…

Наколькі даўгавечнымі застануцца міты, зьвязаныя з вайной? Ці доўга ўдасца іх яшчэ выкарыстоўваць кіроўнаму рэжыму? Каб адказаць на гэтае пытаньне, варта ўспомніць гісторыю іншага міту, які яшчэ нядаўна здаваўся такім самым вечным, як міт пра Вялікую Перамогу. 60-годзьдзе Вялікага Кастрычніка таксама адзначалася надзвычай пампэзна, у абстаноўцы «патрыятычнага ўздыму ўсяго савецкага народу». Так пісалі газэты, але ніякага ўздыму ці хаця б падабенства на энтузіязм у сапраўднасьці не назіралася. Бо не было ўжо амаль нікога з вэтэранаў Кастрычніцкага перавароту, як называлі яго самі бальшавікі.

### «Прыйдзе Вялікая кастрычніцкая рэвалюцыя!»

Сярод агромністай колькасьці кніг і спэктакляў на тэму Кастрычніка не было ніводнага твору, які дажыў бы, застаўся цікавым да сёньня. Чапаеў зь Леніным разышліся на анэкдоты. Мюлер з Штырліцам чакалі свайго часу. Тады ў беларускім літаратурным асяродку была папулярнай пародыя на аднаго раманіста. Селяніна — героя ягонага раману, дзеяньне якога адбываецца пасьля Рэвалюцыі 1905 году, пакрыўдзіў нейкі пан. У адказ селянін пагражае крыўдзіцелю: «Ну, пачакай ужо — прыйдзе Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя!..»

І менавіта тады нарадзіліся абрэвіятуры для азначэньня вэтэранаў: ВОСРы і ВОВы. Ветераны Великой октябрьской социалистической революции и ветераны Великой отечественной войны.

75-годзьдзе рэвалюцыі ніхто ўжо ўрачыста не сьвяткаваў — нават камуністы. Бо не было ўжо тае дзяржавы, пачатак якой паклалі ў 1917-м Ленін і кампанія.

### Вайна без канца

Упартасьць, зь якой Крэмль адмаўляецца прызнаць акупацыю балтыйскіх краінаў у 1940-м, нагадвае ўпартасьць, зь якой расейскія думцы, а таксама кіраўніцтва Беларусі спрабавалі рэвізаваць Белавескія пагадненьні ды абвесьціць развал СССР незаконным. Зрэшты, пуцінскае кіраўніцтва не хавае намераў адрадзіць Савецкі Саюз у тым або іншым выглядзе, і ключавая роля ў гэтым «адраджэньні» адводзіцца Беларусі.

І ў Маскве, і ў Менску «новыя рэваншысты» ўпарта не жадаюць заўважаць таго, што пасьля заканчэньня Другой сусьветнай вайны, Ялты й Нюрнбэргу была яшчэ трэцяя сусьветная вайна. Яна называлася «халоднай» толькі таму, што падчас яе ўжываць ядзерную зброю ўрэшце не спатрэбілася. Савецкі Саюз пацярпеў у той вайне, дакладней — у гонцы ўзбраеньняў, поўную і канчатковую эканамічную паразу.

Захад, аддаючы сёньня даніну мінуламу, шануючы памяць пра мільёны ахвяраў, уганароўваючы сваіх вэтэранаў вайны, даўно заняты постындустрыяльнымі праблемамі сучаснасьці. Сучаснасьці, у якой няма больш процістаяньня дзьвюх супэрдзяржаваў. Новыя праблемы, што паўсталі перад Эўропай, ня менш, а мо й больш складаныя, чым тыя, што трэба было вырашаць у XX ст. І вось гэтым, а ня тым, што нехта на Захадзе хоча прымяншыць значэньне вайны альбо ролю ў ёй Савецкага Саюзу, тлумачыцца той відавочны факт, што гадавіна перамогі над фашызмам ня ёсьць і ніколі ўжо ня будзе галоўнай падзеяй для Эўропы. Для эўрапейцаў гэта падзея гісторыі. Але не сучаснасьці.

А Менск і Масква ўсё яшчэ жывуць настальгіяй аб Перамозе. Бо акрамя гэтага міту больш ім пахваліцца перад сьветам няма чым.

Нехта сказаў, што генэралы заўсёды рыхтуюцца да мінулае вайны. Сёньняшнія беларускія й расейскія «генэралы» рыхтуюцца нават не да мінулай, але — пазамінулай вайны!

Калі верыць зьвесткам Інтэрнэту, нядаўна ў нетрах Міністэрства абароны Беларусі нарадзілася ідэя выкарыстоўваць у якасьці альтэрнатывы амэрыканскім самалётам-выведнікам АВАКС... дырыжаблі, якія могуць несьці дзяжурства ўздоўж мяжы на вышыні 3—4 тысячы мэтраў. Дырыжаблі можна вырабляць з танных матэрыялаў, і яны эканамічныя ў эксплюатацыі. Карацей кажучы — наперад і вышэй! А можа, гэта чарговы крок да стварэньня новай рэальнасьці? Накшталт той, што адлюстраваная ў папулярным фільме «Авіятар»?

# Апошні шумны юбілей

СССР не любіў успамінаць пра сваю віну перад народам. Але мы павінны нястомна нагадваць і пра «Мы за ценой не постоим», і пра «новы Берасьцейскі мір», які Сталін хацеў заключыць з Гітлерам. Піша **Анатоль Сідарэвіч**.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

З 60-годзьдзя завяршэньня Другое сусьветнае вайны яны выціснулі ўсё, што маглі. Хлусілі не чырванеючы. Што ні тэзіс, то стары прапагандысцкі штамп. А галоўныя тэзісы былі: на змаганьне ўстаў увесь савецкі народ; вайна згуртавала народы Савецкага Саюзу; Савецкі Саюз адзін перамог Нямеччыну.

Як увесь савецкі народ устаў на змаганьне з нацыстамі, сьведчыць адна лічба: у гітлераўскіх вайсковых структурах кожны пяты быў з савецкіх грамадзян.

Як вайна згуртавала народы СССР, мы ведаем з гісторыі высылак немцаў Паволжжа, чачэнцаў, калмыкаў, крымскіх татар… З гісторыі масавых дэпартацый насельніцтва Балтыі і Заходняе Ўкраіны. З гісторыі масавых уцёкаў на Захад мільёнаў людзей зь Беларусі, Дону, Кубані…

Сьцьвярджаць, што СССР перамог Нямеччыну, можа толькі той, хто нічога ня чуў пра Эндліз, Аб’яднаныя Нацыі і Другі фронт. І адкрыўся ён ня ў чэрвені 1944 году ў Нармандыі, як пішуць у падручніках, а ў час бітвы пад Сталінградам: тады брытанцы пачалі бамбардзіроўкі Нямеччыны, а разам з амэрыканцамі — бітву за Паўночную Афрыку. У ліпені 1943-га (ішла Курская бітва) яны былі на Сыцыліі. А праз два месяцы Італія капітулявала, і Гітлер мусіў накіраваць на Апэнінскі паўвостраў не адну дывізію.

Разумеючы фальшывасьць тэзісу «СССР перамог Нямеччыну», яны спрабуюць падмяніць яго яшчэ адным фальшывым тэзісам: «Савецкі Саюз зрабіў самы важкі ўклад у перамогу над Нямеччынай». На якіх вагах гэта ўзважана і якім мэтрам гэта зьмерана? Мусіць, колькасьцю палеглых на той вайне. Але гэта вынік бяздарнае палітыкі сталінскага кіраўніцтва, якое аддало немцам тэрыторыю ад Беластоку да Сталінграду (гнілая царская Расея далей як у Баранавічы іх не пусьціла). Гэта вынік бесчалавечных мэтадаў вядзеньня вайны. СССР так і ня змог палічыць усіх палеглых і замучаных. Ці гэта не адзнака зьняважлівага стаўленьня да чалавечага жыцьця?

Сталінскія маршалы («Мы за ценой не постоим») клалі на адным квадратным кілямэтры вызваленае тэрыторыі гэтульکі салдатаў, як ніводная армія сьвету. А мільёны палонных у першыя месяцы вайны? А панішчаныя заградатрадамі? А забітыя і спаленыя энкавэдыстамі мірныя жыхары Беларусі і Ўкраіны? А мільёны эмігрантаў, якіх таксама запісалі ў нябожчыкі?

Сёлета быў апошні ўсплёск бальшавіцкага патрыятызму. Зрэшты, ён закрануў толькі вярхі грамадзтва і толькі частку ўдзельнікаў вайны. Чым далей ад сталіцы, тым менш было шуму і чаду. Сотні тысяч грамадзян, не мабілізаваных на ўрачыстасьці, былі занятыя іншым. Яны пазіралі на неба і ўслухоўваліся ў мэтэапрагнозы: ці хоць пацяплее, ці можна сеяць і садзіць на лецішчах і гародах?

Халодная вясна паказала, што наша краіна яшчэ ня выйшла з эпохі натуральнае гаспадаркі, што заробкаў на годнае жыцьцё не хапае. За 60 паваенных гадоў мы так і не дасягнулі галоўнае перамогі — над беднасьцю.

Настае час разьвітаньня з ваенным пакаленьнем, якому дзяржава так і не сплаціла даўгі. Застануцца тыя, перад кім дзяржава вінаватая найбольш. Гэта дзеці вайны. Тыя, каго Сталін і начальнік генштабу Жукаў здалі пад уладу нацыстаў. Тыя, хто жыў у зямлянках і карміў вошы, хто цягаў на сабе плугі і бароны, каб не памерці з голаду… Ім належаць мэдалі за пакуты.

СССР і ягоныя спадкаемцы не любілі і ня любяць успамінаць пра сваю віну перад народам. Але мы павінны нястомна нагадваць і пра тых, хто давёў да Беластоцкага катла, да Сеньненскай катастрофы бранятанкавых войскаў, да Трасьцянца і гета… І пра тое, як Сталін хацеў заключыць з Гітлерам «новы Берасьцейскі мір» ды здаць Беларусь Нямеччыне. Калі наша грамадзтва будзе памятаць і думаць найперш пра гэта, тады сапраўды Беларусь стане дзяржаваю для народу Беларусі.

# Дзяды расказвалі мне пра іншую вайну

У дзяржаўных СМІ кожны распавядае, як ён забіваў фашыстаў ці хоць дапамагаў партызанам. Хай мне даруюць, але часам здаецца, што некаторыя расказы падобныя да «бервяна Ільліча». Усё гэта не стасуецца з расповедамі простых беларусаў. Піша **Руслан Равяка**.

Адзін мой дзед служыў у Войску Польскім і ўжо ў 1939 г. паваяваў з нацыстамі, прайшоў праз усю Польшчу і быў схоплены саветамі за некалькі кілямэтраў ад вёскі. Колькі месяцаў адбыў у лягеры ў Іванаўскай вобласьці, вярнуўся. І ў 1944 г. падрабіў дакумэнты, абы не служыць за Саветаў. Пакарміўшы вошай за нішто, казаў, ваяваць за такую краіну не хачу. Ад яго я, малы смаркач, пачуў пра Катынь, пра сакрэтную дамову Молатава—Рыбэнтропа.

Ён не лічыўся вэтэранам, і толькі недзе ў 1990-х атрымаў, за колькі гадоў да сьмерці, польскі мэдаль і польскую штомесячную грашовую дапамогу. Дарэчы, і сёньня падчас сьвяткаваньня ўдзельнікі вайны 1939 году ня ўзгадваюцца беларускімі ўладамі. А жыве іх, дзякаваць Богу, у Заходняй Беларусі шмат.

Другі дзядуля, прызваны ў 1944 г., першы раз у жыцьці назваўся палякам. Каб трапіць не ў Чырвоную, а ў Польскую Армію Людову. Дзеля гэтага давялося адседзець тыдзень у Баранавіцкім НКВД, дзе органы даводзілі майму дзядулі, што ён праваслаўны беларус, не павінен служыць палякам. Дзед працярпеў допыты, стрэлы зь пісталета над вухам. І стаўся жаўнерам Войска Польскага.

Усе зь вёскі, каго забралі ў савецкае войска, загінулі ў Прусіі. Дзед з польскім войскам даехаў да Бэрліна, а там… скончылася вайна. Ён вярнуўся дахаты ў 1945-м, калі савецкія жаўнеры паехалі ваяваць на Далёкі Ўсход.

Другі дзядуля ацалеў у 1941 г. Прызваны напярэдадні вайны, ён трапіў з сваім палком у акружэньне. Ня маючы зброі, нейкі маёр распусьціў іх па хатах. Дзед вярнуўся цудам — на шляху вяртаньня яго спачатку зьбіралася расстраляць «нейкая камуністка ў скуранцы», а пасьля да кабуры цягнуўся п’яны немец. На шчасьце, іншыя фашысты своечасова адцягнулі п’янтоса.

Афіцыйная і народная вайна дасюль розьняцца ў сваіх выкладаньнях.

# Сакрат Яновіч пра 60-годзьдзе Перамогі



САКРАТ ЯНОВІЧ (нар. у 1936, жыве ў Крынках на Беласточчыне) — пісьменьнік, грамадзкі дзеяч. Рэдактар альманаху «Annus Albarutenicus».

Чаму гітлераўцы атакавалі Савецкі Саюз ужо летам сорак першага, будучы яшчэ ў два-тры разы слабейшымі? Маючы менш усяго, і то значна: самалётаў, танкаў, артылерыі, урэшце, жывой сілы. Невыпадкова Сталін не адразу паверыў рапартам, што Нямеччына выступіла з вайною. Слабейшы пакрочыў на мацнейшага.

Афіцэрскіх кадраў драматычна не хапала пасьля масавых расстрэлаў 1930-х. Пушчана «ў расход» тады было пад сорак тысяч камандзіраў; у выніку такое чысткі камандавалі палкамі сяржанты, а дывізіямі — маладзенькія лейтэнанты. Словам, аматары. Немцы гэта разумелі як вялікую аказію і ўдарылі першымі, бо праз два гады не было б так лёгка ім ісьці ў Расею, бы той нож у масла. Акружылі і ліквідавалі велізарныя армейскія групоўкі, напрыклад, беластоцкую, у тры дні. Савецкая Армія здавалася ў нямецкі палон сотнямі тысяч.

Быў момант, што немцы разгубіліся, ня ведаючы, што рабіць зь незьлічонай чалавечай масай. Памятаю выган у Крынках, на якім густа сядзелі савецкі, а вэрмахтаўцы ня надта іх і пільнавалі. Куды пабягуць? Зноў у збожжа або ў жабраніну аб кавалак хлеба ў вёсках?

Салдат расейскай арміі ніколі ў сваіх ня быў у пашане, а ў савецкай існаваў ён, як быдла. Падлічана было пасьля, што сьмерць аднаго вэрмахтаўца абыходзілася пяцьцю савецкімі сьмерцямі. Былі выпадкі, што слалі ў бой няўзброеныя атрады (на ржэўскім напрамку). Славутыя энкавэдоўскія «заградительныя отряды» мелі заданьне біць з кулямётаў па сваіх, калі тыя, не вытрымліваючы нямецкага націску, кідаліся адступаць. Было толькі «Вперёд!» — тады, можа, выжывеш, бо, назад адыходзячы, напэўна накладзеш галавою ад кулямётаў энкавэдыстаў.

У тых жа Крынках, памятаю, у ліпені сорак чацьвёртага палегла сотня наступаючых саветаў і… адзін немец. Чаму так? Бо саветы лезьлі на нямецкія акопы… п’янымі! Які камандзір дадумаўся б напаіць свой атрад сьпіртам?! Паслаць малапрытомную салдатню на немінучую сьмерць. Немцам аўтаматы пераграваліся!..

Што сьвяткавалі цяпер у Маскве? Савецкую безгаловасьць ці ганьбу Савецкай Арміі, якая ў фінале татальна рабавала Нямеччыну?

**Паводле «Czasopisu»**

# Пакіньце нам вуліцы!



PRVID

10 траўня на Кастрычніцкай плошчы Менску прайшла акцыя, скіраваная супраць перайменаваньня праспэктаў. Анансаваная праз Інтэрнэт, яна сабрала каля 150 чалавек. Удзельнікі сьпявалі «Мы выйдзем шчыльнымі радамі», адзін трымаў плякат: «Дарагія вэтэраны, мы вас паважаем, але вуліцы пакіньце нам свае». АМОН выцісьнуў удзельнікаў з плошчы.

У Магілёве 28 красавіка падчас раздачы незарэгістраванай газэты «Выбар» былі затрыманыя актывісты незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» **Яўген Сувораў** і **Мікалай Ільлін**.

Гомельскі гарвыканкам ня даў да пачатку траўня памяшканьня для юрадрасу мясцовай філіі **ГА «БАЖ»**, не зважаючы на заключаную дамову. Чыноўнікі патрабуюць згоды ад санэпідэмстанцыі й Міністэрства па надзвычайных сытуацыях, хаця ў дамове, завізаванай прадстаўнікамі камунальных службаў, гэтыя пытаньні ўжо зьнятыя.

**Беларускі саюз моладзевых і дзіцячых грамадзкіх аб'яднаньняў «Рада»** 4 траўня падаў у суд на падатковую інспэкцыю Цэнтральнага раёну Менску: арганізацыя аспрэчвае штрафныя санкцыі на 125 млн руб., выстаўленыя па праграме «TACIS» і ЮНІСЭФ.

**Ларыса Дзенісевіч**, маці 14-гадовага **Данілы**, якому зламалі руку на чарнобыльскай акцыі, зьвярнулася 5 траўня ў пракуратуру Ленінскага раёну Менску з просьбай прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці вінаватых у гэтым амонаўцаў.

5 траўня **Свабодны прафсаюз Беларускі** атрымаў патрабаваньне ЖРЭА Партызанскага раёну Менску да 16 траўня вызваліць памяшканьне. СПБ займае офіс з 1994 г. Папярэдні раз дагавор на арэнду быў падоўжаны за 10 дзён да атрыманьня ліста са ЖРЭА.

Рэспубліканскі савет прафсаюзу **РЭП** 5 траўня падрыхтаваў пазоў у суд Ленінскага раёну Магілёву: прафсаюзныя актывісты аспрэчваюць адмову ў рэгістрацыі філіі РЭП на тамтэйшым аўтамабільным заводзе, атрыманую ад уладаў у гэты дзень.

Актывісты **беларускіх НДА**, якія арганізавалі кампанію за зьмены ў заканадаўстве пра грамадзкія аб'яднаньні, атрымалі 5 траўня адказы на свае звароты ў палату прадстаўнікоў: парлямэнтары «прынялі да ведама» звароты. Грамадзкія актывісты патрабавалі адмяніць забарону на дзейнасьць ад імя незарэгістраваных арганізацый, дазволіць рэгістраваць юрадрас у жылым фондзе, зьняць абмежаваньне ў мінімум 50 чалавек для рэгістрацыі аб'яднаньня й г.д.

5 траўня **ГА «БАЖ»** паведаміла, што недзяржаўныя газэты: **«Биржа информации»**, **«Местная газета»**, **«Газета Слонимская»**, **«Тэлескоп»**, **«Новая газета Сморгони»**, **«Głos znad Niemna»** не ўключылі ў каталёг «Сродкі масавай інфармацыі Гарадзеншчыны», выдадзены ўпраўленьнем ідэалягічнай работы Гарадзенскага аблвыканкаму да выстаўкі «СМІ ў Беларусі».

Як паведаміла 6 траўня прэсслужба «Зубра», актывіста арганізацыі **Мікіту Шуцянкова**, вучня 10 клясы менскай політэхнічнай гімназіі №6, прымушаюць уступіць у БРСМ. Хлопца былі затрымалі падчас распаўсюджваньня нерэгістраванага выданьня, і цяпер зь ім штодня «праводзяць гутаркі» й кожнага разу даюць заяву на ўступленьне ў арганізацыю.

**Марына Леванеўская** атрымала 6 траўня адказ з пракуратуры па наглядзе за захаваньнем законаў у папраўчых установах Магілёва: яна скардзілася, што да яе даходзяць ня ўсе лісты мужа Валер'я. Пракуратура не знайшла парушэньняў у дзейнасьці службовых асоб.

Гарадзенскі суд 6 траўня скасаваў рашэньне кіраўніцтва **Саюзу палякаў у Беларусі** й вярнуў на працу галоўнага рэдактара **газэты «Głos znad Niemna»** Анджэя Дубікоўскага й, аштрафаваўшы СПБ на 500 даляраў. Новы рэдактар **Анджэй Пісальнік** быў прызначаны пасьля зьмены кіраўніцтва ў СПБ, якой спрабавалі перашкодзіць лукашэнкаўцы.

Улады Капыля забаранілі праводзіць 6 траўня пікет, заяўку на правядзеньне якога падаў актывіст дэмакратычнага руху **Віктар Дашкевіч**: ён меўся пратэставаць супраць затрымкі з афармленьнем пэнсіі па інваліднасьці. У адказе за подпісам старшыні райвыканкаму Дашкевічу паведамілі, што ён ня мае падстаў для выказваньня свайго пратэсту ў выглядзе пікету.

Суд Цэнтральнага раёну Гомелю 6 траўня пачаў разгляд пазову **Марыі Багдановіч**, **Зьмітра Шкрабава** й дэпутата гарсавету **Юрася Глушакова** супраць гарвыканкаму: яны абскарджвалі адмову ўладаў на правядзеньне мітынгу супраць павышэньня камунальных плацяжоў, увядзеньня прымусовых кантрактаў, платнай адукацыі й мэдыцыны.

У Магілёве падчас акцыі «Зубра» памяці Юр'я Захаранкі 7 траўня насупраць абласнога ўпраўленьня КДБ былі затрыманыя актывісты **Мікалай Ільлін**, **Андрэй Разумкаў**, **Валадар Цурпанаў**, **Максім Дварэцкі**, **Уладзіслаў Бародка**, **Іван Шаўчэнка**, **Уладзіслаў Вішнявецкі**, **Яўген Сувораў**, **Алег Мяцеліца**, **Алесь Новікаў**, **Юлія Рогава**, **Ганна Петраковіч**.

Аналягічны **«Ланцуг неабыякавых людзей»** у Віцебску 7 траўня быў разагнаны міліцыяй.

У Берасьці падчас аналягічнай акцыі 7 траўня затрыманы старшыня абласной філіі АГП **Сьцяпан Навасяльчан** і ягоны сын **Андрэй**: на іх склалі пратаколы за арганізацыю несанкцыянаванага сходу.

7 траўня ў Менску на «Ланцугу неабыякавых» затрыманы **Максім Вінярскі**, **Алена Копач**, **Любоў Кучынская**, **Валерыя Доктарава**, **Мікіта Шуцянкоў**, **Ільля Палонскі**, **Павал Бялецкі**, **Аляксандар Вушко**, **Ян Далідовіч**, **Юлія Бандарэнка**, **Дзяніс Мартынаў**, **Аляксандар Чадовіч**, **Сяргей Рыкаў**, **Дар'я Барабаць**, **Ніка Лазоўская**, **Кацярына Дзяткоўская**, **Настасься Шашкова**, **Зьміцер Марціновіч**, **Павал Юхневіч**, **Мікіта Сасім**, **Натальля Валуйская**, **Яўген Пазьнякоў**, **Руслан Мацьвееў**, **Зьміцер Дубіцкі**, **Даніла Барысевіч**, **Ігар Качура**, **Юры Сівы**, **Тацяна Кіпро**, **Ю.Кіпро**, **Павал Юрыкаў**, **Сьвятлана Мецялькова**, **Міхаіл Кандрашоў**, **Аляксандар Казакоў**, **Іван Шутко**, **Анатоль Аскерка**, **Людміла Зельхаў**, **Анатоль Бельскі**, **Аляксей Бельскі**, **Антон Дубовік**, **Юры Захараў**, **Аляксей Васьковіч**, **Андрэй Бабіцкі**, **Алеся Ясюк**, **Зьміцер Бародка**, **Андрэй Тарасюк**, **Натальля Вушко**.

У Горадні ўдзельнікаў «Ланцуга неабыякавых» 7 траўня затрымалі за «ўдзел у несанкцыянаванай акцыі». На **Мікалая Ворана**, **Рамана Юргеля** і актывістаў АГП **Артура Сьмятаніна**, **Андрэя Янушкевіча**, **Зьмітра Аўдзейчыка**, **Юр'я Істоміна** склалі пратаколы й выпісалі позвы ў суд.

Актывісты руху «Лімон» **Артур Сьмятанін**, **Андрэй Янушкевіч** і **Андрэй Жук** 8 траўня ў Горадні былі затрыманы падчас раздачы партрэтаў Лукашэнкі, якія нібыта мелі лекавыя й цудадзейныя ўласьцівасьці. Супрацоўніца аблвыканкаму запатрабавала ў іх паказаць сэртыфікат на лекавыя ўласьцівасьці. У адзяленьні затрыманыя давалі тлумачэньні міліцыянтам і супрацоўніку КДБ.

Падчас акцыі 10 траўня на Кастрычніцкай плошчы Менску, скіраванай супраць перайменаваньня галоўных праспэктаў гораду, былі затрыманыя сябры "Маладога фронту" **Франак Вячорка**, **Павал Шавель**, **Міхась Воўчак**, **Арцём Цяплякоў**, **Барыс Гарэцкі**. Іх завезьлі ў Цэнтральны РАУС і цераз гадзіну адпусьцілі.

**АШ**

## СЬЦІСЛА ГАСПАДАРКА

### «БелСэл» пад пытаньнем

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі абвергла зьвесткі пра прыпыненьне ліцэнзіі адзінага ў краіне апэратара сотавай сувязі стандарту cdma-2000 «БелСэл». Але праўда тое, што адмысловая дзяржаўная камісія вывучае фінансавы стан кампаніі, якая мае значную крэдыторскую запазычанасьць. Канчатковае рашэньне будзе прынятае да канца траўня. Калі замежныя партнэры «БелСэлу» не забясьпечаць прытоку новых інвэстыцый, Мінсувязі не выключае прыпыненьня ліцэнзіі.

### Доўг паменшаў

Зьнешні дзяржаўны доўг Беларусі за студзень—сакавік скараціўся на 8,3% і складае $679,4 млн, пры зацьверджаным ліміце $2 млрд даляраў. Крэдыты, прыцягнутыя краінай, складаюць $409,7 млн, ці 60%. Аб'ём крэдытаў, прыцягнутых рэзыдэнтамі пад гарантыю ўраду, роўны $269,7 млн.

### Арэндныя рэкамэндацыі

Мінэканомікі зацьвердзіла мэтадычныя рэкамэндацыі да выкарыстаньня павышальных каэфіцыентаў да арэнднай платы на рынках. Цяпер іх можна прымяняць толькі калі стандартны памер арэнды не дазваляе ўласьніку рынку забясьпечыць яго нармальную працу. За кошт арэнднай платы нельга пакрываць камунальныя выдаткі, зьвязаныя з функцыянаваньнем рынку. Праўда, ніякіх санкцый за невыкананьне рэкамэндацый не прадугледжана.

### Вынік далучэньня

Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчаваньня падлічыла, што ад студзеня колькасьць стратных аграпрадпрыемстваў скарацілася ўтрая, чаму паспрыяла далучэньне стратных гаспадарак да стабільных прадпрыемстваў і адтэрміноўка выплаты запазычанасьцяў. Праўда, агульная сума ня вернутых у час крэдытаў вельмі высокая: 909 млрд руб.

### Шакалядная дзяльба

Урад падоўжыў на тры месяцы антыдэмпінгавае расьсьледаваньне адносна імпарту таннага шакаляду з Расеі ды Украіны. Расейскі бок папрасіў разгледзець дадатковыя аргумэнты на сваю карысьць. Расьсьледаваньне распачалося 20 ліпеня 2004 г. па ініцыятыве «Белхарчпраму» ды фірмы «Сладушка», што належыць швайцарскаму капіталу. Калі антыдэмпінгавыя захады будуць зробленыя, імпарт карамэлі, печыва ды шакаляду будзе значна абмежаваны.

### Сырная перамога

Грэцыя перамагла ў барацьбе за сыр. Цяпер толькі той сыр, які выраблены ў Эладзе ды прылеглых выспах, можа насіць назву «фэта». Да такой высновы прыйшла камісія пры Вышэйшым эўрапейскім судзе. Такім чынам, Грэцыя замацавала за сабой унікальную гандлёвую марку, створаную яшчэ шэсьць тысячаў гадоў таму. Дацкім, нямецкім ды францускім фірмам давядзецца прыдумляць іншы назоў для прадукту, які яны раней прадавалі пад маркай «фэта».

**АК, АФН**

### КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 12 траўня:**

1 амэрыканскі даляр — 2 151 рубель
1 эўра — 2 772,32 рубля.
1 латвійскі лат — 3 984,07.
1 літоўскі літ — 802,97.
1 польскі злоты — 662,71.
1 расейскі рубель — 77,33.
1 украінская грыўна — 428,38.

**Паводле Нацбанку**




Юлія Дарашкевіч

## У Віцебску будзе музэй Яна Паўла II

Гэтая ідэя ўзьнікла ў дні пахаваньня былога папы, тым болей што Польскі дом у Віцебску — гэта адзіная ў Беларусі ўстанова, якая носіць імя Яна Паўла II.

Першыя экспанаты будучага музэю — кнігі і аўдыёзапісы — наведнікі Польскага дому маглі ўбачыць 2 траўня, калі паводле каталіцкае традыцыі яны сабраліся на трыццаты дзень па сьмерці Яна Паўла II. На жаль, у Віцебск на запрашэньне ня змог прыехаць Рыгор Барадулін, перакладчык зборніка вершаў пантыфіка на беларускую мову. Але творы Яна Паўла II усё адно прагучалі — у выкананьні барда Алеся Камоцкага, які паклаў іх на музыку, і моладзі з каталіцкіх парафій Віцебску ды Шуміліна.

Ушанаваць памяць Яна Паўла II у Польскім доме сабраліся разам каталікі, грэка-каталікі, студэнты тэалягічнага факультэту Віцебскага ўнівэрсытэту, мясцовыя літаратары і мастакі. Кожны дзяліўся ўражаньнямі ад сустрэч зь Янам Паўлам II у часе пілігрымак, шмат хто выказваў шкадаваньне, што былы папа так і не наведаў Беларусі, дзе яго дужа чакалі.

«Мова — гэта таксама дар Божы», — адзначыў у сваім выступе пісьменьнік Франц Сіўко. Дарэчы, у Польскім доме ў часе памінальнае імпрэзы амаль усе выступоўцы гаварылі па-беларуску. «Мы будзем зьбіраць матэрыялы, каб стварыць тут музэй, — сказала кіраўніца Польскага дому Аліцыя Галустава. — Але найперш хацелася б, каб гэта быў не афіцыёзны мэмарыяльны музэй Яна Паўла II, а ўтульны дом для нас усіх дзеля ягонае памяці».

**АТ, Віцебск**

## У небе сінім наш родны сьцяг

8 траўня ў Горадні вырашылі адзначыць адразу два сьвяты: Дзень перамогі і Дзень дзяржаўнага сьцяга і герба.

Людзей на плошчы Леніна сабралося шмат. У працоўных калектывах і ўстановах удзельнікаў мітынгу па старой завядзёнцы вызначалі «добраахвотна» з абавязковай гарантыяй чалавека быць на плошчы.

Уздымалі сьцяг лепшыя паводле спаборніцтва прадпрыемстваў і ўстановаў, вэтэран вайны, маладзён з БРСМ. Старшыня гарвыканкаму распавёў пра герб з жыццядайнымі каласкамі жыта, пра эканамічныя здабыткі гораду ў першым квартале, а ўдзельніца вайны выказала спадзяваньне, што моладзь будзе такой жа, як яны, пераможцы 1945-га. Адбыўся прыём у піянерскую арганізацыю. Гальштукі павязалі вядомыя людзі гораду на чале з намесьніцай старшыні аблвыканкаму Марыяй Біруковай.

Сьвяточны настрой арганізатарам мітынгу папсавалі каляровыя балёнікі і прымацаваны да іх бел-чырвона-белы штандар. Прысутныя павярнуліся сьпінай да прэзыдыюму і ўзьнялі галовы. Выступоўца, ня бачачы нацыянальнага штандара, працягваў тлумачыць важнасьць чырвонага і зялёнага колераў, закончыўшы амаль што паэтычна: «Лунай у небе сінім, наш родны сьцяг...»

Вось гэта і засталося ў памяці мітынгоўцаў — нацыянальны сьцяг у блакітным небе.

Міліцыянты кінуліся ў сквэр імя Жылібера, адкуль узьвіліся балёнікі. Кажуць, аргвысновы не прымусяць доўга чакаць. Нехта ж не дагледзеў.

**Антон Лабовіч, Горадня**

## На трактары па справядлівасьць

Чыноўнікі івацэвіцкага Дому саветаў абляпілі ўсе вокны, каб паглядзець на незвычайную карціну. За некалькі мэтраў ад уваходу ў галоўны будынак раёну побач з помнікам У.Леніну ляскацеў трактар «Беларус» з прымацаванымі да кабіны чырвоным сярпаста-малатковым сьцягам і транспарантам, напісаным ад рукі: «Патрабую рэгістрацыі МТЗ».

На такі крок жыхара вёскі Быцень Міхаіла Голуба паштурхнулі адчай і бясьсільле. У 2002 г. ён купіў у сельгаскаапэратыве «Пагор'е» трактар, заплаціўшы за яго каля двух мільёнаў рублёў, аднак тэхпашпарту не атрымаў. Неаднаразовыя звароты да кіраўніцтва гаспадаркі не далі ніякага плёну. А міліцыя тым часам штрафавала за тое, што ён эксплюатуе сталёвага каня, ня маючы на яго ніякіх дакумэнтаў. На сустрэчу з бунтаром выйшлі в.а. старшыні райвыканкаму Анатоль Ткачук і яго намесьнік Аляксандар Сарока. Яны ўгаварылі трактарыста адагнаць машыну на аўтастаянку і зайсьці да іх у кабінэт. Пасьля выклікалі да сябе кіраўнікоў «Пагор'я». Інцыдэнт скончыўся тым, што Міхаіл Голуб на працягу наступных трох дзён атрымаў тэхпашпарт на трактар, што дазволіла раённай інспэкцыі дзяржнагляду зарэгістраваць «МТЗ-80» на новага гаспадара. Яму засталося давесьці трактар да ладу, каб прайсьці тэхагляд, атрымаць нумары на машыну — і працуй, уладальнік, спакойна.

**Аляксандар Лаўранюк, Івацэвічы**

## Каб не касілі

Кастрычніцкі суд гораду Віцебск асудзіў на два гады пазбаўленьня волі прызыўніка, які доўгі час ухіляўся ад праходжаньня вайсковай службы.

## Лунінец з Кубкам

Клюб з Лунінцу «Юна» стаў уладальнікам Кубку Беларусі па матаболе, прысьвечаным 60-м угодкам Перамогі. У фінале палешукі выйгралі ў «Азота» (Горадня) — 3:0. Трэцяе месца заняў чэмпіён Беларусі — пінскі «Аўтамабіліст». Наступны старт беларускіх матабалістаў — пры канцы месяца. З 25 па 29 траўня ў Нямеччыне пройдзе чэмпіянат Эўропы. Зборная Беларусі паедзе туды фаварытам, яны — дзейны чэмпіён кантынэнту.

**АГ; БелТА**

МУШТАРДА

# Сымбіёз Сынгапуру й Патаі

**АЛЕСЬ БЕЛЫ**



На золку перабудовы ў асяродзьдзі нацыянальна сьвядомай інтэлігенцыі было модна крытыкаваць Менск за адсутнасьць уласнага стылю і твару, афіцыёзна-казарменны дух і правінцыялізм. Добра, што зь цягам часу перамог больш цьвярозы падыход і някідкая, але глыбокая ўнутраная прыгажосьць Менску была належным чынам ацэненая — спачатку гасьцямі сталіцы, а потым ужо і ў колах Адраджэньня.

Сярод бясспрэчных цнотаў гораду-героя вылучаюцца найперш тры: фармацэўтычная чысьціня, сталінскі ампір і прыгожыя ды ветлівыя дзяўчаты, якія ў некаторых месцах нашай сталіцы ўтвараюць стыхійныя (хаця і са стабільным раскладам) кастынгі. Надзвычай стыльны гібрыд Сынгапуру і Патаі!

Але пакуль што нявыкарыстаным застаецца адзін з каштоўных рэсурсаў нашай спадчыны, які мае калясальны адукацыйны, а нават і індустрыяльна-забаўляльны патэнцыял, — гарадзкая тапаніміка.

На першы погляд, у менскіх назвах няма сыстэмы. Ёсьць тутака і паганскі бог, і процьма мілагучных песьняроў Яснай Явы (некаторыя двойчы — пад сапраўдным прозьвішчам і псэўданімам), і мясьнікі-камісары ў пыльных шлемах, і пара тузінаў стэрэатыпных цюрскіх прозьвішчаў, якія цяжка вымавіць індаэўрапейскаму языку, — але ў памяці аўтаматычна ўсплывае Гумілёў. Нават адзін выпадковы кабаліст з Падуі «зацясаўся».

У адрозьненьне ад гарадоў і вёсак іншых краін, якія груба і ўпарта навязваюць грамадзянам аднастайную ідэалёгію сваіх пануючых клясаў (напрыклад, Міцкевіч—Славацкі—Пілсудзкі—Плятэр—Траўгут—Ян Павал II або Нямецкая—Жыдоўская—Базыльлянская—Дамініканская—Арсэнальная—Шкляная—Ліцейная), гасьцінны Менск спрадвеку тулiў усіх.

Сувэрэнныя назвы менскіх вуліц, узятыя разам, — не толькі ўнікальны помнік нашай этнакультуралёгіі, але і здабытак усяго прагрэсіўнага чалавецтва. Яшчэ не адзін доктар левалібэральных навук зробіць сабе на іх вывучэньні габілітацыю і імя. Бадай, нідзе больш на зямлі так поўна і дасканала не ўвасобіліся мары левых інтэлектуалаў пра палітычную карэктнасьць, мультыкультурнасьць і дэканструкцыю, як у менскай тапаніміцы.

Усё, ува што людзі нашага краю калісьці шчыра верылі, абавязкова будзе ўвекавечана. Адзіная ўмова — каб чарговая вера пратрымалася нейкі мінімальна прыстойны час. Напрыклад, ганарыстыя вусатыя легіянэры ў кунтушах і канфэдэратках далі лататы занадта хутка, каб пакінуць тутака нейкі сьлед. Бялявыя змагары за Новую Эўропу пратрымаліся крыху даўжэй. То хаця і не прадстаўленыя ніводнай вулкай, дык, прынамсі, маюць надпіс «Brauerei Minsk» на фасадзе славутага гарадзкога бровару. Прымружыўшыся, можна ўявіць якуюсь Блюмэнштрасэ.

Шыльды з назвамі менскіх вулак, плошчаў, праездаў і тупікоў для ўдумлівага вока — нагода паразважаць пра прыроду людзкой Веры. У што шчыра верылі калісьці нашы продкі? Ня так істотна гэта ведаць, галоўнае — шанаваць. Ведаць жа цьвёрда трэба толькі адно: ніводная з гэтых нашых Вераў ня ёсьць ані лепшаю, ані слушнейшаю, ані апошняю, пра што цьмяна здагадваўся ўжо Понцкі Пілат і што блiскуча давёў кагадзе Карл Попэр. Ніводны зь іх ня мае пакуль менскай прапіскі, але горад-волат імкліва расьце, і будзем разлічваць, што ўсё ў іх наперадзе.

У што ў такіх варунках мусіць верыць прагрэсіўны левалібэральны інтэлектуал, каб на чарговым павароце Яе Вялікасьці Гісторыі ня быць выкінутым зь сядла / адкінутым ад ночваў? Толькі ў няўхільны поступ Прагрэсу, які з часам гарантавана адхопіць у сельвы, балота, пустыні ўсё новыя і новыя дзялянкі пад шматпавярховыя кварталы, падзеленыя шырокімі, але ўтульнымі вулкамі. Іх імёны захаваюць для бясконцых пакаленьняў нашчадкаў памяць пра чарговыя зьмены нашых спрадвечных Вераў, пра іх Герояў і Сымбалі.

# Гісторыя маленькіх людзей пад акупацыяй


ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Выдатная кніга нямецкага гісторыка Бэрнгарда К'яры па-беларуску дапамагае ў спасьцiжэньні Вялікай вайны як стану рэчаў і сьвядомасьці. Акупацыя з пункту гледжаньня злачынцаў і ахвяраў, якія аднолькава імкнуліся да выжываньня. Але без апраўданьня злачынцаў, у тым ліку калябарантаў. Піша **Аркадзь Шанскі.**

На тле юбілейнага сьвяткаваньня Дня Перамогі ціха адбылася прэзэнтацыя беларускага перакладу фундамэнтальнае кнігі нямецкага гісторыка Бэрнгарда К'яры «Штодзённасьць за лініяй фронту. Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941—1944)». Мерапрыемства прайшло 10 траўня ў Гістарычнай майстэрні, што на вуліцы Сухой.

Адкрываючы прэзэнтацыю, гісторык Сяргей Новікаў адзначыў, што ўпершыню ў беларускую гістарыяграфію і наагул у гуманістыку ўводзіцца тэрмін «акупаванага грамадзтва» — асноўная тэма кнігі К'яры. Дый шмат пра якія рэчы тут гаворыцца ўпершыню.

Сам **К'яры (на фота)** зазначыў, што з 1998 г., калі нямецкі варыянт кнігі пабачыў сьвет у Дзюсэльдорфе, гістарычных дасьледаваньнях зьявілася шмат новага. «Гэтая кніга не дае агульнага ўяўленьня пра Другую сусьветную вайну, яна толькі распавядае пра грамадзтва пад акупацыяй», — адцеміў аўтар. Асобная гаворка ў гэтай сувязі — пра калябарацыю: ад добраахвотнай згоды на супрацоўніцтва да памкненьня выжыць у трагічных умовах акупацыі.

Б.К'яры прапанаваў сваё вызначэньне калябарацыі — сьвядомая падтрымка злачынных актаў, накіраваных на тэрор і забойствы. Усё астатняе — каапэрацыя і супрацоўніцтва, скіраваныя на выжываньне супольнасьці, кшталту «мяккай» калябарацыі перакладчыкаў і прыбіральшчыц. Нямецкі гісторык параўнаў сваё дасьледаваньне з Купалавымі «Тутэйшымі», якія яго глыбока ўразілі: «Я стараўся паказаць вайну ня з гледзішча віноўнікаў, а з гледзішча ахвяраў».

Куратар выданьня Генадзь Сагановіч, характарызуючы кнігу, адзначыў, што аўтарскі фактар у дасьледаваньні адзін з самых важных: «Кніга разбурае стэрэатыпы пра вайну, створаныя дасьледчыкамі абодвух лягераў нашых гісторыкаў. На жаль, усё было ня так, як хацела б падаваць нацыянальная гістарыяграфія. Гісторыя штодзённасьці агаляе трагізм нашай сытуацыі».

На думку перакладчыка манаграфіі Лявона Баршчэўскага, кніга выйшла ня столькі пра вайну, колькі пра беларускі мэнталітэт: «Яна прымушае задумацца, знайсьці карані паводзін сёньняшніх людзей. Гэта падручнік па сацыяльнай псыхалёгіі».

Сваё ў кнізе пабачыў архівіст Віталь Скалабан: ён разглядае працу ў кантэксьце ня толькі ваеннай, але і паваеннай гісторыі Беларусі. «Гэта кніга пра тое, ці існавала беларуская дзяржаўнасьць у часе вайны. І пра тое, якія былі перадумовы для ўмацаваньня беларускай дзяржаўнасьці ў паваенны час. У 1944—1946 г. была чарговая спроба беларускага нацыянальнага Адраджэньня. Дастаткова пачытаць тагачасны беларускі друк, дзе зьявіліся артыкулы пра А.Гаруна і Б.Эпімах-Шыпілу», — пераканаunion Скалабан.

Безумоўнымі вартасьцямі кнігі Захар Шыбека назваў тое, што аўтар паказаў пераемнасьць паміж савецкім і нямецкім панаваньнем, што даў сапраўднае ўяўленьне пра маштабы канфлікту паміж беларусамі й палякамі, што не ўнікае паказу канфліктаў і не баіцца абвяргаць стэрэатыпы. «Аўтар разбурае міт аб нямецкай «звышнацыі»: ён паказвае бездапаможнасьць нямецкай адміністрацыі, напрыклад, у аграрным пытаньні», — адзначыў гісторык.

Генадзь Сагановіч назваў кнігу «філязофскай».

«Штодзённасьць» уяўляе сабой спробу спасьцігнуць Другую сусьветную вайну як фрагмэнт «эпохі сусьветных войнаў», што ад 1914 году цягнулася да 1950-х, пакуль НКВД не разграміла нацыянальны супраціў саветам. І БЦРаўскія калябаранты, і польскае акоўскае падпольле, і УПА, і літоўскія «жалезныя ваўкі», і нават савецкая партызанка прадстаўлялі зусім не «народы», а нацыянальныя эліты і былі інсьпіраваныя з вонкавых цэнтраў супраціву. Іх падтрымка мясцовым насельніцтвам была пераважна неадназначнай і мянялася ў залежнасьці ад каньюнктуры. Гэта, на думку К'яры, галоўная выснова, якую можна зрабіць з праведзеных ім дасьледаваньняў.

Аднак аматару гісторыі ў кнізе будуць цікавыя ня толькі высновы. Нямецкі дасьледчык здолеў зрабіць тое, чаго ня ўмеюць пакуль беларускія гісторыкі. Ён вывучае індывідуальныя гісторыі паралельна з гісторыяй вялікіх гістарычных падзей. На базе аб'ектыўных крыніцаў ён дасьледуе дыяпазон рэакцый на чужынскае панаваньне. Абмалёўвае дыяпазон матываў, якія рухалі людзьмі ў экстрэмальнай сытуацыі вайны — ад палітычных і нацыянальных да імкненьня да банальнага выжываньня. Ён цікавіцца мэтодыкамі ўзьдзеяньня на сьвядомасьць акупаваных з боку акупантаў і іншых ваюючых бакоў. Нарэшце, у адрозьненьне ад шэрагу нацыяналістычных гісторыкаў, К'яры не баіцца канстатаваць, што Беларусь як структурна слабы аграрны рэгіён зь нізкімі ўраджаямі стала пляцоўкай для найгоршых формаў акупацыі, дзе ад пачатку дамінавалі голад і тэрор, а расісцкая вайна на вынішчэньне амаль не прыхоўвалася. І іншыя высновы, ужо маральныя: ахвяры не павінны быць забытыя, «нашчадкі ахвяраў і дзеці злачынцаў мусяць жыць з гэтымі жахлівымі падзеямі ў сабе».




К'яры Бэрнгард. Штодзённасьць за лініяй фронту: Акупацыя, калябарацыя і супраціў у Беларусі (1941—1944 г.) / Пер. зь ням. Л.Баршчэўскага; нав. рэд. Г.Сагановіч. — Менск, 2005. — 390 с.

## СЬЦІСЛА

### Слонімскі палянэз

У Слоніме выйшаў літаратурны альманах «Пад гукі палянэзу», куды ўвайшлі творы сямнаццаці мясцовых аўтараў — сяброў літаб'яднаньня імя Анатоля Іверса. Прадмову да зборніка напісала Данута Бічэль.

### Помнік пісанцы

Ва ўкраінскай вёсцы Браткаўцы (Львоўская вобласьць) на Пакровы адкрыюць помнік велікоднаму яйку — пісанцы. Сам помнік паставілі пяць гадоў таму, на 2000-годзьдзе Хрыстовага нараджэньня, але тады забракавала грошай на канчатковую «даводку».

**АВ**

### Краіна Літва

У Літве пабачыла сьвет новае грандыёзнае выданьне — кніга «Гісторыя старажытнай Літвы. 1009—1795 гады», аналяг нашай «Краіны Беларусі».
Гэта вялікая для нашых суседзяў падзея адзначалася на адпаведным узроўні. Прэзэнтацыя прайшла ў панядзелак, у белай залі Палацу прэзыдэнта з асабістым удзелам Валдаса Адамкуса, які й адчыніў урачыстасьць. З гонарам прамаўлялі аўтар, вядомы прафэсар




Альфрэдас Бумблаўскас, і выдавец, Раймондас Пакніс. Праца над кнігай заняла 9 гадоў, а яе вынікам стаў фаліянт у 488 старонак і больш за 1300 ілюстрацый. Творчы калектыў зрабіў яе для ўсіх катэгорый грамадзян, стараючыся, каб «яна была як тэлевізар з дыстанцыйным пультам кіраваньня: не падабаецца — пераключаеш каналы», — сказаў у прамове А.Бумблаўскас. Пакуль кніга толькі па-нямецку, але плянуецца перавыданьне на ангельскай і польскай мовах.

**Дзяніс Раманюк**

### Падпіска на «Arche»

**Самы дэфіцытны беларускі часопіс, якога няма ў ніводнай дзяржаўнай кнігарні, можна гарантавана атрымліваць поштай. Падпісны індэкс 00345. Кошт падпіскі на месяц 3440 рублёў для прыватных асобаў і 12 271 рублёў для арганізацыяў.**

## Песьня году—2005

«Песьня году-2005». Частка першая. Розныя выканаўцы. АНТ, 2005

Прадусарская кантора АНТ на чале зь Ягорам Хрусталёвым саскрэбла на адзін дыск апошнія поп-гіты краіны, што прагучалі ў аднайменным тэлепраекце ў пачатку вясны.

Большасьць месцаў аддадзена маладым. Заміж Дарафеевай — Ганна Мушак, на месца «Сяброў» добра ўпісалася «Атлянтыка», Ялфімаў падмяніў Дайнэку. З 21 песьні толькі адна засьпяваная па-беларуску. І гэта «Слуцкая брама» ў выкананьні «Крамы», якую немаведама якім ветрам занесла паміж Грыбалёвай і «Прымай Верай». Добры падарунак усім радыйнікам Беларусі. Але, каб ім жылося спакойна і Міністэрства ім не выгаворвала, падобныя дыскі мусяць зьяўляцца штотыдзень.

Найлепшае з дыску: Гюнэш («Назови меня по имени»), «Крама» («Слуцкая брама»), «Прыма Вера» («Полёт»), Ялфімаў («Ангел»).

# Беларусь як тэатар Бэкета

**Аляксандар Качан**, сцэнарыст фільму «Акупацыя», апошнія тры гады жыве ў Кіеве. Падзеі ва Ўкраіне і ў Беларусі вачыма сцэнарыста — якая драматургія назіраецца? Гутарыць Андрэй Расінскі.


БЕЛОРУССКАЯ ГАЗЕТА

АЛЯКСАНДАР КАЧАН (нар. у 1970) – кінасцэнарыст. Аўтар сцэнарыяў чатырох поўнамэтражных мастацкіх фільмаў, у іх ліку «Акупацыя. Містэрыі» Андрэя Кудзіненкі і «Павадыр» Аляксандара Яфрэмава.

**«НН»: Аляксандар, як і чаму Вы пераехалі ва Ўкраіну?**

**АК:** Я ажаніўся з кіяўлянкай.

**«НН»: Адарваліся ад беларускіх справаў?**

**АК:** Ні ў якім разе. Бываю ў Беларусі, маю творчыя справы, ёсьць Інтэрнэт, каб адсочваць падзеі. У Кіева-Магілянскай акадэміі існуе асяродак, які цікавіцца падзеямі ў Беларусі. Я двойчы выступаў там зь лекцыямі пра беларускае кіно. Мне казалі: «Вы жывяце ў краіне культурных герояў. Пад ціскам заўжды нараджаецца незвычайнае».

**«НН»: Ва Ўкраіне незвычайнага менш? Ну, рэвалюцыя там...**

**АК:** Ва Ўкраіне няма таго палітычнага рэжыму, які ў Беларусі, і спадарожных яму рэчаў. Не было яго нават да рэвалюцыі. Алігархія — гэта няўстойлівая сыстэма, з расколамі. Тут пачуваешся больш вольна, больш анархічна, што для творчай асобы больш натуральна. Людзі пакінутыя самі на сябе — і неяк самі выкручваюцца з складанага эканамічнага становішча. Хатычная складовая нізавога жыцьця тут заўважная — і яна мне больш падабаецца за тую стэрыльнасьць, якая пануе на вуліцах у Менску.

**«НН»: Гэта дзякуючы рысам нацыянальнага характару ці праз розьніцу ў палітычных сыстэмах?**

**АК:** Гэта рыса палітычнай сыстэмы. У Беларусі аўтакратычная ўлада накіравала ўсё ў жорсткія рамкі. Ідэя чысьціні гораду стала адной з ідэфікс.

**«НН»: ...У тым ліку і палітычнай «чысьціні»...**

**АК:** І палітычнай, і эканамічнай.

**«НН»: А што было падобным ва Ўкраіне і ў Беларусі?**

**АК:** Сытуацыя ўскрайку імпэрыі — не знайшлося яшчэ нацыянальнай тоеснасьці цалкам і тут, і там.

> Беларускае грамадзтва настолькі разьяднанае, што можна казаць толькі пра адзіноту, абсурд, недарэчнасьць існаваньня чалавека-адзінкі.

**«НН»: Але ж ва Ўкраіне былі й застаюцца сьцяг, мова...**

**АК:** Эліты, якія дэклявалі нацыянальны праект як сваё крэда, карысталіся гэтай ідэяй толькі вонкава. Яны былі прыстасаванцамі, і шмат хто ўспрымаў нацыянальны праект як штучны. Толькі падчас Аранжавай рэвалюцыі адбыўся скачкападобны пералом. А ў Беларусі няма скачкоў, ідзе паступовы працэс — у адным кірунку.

**«НН»: Калі паглядзець на падзеі ва Ўкраіне і ў Беларусі вачыма сцэнарыста, то які сцэнар быў ва Ўкраіне і які — у Беларусі?**

**АК:** У Беларусі агульная драматургія падзей — абсурд. Кіно абсурду, тэатар абсурду, нешта кафкіянскае. А тут усё склалася больш-менш нармальна, паводле нармальных драматургічных прыёмаў. Барацьба дабра з больш слабым злом. Звычайная драматургія, якая нават у амэрыканскім кіно выкарыстоўваецца. У Беларусі я бачу толькі тэатар Бэкета. Грамадзтва настолькі разьяднанае, што можна казаць толькі пра адзіноту, абсурд, недарэчнасьць існаваньня чалавека-адзінкі.

**«НН»: А можна прадбачыць нейкі сцэнар, пры якім гэтая разьяднанасьць была б пераадолена і адбылося б тое, што Вы называеце скачкападобным пераломам?**

**АК:** З гледзішча творчасьці, калі б мне як драматургу прыйшло ў галаву напісаць сцэнар на будучае разьвіцьцё Беларусі, у мяне б ён выйшаў пэсымістычна-апакаліптычны. Бо трэба быць вялікім аптымістам, каб прадбачыць у Беларусі нармальную хаду падзей. Столькі ўжо сьмецьця назапасілася ў мэханізьме ўлады, што можна чакаць усялякіх вычварэньняў у выпадку, калі сытуацыя будзе зьмяняцца выбухова.

**«НН»: А што заўважна ва ўкраінскім кіно, культуры?**

**АК:** Ва Ўкраіне практычна няма ўкраінскага кіно, толькі навагодня мюзыклы тэлеканалу «Інтэр». Украінскага мастацкага кіно не відаць — ні ў відэапракаце, ні ў кінатэатрах. Кіно, зробленае пад расейскага гледача, на расейскай мове, не ўяўляе цікавасьці. Студэнты Кіева-Магілянкі зайздросьцілі нам за «Акупацыю».

Кідаецца ў вочы праява музычнай культуры. Яна значна больш арыгінальная і канвэрсоўная — «Акіян Эльзы», «Воплі Відаплясава». А ёсьць і такія дзіўныя рэчы накшталт рэктара Інстытуту культуры Паплаўскага. Ён сьпявае, выступае на канцэртах па тэлебачаньні больш за «Акіян Эльзы», скарыстоўвае шматлюдныя масоўкі са сваіх студэнтаў, якія здымаюцца ў ягоных кліпах, адтанцоўваюць...

**«НН»: Як свабода з Украіны можа паўплываць на Беларусь? Пры якіх умовах?**

**АК:** Калі будзе эканамічны прыклад. Беларускі народ можна спакусіць толькі прыкладам эканамічнага разьвіцьця, ідэяй свабоды не спакусіш.

**«НН». Што заўважна з Украіны таго, чаго нельга заўважыць зь Беларусі?**

**АК:** У Беларусі лёгка стаць законченым пэсымістам. А тут ёсьць адчуваньне: сьвет не ідзе на дно.



ДЫСКАГРАФІЯ

## Будзь разам з намі.




«West Records», 2005

Новы дыск «Крамы» здольны задаволіць кожнага — і таго, хто сабраў калекцыю «крамаўскіх» альбомаў на касэтах, і таго, хто ўбачыў «Краму» ўпершыню на «Песьні году-2005» на АНТ. Задаволіліся і самі музыканты, яны ўпершыню за 15-гадовую гісторыю калектыву атрымалі запіс, якога жадалі. «Крама» ў студыі ніяк не магла дасягнуць свайго «фірмовага», вядомага з канцэртаў гуку. Замінаў ўмовы (альбом «Камэндант» пісаўся ў бамбасховішчы), непастаянны склад, асабістыя праблемы. Пасьля альбому «Што дапаможа нам» (1998 г.) Варашкевіч думаў распусьціць гурт. Той альбом пісаўся нібы пад прымусам: творчы крызіс, сьмерць Ігаравых дзеда, бабулі, бацькі, развод з жонкай, алькаголь — усё гэта ў адзін час атакавала лідэра «Крамы». Гурт выстаяў: хоць доўга не было новых песень, даваў канцэрты і нагадваў пра сябе.

На гэтым дыску сабраныя 14 найлепшых песень «Крамы» розных часоў. Усё сыграна, сьпета, запісана наноў. Адмыслова для гэтага музыкі зьнялі катэдж у Баранавічах, пазычылі добрую апаратуру і месяц выходзілі з дому толькі для таго, каб парыбачыць.

Большасьць песень з альбому «Хворы на рок-н-рол» — легендарнага дэбюту «Крамы» (1993). Аранжыроўкі «Выпі са мной», «Бяжы, хлопец» не пазнаць. Песьні «Што дапаможа нам», «Слуцкая брама» запісаныя разам з джаз-бэндам «Apple Tea». Вакал Варашкевіча загучаў больш упэўнена і ярка. У стандартны шэраг песень алькагольнай, студэнцкай і гістарычнай тэматыкі добра ўпісаліся менш вядомыя: «Мама» — споведзь сына перад маці — і «Паходная» — варыяцыі на тэму Адысэя. Варта мець у калекцыі кожнаму.

**Сяргей Будкін**

## Cover Band. CD1




«Cover Band. CD1». «Apple Tea». (р) «Apple Tea», 2004. Не для продажу

Сапраўдны рарытэт. Такога выданьня не было ў гісторыі беларускай папулярнай музыкі. Ці здаралася падобнае ў музыцы сусьветнай — не бяруся сьцьвярджаць, бо неяк уяўляецца нечакана выглядае альбом знакамітай джаз-групы.

Маркуйце самі: з 24 трэкаў — толькі адзін уласна джазавы. Рэшта — клясыка сусьветнай і савецкай поп-музыкі, гіты Іглесіяса, Стынга, «BoneyM», Ратару і г.д. «Гарбатныя» музыкі сабралі на дыску частку рэпэртуару, з дапамогай якога яны зарабляюць музыканцкія «чарку да скварку», граючы на прэзэнтацыях, вечарынах па спэцзапрашэньнях. Калі хочаце ведаць, што такое «Apple Tea» ў пацешальным (больш прыземлена — халтурным) варыянце — пастаўце дыск на прайгравальнік.

Але халтура ад халтуры розьніцца. Гэты CD, запісаны ў студыі, якая працуе ў Баранавічах пры касьцёле і карыстаецца ўсё большай папулярнасьцю сярод музыкаў, ніяк нельга лічыць гэткай забаўкай, зробленай левай рукой праз правае вуха. Усё выконваецца належным чынам, без кардынальных зьменаў у аранжыроўцы, што таксама сьведчыць пра высокую клясу музыкаў. Альбом ня знойдзеш у продажы, атрымаць яго можна падчас выступаў групы. Бо хто ж просіць грошы за візытоўку? Але калі грошы прапануеце, музыкі, думаю, не адмовяцца. Адно аўтары «Ландышаў» адлічэньняў не дачакаюцца...

На сайце групы www. apple-tea.com абʼяўлены конкурс на складаньне рэпэртуару наступнага такога дыску. А пакуль песьні выбіраюцца, «Apple Tea» піша ў Баранавічах чарговы альбом з чыста джазавым рэпэртуарам.

**Кавырнуты СЛУХАЧ**

# Блэр перамог, Блэр можа сыходзіць!

Па выніках галасаваньня ў Палату грамадаў Тоні Блэр застаўся на Даўнінг–стрыт, 10, але ўжо цяпер ён можа пакаваць чамаданы. Псыхалягічная стомленасьць ад адных і тых жа твараў ва ўрадзе каштуе любой партыі ў сярэднім 3% папулярнасьці за час кожнага тэрміну. Піша **Лёлік Ушкін**.


AFP

Вялікабрытанія — краіна дзівакоў: аўтобусы фарбуюць у чырвонае, машыны езьдзяць па левым баку, замест гарэлкі квасяць гарбату… Тое ж і ў палітыцы: не пасьпеў Тоні Блэр перамагчы на трэціх выбарах запар, як усе газэты пачалі пісаць, што ён мусіць сысьці ў адстаўку.

Каб зразумець фэномэн загадкавай ангельскай душы, трэба перамясьціцца ў часе ў 2000 год, калі Хелен Філдынг выдала другую частку бэстсэлеру «Дзёньнік Брыджыт Джонз». На старонках твору гераіня (партрэт тыповай сучаснай брытанкі трыццаці гадоў) спрачаецца зь сябрам Майкам аб электаральных сымпатыях:

«— Я галасую за торы, і што? — вызерыўся на мяне Майк.

— Т-с-с, — прашаптала я, нэрвова азірнуўшыся.

— У чым праблема?

— Бачыш, — пачала я, — калі б я галасавала за торы, то стала б ізгоем грамадзтва. Гэта ўсё роўна, што ўехаць у «Кафэ руж» (тусовачнае месца ў Соха. — **ЛУ**) на кані ў атачэньні ганчакоў… Усім жа зразумела, што лейбарысцкая партыя падтрымлівае прынцыпы дабрыні і дзеяньня, інтарэсы геяў, маці-адзіночак і Мандэлы, а супрацьстаяць ёй высакамерныя мужчыны, якія крычаць, заводзяць інтрыжкі з усімі, хто трапляецца ім па дарозе, трахаюцца направа і налева, ходзяць у рэстаран «Рытц» у Парыжы…»

Мяркую, калі б Філдынг працягнула сэрыю да 2005 г., Брыджыт ужо ня так горача агітавала б за лейбарыстаў. Больш за тое, паколькі яна і Майк застаюцца жыць разам, прычым у прэстыжным раёне Нотынг-Гіл, цалкам магчыма, што пэрсанаж Філдынг увогуле не адчыніла б дзьвярэй агітатарам лейбарыстаў (у Англіі кандыдаты працуюць па прынцыпе «ад дзьвярэй да дзьвярэй», ходзячы па кватэрах выбаршчыкаў).

Прынамсі, на апошніх выбарах выявілася відавочная тэндэнцыя, што прыгарады, дзе жывуць багатыя сем'і сярэдняе клясы, зноў, як і ў 1980-я, пачалі абіраць торы.

Прычыны падзеньня папулярнасьці лейбарыстаў — асоба Блэра, які ўцягнуў краіну ў непапулярную вайну ў Іраку. Сёньня ў забягалаўках накшталт «Кафэ руж» лейбарысты — гэта адстой. Модны сярод моладзі дзякуючы нізкай квартплаце раён Вуд-Грын прагаласаваў супраць партыі Блэра.

Але лейбарысты перамаглі. У іх 356 мандатаў (мінус 35 у параўнаньні з тым, што было). У торы — 197 (+35), у лібэрал-дэмакратаў — 62 ( +8).

Два фактары спрыялі посьпеху лейбарыстаў.

Першы фактар — Гордан Браўн, міністар фінансаў, якога, як піша француская «Монд», «Блэр разумна выставіў на першы плян кампаніі». Браўн вядомы як архітэктар брытанскага эканамічнага цуду. Самая маленькая інфляцыя з 1960-х, самая маленькая іпатэка з 1970-х, самы маленькі ўзровень беспрацоўя за 29 гадоў, новая адукацыйная праграма, якую лейбарысты маюць намер запусьціць ужо налета.

Другі фактар — страх брытанцаў перад вяртаньнем да часоў Тэтчэр. «Жалезная лэдзі» і яе лібэральная палітыка — сапраўдны жупел для брытанцаў.

Торы, дарэчы, правялі роўную кампанію. Прынамсі, не было ляпаў, як у мінулы раз, калі лідэр партыі аскандаліўся тым, што ўзяў на працу ў якасьці рэфэрэнта жонку. Як вынік, колькасьць мандатаў, аддадзеных за партыю, трошкі ўзрасла. Але відавочна, атрымаць большасьць у ніжняй палаце з ідэямі тэтчэрызму проста немагчыма. Дзіва што адной зь першых рэакцый на выніку выбараў стаў адкрыты ліст з заклікам «паканчаць з тэтчэрызмам», напісаны дэпутатам Даміянам Грынам.

Торы Грын піша: «Адно з таго, што далі нам гэтыя выбары, — тэорыі, зь якімі мы ішлі на выбары ў 1980-х і зь якімі намагаліся дабіцца сымпатыі брытанскага народу ў 1990-я. Трое выбараў мы былі ў трох варыянтах посттэтчэрысцкай канцэпцыі, выкарыстоўваючы эўрапейскую тэму або дыскамфорт ад эміграцыі як знак таго, што людзі незадаволеныя сучасным сьветам. Сапраўды, ёсьць шмат людзей з такімі думкамі, аднак не яны фармуюць базіс улады. Зьмена лідэра — гэта ідэальная магчымасьць набраць у лёгкія паветра і пакінуць Тэтчэр гісторыі. Многае з таго, што зрабіла «жалезная лэдзі», сапраўды заслугоўвае захапленьня, аднак яе інструкцыі адпавядалі 1980-м, а не XXI ст.» Торы можна цешыцца тым, што лейбарысты таксама знаходзяцца ў ідэйным крызісе.

Можна пагадзіцца зь «Нью-Ёрк Таймс», якая піша, што «Блэр заваяваў палітычны цэнтар». Аднак ён ахвяраваў пры гэтым левым флянгам, дзе поўзаюць канкурэнты.

Перш за ўсё, лібэрал-дэмакраты, якія зрабілі сабе імя на антываеннай кампаніі, што дала ім падтрымку ў мусульманскай камуне. У 40 акругах, дзе жыве шмат мусульманаў, перамаглі лібэралы. Найбольшы прыкол адбыўся у Манчэстэры-Вітхінгтоне, дзе вігі перамаглі, атрымаўшы на дваццаць адсоткаў болей, чым чатыры гады таму.

Па-другое, ультралевыя. Падчас выбараў усе погляды прэсы былі прыцягнуты да акругі *Bethnal Green and Bow* ва Ўсходнім Лёндане. Там выключаны за праірацкія настроі зь лейбарысцкай партыі Джон Галаўэй на 900 галасоў абставіў былога партайгеносэ. Кампанію Галаўэю праводзіла групоўка «Рэспэкт-адзінства» — кактэйль прафсаюзьнікаў, трацкістаў з Сацыялістычнай працоўнай партыі і тутэйшых мусульман.

Самае цікавае, што на гэтых выбарах упершыню ў гісторыі шматлікія левардыкальныя груповачкі, галоўным чынам прыхільнікі ідэй Троцкага, здолелі скаардынаваць сваю дзейнасьць і, прынамсі, не замінаць адзін аднаму.

З улікам згаданых тэндэнцый (мадэрнізацыя праграмы торы і ціск з боку левых), а таксама такіх фактараў, як псыхалягічная стомленасьць ад адных і тых жа твараў ва ўрадзе (паводле падлікаў сацыёлягаў, гэта каштуе любой партыі ў сярэднім 3% папулярнасьці за час кожнага тэрміну), лейбарыстам наканавана зьмяніць лідэра.

У перадавіцы за 9 траўня «Гардыян» піша, што «галоўная інтрыга ня тое, хто пераможа, а калі Блэр перадасьць кіраўніцтва партыяй Гордану Браўну». Выданьне нават распрацавала плян дзеяньняў будучага кабінэту, прагназуючы левы паварот. А Робін Кук, былы дырэктар лейбарысцкага МЗС, ужо назваў тэрмін адстаўкі Тоні — чэрвень 2006 г., калі лейбарысты зьбяруцца на партыйную канфэрэнцыю.

# Армяне і туркі

*Моцныя слабых усё б'юць, як*
*у мінулыя стагодзьдзі білі.*
*Ганад Чарказян*

13 красавіка ў Ерэван з Анкары быў прывезены незвычайны падарунак — дакумэнты аб армянскай разьні 1915 году. Паводле дакумэнтаў, генацыду не было, лічбы ахвяр перабольшаныя, вінаватыя зьбольшага самі армяне. Афіцыйны Ерэван ужо назваў дакумэнты няпоўнымі і сфальсыфікаванымі.

Што адбылося 90 гадоў таму і чаму погляды на гэтыя падзеі дыямэтральна супрацьлеглыя? Армэнія — краіна, што некалькі разоў зазнавала падзелы. Так, у сярэдзіне XVII ст. Заходняя Армэнія адышла да Асманскай імпэрыі, Усходняя Армэнія спачатку трапіла пад уладу Пэрсіі, а затым — Расеі. Апірышчам незалежніцкага руху стала Заходняя Армэнія. Пры гэтым Пецярбург, што шчодра фінансаваў гэты рух, зыходзіў з прынцыпу: «Нам патрэбна Армэнія, але ня трэба армян». Першы незалежнік Мікаэл Налбандзян скончыў сваё жыцьцё ў Петрапаўлаўскай крэпасьці.

Армяне рабілі тэракты супраць турэцкіх улад, тыя арганізоўвалі пагромы, пераважна рукамі курдаў. На некаторы час усё аціхла ў 1908 г., калі адбылася моладатурэцкая рэвалюцыя. Некаторы час армяне і туркі жылі ў згодзе. Пра турэцкую рэвалюцыю шмат пісала першая «Наша Ніва».

Але надышла сусьветная вайна. Турцыя і Расея аказаліся адна супраць адной, а армяне — паміж імі. Туркі загадалі армянам высяляцца ў пустыні Мэсапатаміі. Усё было абвешчана ўнутранай справай Турцыі, клопатам пра цэласнасьць імпэрыі. На гэтай пазыцыі туркі стаяць і сёньня, хоць і зьяўляюцца ў самой краіне галасы прызнаць генацыд 1915 г. Падчас таго высяленьня загінула каля мільёна двухсот тысячаў армянаў.

Армяне ўжо амаль стагодзьдзе дамагаюцца прабачэньняў. Ці ёсьць у іх шанцы быць пачутымі? Прыклады ў гісторыі XX ст. ёсьць. Нямеччына прайграла ўшчэнт і мусіла адказваць за ўсе расавыя экспэрымэнты свайго фюрэра. А вось сёньняшнія лукашэнкаўцы зь пенай адхрышчваюцца ад Курапат, а Масква зноў ушаноўвае Мураўёва-вешальніка.

І кожны раз кат крычыць ахвяры: «Дакажы, што ты сам не вінаваты!»

**Вацлаў Шаблінскі**

# Свабодна асацыяваная дзяржава

Некалькі тыдняў таму ўрад Гішпаніі адхіліў праект аб пераўтварэньні Краіны Баскаў у свабодна асацыяваную з Гішпаніяй дзяржаву. Што такое свабодна асацыяваная дзяржава? Чаго дамагаліся баскі?

Упершыню статус свабодна-асацыяванай дзяржавы ў 1952 г. атрымала карыбская выспа Пуэрта-Рыка, якая ў 1898 г. пасьля гішпана-амэрыканскай вайны была захоплена ЗША. Пуэртарыканцы гэтым ня вельмі ўсьцешыліся і двойчы паўставалі супраць новай мэтраполіі. Каб знайсьці кампраміс, і быў распрацаваны статус «свабодна асацыяванай дзяржавы».

Замежную палітыку Пуэрта-Рыка ажыцьцяўляе ўрад ЗША, а яго жыхары лічацца амэрыканскімі грамадзянамі. У сваю чаргу, пуэртарыканцы ня плацяць падаткаў Вашынгтону і атрымліваюць ад яго значную фінансавую дапамогу. Мясцовую ўладу ажыцьцяўляюць пуэртарыканскі сэнат і губэрнатар, які выбіраецца насельніцтвам. Прычым апошні павінен ведаць гішпанскую мову.

Пасьля Пуэрта-Рыка такі статус атрымлівалі і іншыя карыбскія краіны. Для іх ён стаў прыступкай да поўнай незалежнасьці. Што да пуэртарыканцаў, то яны і сёньня на ростанях. У краіне пэрыядычна праходзяць рэфэрэндумы, дзе прапануецца выбар: захаваць статус-кво, атрымаць незалежнасьць ці ператварыцца ў адзін са штатаў. Выбар даволі складаны. Пуэрта-Рыка багацейшае за любую карыбскую краіну, аднак бяднейшае за паўнавартыя штаты ЗША. Таму пуэртарыканцы не сьпяшаюцца шукаць ад дабра дабра.

**УШ**

# Зрабі сам

## Як унесьці помнік у Сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў



16 красавіка сябры таварыства «Этна» Беларускага ўнівэрсытэту культуры разам з краязнаўчым клубам «Дыярыюш» БДПУ імя М.Танка прыбіралі старыя праваслаўныя могілкі ў Ракаве, якім ужо два стагодзьдзі. Самае ранняе пахаваньне адносіцца да 1827 г., багата надмагільных пліт сярэдзіны XIX ст. і пачатку XX ст.

Існуе імавернасьць зносу гэтых могілак. Паводле заканадаўства, калі могілкі не выкарыстоўваюцца больш за 50 год, яны падлягаюць зносу, а апошняе пахаваньне на іх адносіцца да 1956 г.

Адзіны спосаб уратаваць той ці іншы гістарычны аб'ект ад зьнішчэньня — унесьці яго ў Сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў.

На падрыхтоўку і падачу дакумэнтаў нам спатрэбіўся тыдзень. 26 красавіка ва Ўпраўленьні па ахове гісторыка-культурнай спадчыны зьбіралася рэспубліканская навукова-мэтадычная рада. Штодня нехта езьдзіў у Ракаў ці Валожын, зьвязваўся зь менскімі гісторыкамі і краязнаўцамі, зьбіраў дакумэнтацыю.

Урэшце Рада прыняла рашэньне. У Ракаве «зьявіўся» яшчэ адзін гістарычны помнік. Мы ўдвая павялічылі колькасьць гістарычных (XIX ст.) могілак, унесеных у Сьпіс помнікаў у Беларусі. Да гэтага часу ў яго ўваходзілі толькі Кальварыйскія могілкі ў Менску.

Статыстыка шакуе, бо ракаўскія могілкі далёка ня самыя старыя. Ёсьць значна больш старажытныя і каштоўныя — нават XVII ст. «Тэрмін даўнасьці» ў іх ужо даўно выйшаў, і яны могуць быць зьнесеныя ў любы момант.

Але мы можам вырашыць праблему сваімі сіламі. Патрэбна ініцыятыва! Успомніце, якія цікавыя аб'екты ёсьць у вашай мясцовасьці? Вы самі можаце ўратаваць іх ад занядбаньня. Мы прапануем актывізаваць працэс унясеньня важных гістарычных помнікаў у Дзяржаўны сьпіс. Працэс нескладаны.

Дзеля гэтага патрэбна:

1) заява на ўнясеньне аб'екту ў сьпіс;
2) уліковая картка аб'екту;
3) дазвол уласьніка;
4) выпіска з генпляну з прывязкай аб'екту;
5) фотафіксацыя;
6) кароткая гістарычная даведка.

Гэта дастаткова проста. Кароткую гістарычную даведку можа напісаць мясцовы краязнавец, генплян вы, хутчэй за ўсё, знойдзеце ў сельсавеце, там жа вам дадуць дазвол на ўнясеньне аб'екту ў сьпіс (для сельсавету гэта яшчэ адзін патэнцыйны турыстычны аб'ект), для фотафіксацыі спатрэбіцца толькі фотаапарат.

Больш пытаньняў выкліча пошук формы ўліковай карткі. Яе вы знойдзеце ва Ўпраўленьні па ахове гісторыка-культурнай спадчыны (Менск) ці ў раённых аддзелах культуры.

З свайго боку, мы гатовыя прапанаваць дапамогу ў вырашэньні розных пытаньняў па ўнясеньні аб'екту ў Дзяржаўны сьпіс — падзяліцца вопытам, знайсьці краязнаўцаў у гэтай мясцовасьці, даслаць форму ўліковай карткі і прыклад гістарычнай даведкі. **На ўсю справу вам спатрэбіцца ня больш за два тыдні.** Але праца таго вартая.

Толькі замацаваньне за помнікам статусу гісторыка-культурнай каштоўнасьці можа выратаваць шмат вельмі цікавых аб'ектаў у Беларусі ад зьнішчэньня і занядбаньня.

Нашы кантакты:
Павал Каралёў — старшыня гісторыка-краязнаўчага таварыства «Этна», тэл. 776-24-35, e-mail: raman_abramchuk@yahoo.com;
Цімох Акудовіч — старшыня краязнаўчага клюбу «Дыярыюш», тэл. 557-11-24, e-mail: cymus1@tut.by.

P.S. 21 траўня зьбіраецца вялікая талака для добраўпарадкаваньня «нова» помніка. Далучайцеся. Сустракаемся ля прыступак Унівэрсытэту культуры а 9.00.

## Супольна працаваць

«Што мы атрымалі ад «вяртаньня клясычнага правапісу»? Раскол у беларускай супольнасьці», — мяркуе чытач з Гарадні Юры Тарасевіч. Але хіба гэты правапіс каму замінае? Няўжо ён зьнізіў наклады беларускіх кніг і часопісаў, ці зьявіленьне мяккіх знакаў зьменшыла колькасьць чытачоў? Ці праз тарашкевіцу беларускія пісьменьнікі не ствараюць бэстсэлераў? Ці, можа, людзі аказаліся падзеленымі на два лягеры і нават не вітаюцца паміж сабою, бо адныя пішуць «зьвяз», а другія «саюз»? Такога няма. Бо цалкам нармальна суіснуюць і наркамаўка, і лацінка, і нэтарашкевіца, якіх нават не адна.

Але ў такой шматвэктарнасьці ёсьць і складанасьці. Найперш — як вучыць дзяцей у школе, як правяраць, што яны пішуць правільна. Ну, пакуль тарашкевіца неўнармаваная, пакуль няма «зводу правілаў» (пра які так доўга ідзе гаворка) і пакуль няма прычын спадзявацца на тое, што ўлады прымуць новы правапіс у якасьці афіцыйнага, няхай нават не замест, а побач, разам з існуючым, то адзіны варыянт застаецца — у навучальных установах правільным лічыць наркамаўскі правапіс. Добра, калі настаўнік раскажа вучням, што існуюць іншыя варыянты (лацінка і «пісьмо зь мяккімі знакамі»). А потым пабачым.

Ці будуць адначасова ўжывацца два правапісы, ці застанецца адзін зь іх, ці яны ўніфікуюцца — гэта пакажа жыцьцё, практыка. Прагрэс мовы, эвалюцыя ня робіцца ўлёткамі ці дэклямацыямі з трыбуны. Варта працаваць, ствараць, распаўсюджваць, ужываць. Больш тэкстаў, твораў. Каму больш падабаецца афіцыйны правапіс — калі ласка. Каму ня цяжка пісаць шэсьць мяккіх знакаў у слове «жыцьцесьцьвярджальнасьць» — калі ласка. А гэта сапраўды ня цяжка.

Жывая, нязмушаная беларуская мова шмат ужываецца ў Інтэрнэце. І там сапраўды тарашкевіца відаць часьцей. Гэтым правапісам актыўна карыстаюцца, ён выпрацоўваецца часам. З аднаго боку, гэта нават лепш, што дагэтуль няма зацьверджанага зводу правілаў. Ціпер нельга будзе крытыкаваць нэаклясычны правапіс, што ён «штучны», выдуманы тэарэтыкамі, адарванымі ад жыцьця, рэчаіснасьці. Сёньня рэчаіснасьць такая, што новы звод правілаў павінен казаць ня «правільна трэба пісаць вось так», а «правільна пішацца вось так».

Прыхільнікам мяккага знаку закідаюць: «Вы што, хочаце адмяніць мову, на якой пісалі Колас, Караткевіч, Быкаў? Спаліць іх кнігі і надрукаваць наноў, паўстаўляўшы мяккія знакі?» Ня думаю, што клясікі беларускай літаратуры пісалі наркамаўкай таму, што яны былі заўзятыя прыцўнікі тарашкевіцы. Тады не было выбару як пісаць, ісnаваў адзін варыянт (я кажу пра пісьменьнікаў, якія тварылі ў БССР, не разглядаю творчасьці людзей у эміграцыі, дзе тарашкевіца ўжывалася ці ня ўвесь час). А яшчэ, напэўна, ім было ня вельмі важна, як выглядае тэкст. Галоўнае — зьмест.

Так і нам ня варта дзяліцца на тых, хто разьбівае яйка з вострага боку, і на тых, хто з тупога. Лепей успрымаць адрозьненьні ў правапісе як розныя почыркі: нехта піша круглымі літарамі, нехта вуглаватымі. Нехта любіць сіні атрамант, нехта чорны ці зялёны. А калі нэатарашкевіца перамога, проста будуць перавыдавацца старыя тэксты ў сучасным выглядзе. Гэтаксама як цяпер перавыдаюцца тэксты Скарыны і іншых старадаўніх аўтараў. Абвінавачваньні ў схізьме, нападкі на тых, хто думае і робіць інакш, — гэта не вядзе да аб'яднаньня. Давайце лепш працаваць, ствараць нешта новае, паляпшаць існуючае. Калі ня можам разам, дык хай, прынамсі, пабач, але толькі ня супраць.

**Зьміцер Лапцёнак, Менск**

## «Ь» — гэта сьвятое

У газэце «Наша слова» ёсьць паласа «Пагоня за мову» зь мяккім знакам на шчыце, сымбалем барацьбы, абароны роднай мовы ад русіфікацыі. Але тэксты гэтай паласы напісаны якраз наркамаўскім правапісам. Мы жывём у цяжкі час, газэту могуць закрыць, самацэнзура і іншыя важкія прычыны могуць быць апраўданьнем зьнікненьню мяккіх знакаў. Незразумела іншае — калі вы здалі свае пазыцыі, дык чаму забыліся зьняць адтуль сьцяг?

Я — настаўнік. У клясным журнале вяду запісы зь мяккімі знакамі. Пазыцыя прынцыповая, але тлумачэньне сьмешнае: маўляў, калі хочаце, лічыце мае «лішнія» мяккія знакі памылкамі, бо на суседняй старонцы іншы настаўнік дапускае памылкі адвароткага кшталту — паставіў над «і» кропкі і думае, што гэта запіс па-беларуску. Не хачу пісаць «з памылкамі». Хачу доўгачаканага Зводу правілаў.

Шаноўны спадару Юры Тарасевіч, чаму Вам сёньня незразумелае захапленьне «рэпрэсаваным» правапісам? На дварэ ж усё той жа таталітарызм, што і ў канцы 1980-х — пачатку 1990-х. Усё тая ж барацьба з каляніяльным прыгнётам. Нават Ваш аргумэнт, што «супрацьпастаўленьне «тарашкевіцы» і «нетарашкевіцы» ўчыніла дадатковы падзел у супольнасьці», ня зрушыць мяне з мае пазыцыі. І з гэтым фактам Вам давядзецца лічыцца. Шчыра прызнаюся, што мне важнейшыя ідэалягічныя прынцыпы за еднасьць супольнасьці. А Вам наадварот? Калі гара не ідзе да Магамэта... Дык мо Вы зробіце крок да такой каштоўнай еднасьці? Наступіце на горла наркамаўскаму правапісу дзеля нас яднаньня! Нас мала, гэта праўда, але з Вамі будзе больш. Зрэшты, ня ў колькасьці справа, а ў стаўленьні да сьвятыні.

Навуковай рэформы правапісу так і не адбылося. Яна была абарваная грубым умяшаньнем ідэалёгіі. Мы памятаем і пра Ластоўскага, і пра Лёсіка. Мы адновім навуковую дыскусію і дапоўнім яе новымі аргумэнтамі. Мы ўсё ўзважым, каб «не пісаць два гукі пяцьцю літарамі». Мы знойдзем кампрамісы. Але дэбаты будуць весьціся пад знакам «ь». Нашы тэксты па рэформе клясычнага правапісу будуць пісаныя клясычным правапісам. Бо гэтак правільна з маральнага боку.

**Генік Лойка, Менск**

## Разьмеркаваньне: плюсы й мінусы

Стартавала чарговая абітурыенцкая кампанія — пачалося платнае цэнтралізаванае тэставаньне. Хвалююцца дзеці. Бацькі хвалююцца яшчэ больш: трэба ж уладкаваць дзіця. Калі цяпер для школьнікаў галоўнае — паступіць у абраны ўнівэрсытэт, то потым іх будуць цікавіць іншыя пытаньні. Напрыклад, разьмеркаваньне.

Абавязковае разьмеркаваньне выпускнікоў ВНУ было адноўлена ў 1997/1998 навучальным годзе. Паводле яго, кожны студэнт, што вучыўся за бюджэтны кошт, мусіў два гады адпрацаваць ці на дзяржаўным прадпрыемстве, ці ў дзяржустанове.

Новы праект закону аб вышэйшай адукацыі плянуе замацаваць норму, згодна зь якой адпрацоўваць дыплём дзяржаўнай ВНУ бюджэтнікам прыйдзецца цягам пяці гадоў. Прычым ёсьць варыянты: пяць год на адным месцы або праз два гады малады спэцыяліст можа зьмяніць працу, але ў межах Рэспублікі Беларусі. У адваротным выпадку студэнт павінен вярнуць дзяржаве грошы за адукацыю.

Абавязковае разьмеркаваньне, зрэшты, мае і плюсы. Гэта і гарантаваная праца маладым спэцыялістам, і набыцьцё працоўнага стажу, і штуршок да далейшага разьвіцьця кар'еры. Дастаткова прагледзець аб'явы аб працаўладкаваньні, каб пераканацца ў тым, што ніводная прэстыжная фірма або арганізацыя ня возьме на работу чалавека бяз досьведу.

Адмоўнае — перадусім нізкі заробак спэцыяліста-пачаткоўца ў дзяржаўных установах. Як пражыць доктару ці настаўніку на 60—70 даляраў у месяц? Апроч гэтага, ёсьць і псыхалягічны момант. Чалавек па-рознаму ставіцца да той працы, якую знайшоў сам, і да той, куды цябе «разьмеркавалі». У першым выпадку ён выкладваецца на ўсе 100% (прэстыжная праца, якую шкада страціць), стаўленьне да працы ў другім выпадку самае рознае.

Дзяржава, заяўляючы пра абавязковасьць разьмеркаваньня, націскае на два аргумэнты: студэнты павінны адпрацаваць свой доўг дзяржаве; дзяржава клапоціцца пра студэнта, забясьпечваючы першым працоўным месцам.

Так, канстытуцыя гарантуе ўсім грамадзянам бясплатную адукацыю, і няма ніякіх агаворак, што студэнт пры пэўных абставінах павінен вяртаць грошы. Але з чаго складаецца бюджэт дзяржавы? З падаткаў, якія плацяць бацькі студэнтаў і прадпрыемствы, дзе бацькі працуюць. Адсюль вынікае, што адукацыя фінансуецца менавіта імі, толькі ўскосна.

**Бясплатная** вышэйшая адукацыя ў Беларусі? Таксама міт. У той жа Нямеччыне маецца больш за трыста ВНУ (першае месца ў сьвеце па колькасьці ўнівэрсытэтаў), 98% зь іх дзяржаўныя. Плата за навучаньне тут не прадугледжана. Замежныя студэнты таксама вучацца бясплатна пры той умове, што яны вытрымалі іспыты па нямецкай мове. Абавязковае разьмеркаваньне студэнтаў прысутнічае ў тых выпадках, калі нейкая карпарацыя або фірма запрасіла студэнта на працу (ня варта казаць, што студэнт пры гэтым павінен быць ня супраць). Бясплатная вышэйшая адукацыя — дзяржаўная палітыка Германіі, такую палітыку можа дазволіць сабе толькі эканамічна і палітычна моцная дзяржава. Ці зьяўляецца такой дзяржавай Беларусь?

Студэнты — народ актыўны і прагматычны, пакаленьне *next* хоча жыць «тут і цяпер» і мець *нармальныя* грошы за *нармальную* працу «тут і цяпер». Шкада, калі іх актыўнасьць праявіцца ў іншай краіне. Найлепшыя зьяжджаюць? Спадзяюся, што праз нейкі час можна будзе ўпэўнена адказаць: «Не! Найлепшыя застаюцца працаваць на *сваю* краіну». Аптымісты застаюцца аптымістамі, рэчаіснасьць — беларускай рэчаіснасьцю.

**Дар'я Ліс, Смургоні**

## Узор мітатворчасьці

Дрэнна, калі СМІ становяцца сродкамі масавай прапаганды (ці прамыўкі мазгоў). Тады татальна, мэтанакіравана ачышчаецца сьвядомасьць чалавека ад відавочнага, разумнага, «неістотнага»... Мо толькі суровая рэальнасьць ці асобасная ўстойлівасьць могуць засьцерагчы ад ідэалягічнай навалы.

«З кім, на вашу думку, падтрымлівае сяброўскія дачыненьні Рэспубліка Беларусь?» — такое пытаньне было прапанавана жыхарам Маладэчна ў часе незалежнага сацыялягічнага дасьледаваньня ў лютым–сакавіку. «Думкі ў лічбах» звычайных грамадзян азадачылі... Аб'ектыўныя паказчыкі гістарычнага, культурнага, эканамічнага і стратэгічнага разьвіцьця нашай краіны зусім не дапускаюць таго шэрагу дружалюбных краін, які быў атрыманы. У парадку ўбываньня рэйтынгу гэта Расея, Казахстан, Украіна, Польшча, Кітай, Германія, Літва, Латвія. Прыгледзімся ўважлівей. Казахстан не ўваходзіць і ў пяцёрку нашых найважнейшых гандлёва-эканамічных партнэраў, знаходзіцца за тысячы кілямэтраў ад Беларусі, а тут упэўнена займае другую прыступку пасьля «нашай» Расеі, пераўзыходзячы ў працэнтных адносінах шматвяковых суседзяў Польшчу, Літву, Латвію разам узятых! Дый асацыюецца гэтая ўсходняя краіна ў масавай сьвядомасьці часьцей з тэлевізійным абліччам Нурсултана Назарбаева на бясконцых рытуальных самітах. Што Казахстан — вынік мітатворчасьці «на патрэбу сёньняшняга дня», ускосна пацьвярджае тое, што ў меркаваньнях больш пажылых людзей «замежнапалітычная вага» гэтай краіны для Беларусі зьмяншаецца. Дарэчы, як і Кітаю... Цікава, якім чынам адаб'юцца на «віртуальным» сяброўстве з Казахстанам у сьвядомасьці людзей падзеі ў суседнім Кыргызстане?

Колькі слоў пра найбліжэйшы «паўднёвы вэктар». Да аранжавай рэвалюцыі Ўкраіна ў нашых СМІ калі й прысутнічала, дык толькі ледзь-ледзь. Між тым аб'ём узаемнага гандлю нашых краін у 2004 г. дасягнуў аднаго мільярда даляраў, а сёлета «блакітныя экраны» гавораць пра рубеж у паўтара мільярда.

Такія вось замежнапалітычныя рэбусы «для народу»...

**Сяргей Брадавы, Маладэчна**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.
З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# Соф'я Валадароўна, каралева Даніі

Імя гэтай каралевы сёньня невядомае ў Беларусі. Між тым жанчына, якая ўвайшла ў эўрапейскую гісторыю як «Sophie av Minsk og Polotzk», была жонкай аднаго з наймагутнейшых каралёў дацкай гісторыі і заснавальніцай «па кудзелі» дацкай каралеўскай дынастыі. Яе дзеці сядзелі на дацкім, швэдзкім і францускім тронах. Беларуская гісторыя разгарнула яшчэ адну сваю дзівосную старонку. Сэнсацыйнае адкрыцьцё зрабіў гісторык **Андрэй Катлярчук**.



СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

Дачка князя менскага, а пазьней і полацкага Валадара Глебавіча (памёр у 1161) Сафія нарадзілася каля 1141 году, напэўна, у Менску.

У сярэдзіне XII ст. полацкая зямля знаходзілася на вяршыні сваёй магутнасьці. Полацкая дзяржава валодала ня толькі замкамі Кукенойс і Герцыке ў ніжнім цячэньні Заходняй Дзьвіны (сёньня тэрыторыя Латвіі), але й кантралявала Рыскую затоку і разам зь ёй усходнюю Балтыку.

Менскі князь Валадар пад той час быў таксама князем Полацкім. Ён быў з дынастыі Рагвалодавічаў, чый радавод Алег Латышонак выводзіць ад Германарыха. Жонкаю Валадара была польская князёўна Рыкіса.

Ня выключана, што Валадар пазнаёміўся зь ёю, хаваючыся ў Польшчы. Там ён ратаваўся ад кіеўскага палону і высылкі ў Бізантыю. Рагвалодавічы вялі актыўную замежную палітыку, таму не павінен выклікаць зьдзіўленьня ўзяты ў 1157 годзе шлюб дачкі князя з дацкім каралём Вальдэмарам I, адным з наймагутнейшых каралёў дацкай гісторыі (1131—1182, на пасадзе — з 1157 году) з дынастыі Эстрыдсэнаў.

Запісы пра гэты шлюб зьмяшчаюць летапісы XII стагодзьдзя «Славянская хроніка» Арнольда зь Любэку і «Граматыка Саксаў», а ўскосныя згадкі пра Соф'ю — іншыя заходнеэўрапейскія крыніцы. Іх знайшоў гісторык з Стакгольмскага ўнівэрсытэту Андрэй Катлярчук. Раней гэтыя надзейныя крыніцы папросту не траплялі пад увагу беларускіх гісторыкаў. Пра Соф'ю Валадароўну няма нават згадкі ў шасьцітамовай «Энцыклядыі гісторыі Беларусі»!

Сямейнае жыцьцё Вальдэмара й Соф'і было шчасьлівым. Соф'я нарадзіла двух сыноў і шэсьць дачок. Дзьве зь іх, згодна з полацкай традыцыяй, абралі кляштар. Астатнія ўзялі шлюб з тагачаснымі ўладарамі Эўропы.

Сама Соф'я не абмяжоўвалася хатнім жыцьцём ды брала актыўны ўдзел ў палітыцы. У горадзе Калундбарг Соф'я пабудавала катэдру, якая лічыцца адзінай сярэднявечнай царквой Скандынавіі, пабудаванай у бізантыйскім стылі. З тых, што захаваліся — напрыклад, полацкі храм у Вісьбю на Готляндзе ляжыць у руінах. Прычым калі параўнаць від калундбарскай катэдры 1801 году з рэканструкцыямі першапачатковай полацкай Сафіі, відавочна, царква ў Калундбаргу — насьледаваньне полацкаму сабору.

Сафія перажыла свайго мужа і памерла 5 траўня 1198 году, на 58-м годзе жыцьця. Яна ляжыць побач з Вальдэмарам у каралеўскай пахавальні места Рынгстэд. Захаваліся два яе пазьнейшыя партрэты 1580 і 1757 гадоў.

Цікавы лёс чакаў іхных дзяцей і, адпаведна, унукаў Валадара Глебавіча. Інгеборга пабралася з каралём Францыі Філіпам II Аўгустам, Рычыза — з каралём Швэцыі Эрыкам Кнудсанам, Соф'я-малодшая выйшла за князя Арлямундзкага Сыгфрыда, нарэшце, Гелена стала жонкай князя Люнэбурскага Вільгельма. Сыны Кнуд IV (1163—1202) і Вальдэмар II (1170—1241) па чарзе ўспадкавалі бацькаў прастол.

Муж Інгеборгі, Філіп II Аўгуст, кіраваў адным з крыжовых паходаў і зацьвердзіў статут Сарбоны. Як муж ён ня быў надта верны. Калі пабачыў магчымасьць павялічыць свае зямельныя ўладаньні, ён кінуў Інгеборгу, і за гэтае скасаваньне шлюбу ў 1200 годзе папа Інакенці III адлучыў яго ад царквы і наклаў на яго Францыю інтэрдыкт. Тым ня менш, кароль выпусьціў Інгеборгу з замку і стаў жыць зь ёй як з каралевай толькі пасьля сьмерці яе суперніцы Агнэсы. Такімі былі тагачасныя норавы.

Што датычыць Вальдэмара II, дык ён прадоўжыў дацкую экспансію на ўсход, заснаваў у 1219 г. на месцы захопленага замку Лінданіса Талін (што значыць «дацкі замак»).

Вынікае пытаньне, чаму імя каралеўны-беларускі малавядомае сучасьнікам? Гісторыя полацкай дзяржавы пішацца на падставе лівонскіх хронік ды наўгародзкіх і ўладзімерскіх летапісаў, якія стваралiся тагачаснымі ворагамі Полаччыны. Выходзіць тое самае, што пісаць гісторыю Ізраілю па арабскіх крыніцах. Але ж да канца XVIII стагодзьдзя Беларусь была неад'емнай часткай эўрапейскай цывілізацыі, і процьма патрэбных крыніц ляжыць менавіта ў заходніх архівах.

Напрыклад, гарадзкі архіў швэдзкага Вісьбю перапоўнены крыніцамі на старанямецкай і лацінскай мовах, што тычаць гандлю гэтага места з Полацкам у X—XIII ст. Нацыянальны архіў Галяндыі захоўвае матэрыялы па гандлі полацкіх купцоў XVII стагодзьдзя ў гэтай краіне. Нас безумоўна чакаюць новыя захапляльныя адкрыцьці.

Прыклад Соф'і неадзінкавы. Нашы землякі ў Новы Час дабраліся і да Новага Сьвету. Як Крыштап Арцішэўскі — пратэстант зь Беларусі XVII стагодзьдзя. Гэты «пісар рускай мовы» пры двары Радзівілаў у час контрарэфармацыі ўцёк у Амстэрдам, а адтуль падаўся ў Бразылію, дзе даслужыўся да пасады адмірала галяндзкага флёту.

Чаму Соф'і не заўважалі беларускія гісторыкі, чаму існавала такая «сьляпая зона», лёгка тлумачыцца. Беларускім гісторыкам у XIX—XX стагодзьдзях прадпісвалася адшукваць праявы ўсходнеславянскага адзінства і прагі беларусаў «узьяднацца» з Расеяй. Хоць беларускія землі натуральна належалі да балтыйскае цывілізацыі, і там палягалі інтарэсы і сувязі полацкіх і старалітоўскіх князёў, гэтая галіна не рэкамэндавалася для дасьледаваньня. У выніку гісторыя Беларусі выходзіла далёкая ад гістарычнай праўды і, мякка кажучы, нецікавая, але ідэалягаў толькі цешыла.

Пра пераадкрытую Соф'ю Менскую і Дацкую, напэўна, будуць напісаныя кнігі і зьнятыя фільмы. Галерэя гістарычных пэрсанажаў Беларусі папоўнілася.

### Што адбывалася ў 1157 годзе ў Эўропе і сьвеце?

**1155**
нарадзіўся Чынгісхан; завершана будаўніцтва каралеўскага парталу сабору ў Шартры.

**1157**
8 жніўня ў Оксфардзе нарадзіўся Рычард, будучы кароль Англіі Рычард Ільвінае Сэрца.
Карона Даніі дасталася авантурнаму конунгу Вальдэмару I Вялікаму.
Брандэнбург стаў складовай часткай германскай дзяржавы.
15 жніўня на балі ў Кіеве атручаны князь Суздальскі і Кіеўскі Юры Даўгарукі.

**1158**
Стотысячнае войска Фрыдрыха I Барбаросы ўварвалася ў Італію.

**1160**
нарадзіўся Робэрт Фітцут, прэтэндэнт на тытул графа Хантынгтонскага. Мяркуецца, што гэта ён — легендарны Робін Гуд.

**1162**
Фрыдрых I Барбароса разбурыў Мілян.

**1163**
Пачалося ўзьвядзеньне Сабору Нотр-Дам у Парыжы.



БЕЛАРУС ПА КУДЗЕЛІ. Дацкі крэйсэр «Valdemar Sejr», названы ў гонар Вальдэмара II, сына Соф'і Валадароўны. Быў спушчаны на ваду ў 1941 г. ў Вялікабрытаніі. У Дацкі каралеўскі флёт залічаны ў 1954 г.



АНДРЭЙ КАТЛЯРЧУК — аўтар кнігі «Швэды ў гісторыі і культуры Беларусі», ганараваны прэміяй Багушэвіча. Дактарант Стакгольмскага ўнівэрсытэту. Мае беларускія (Тураў) карані. Нарадзіўся ў Новачаркаску ў сям'і беларусаў. Вучыўся ў Бранску і ў Пецярбурзе, абараніў у горадзе на Няве кандыдацкую дысэртацыю. Тэма — параўнальны аналіз сьвяточнай культуры гарадоў Беларусі і Расеі ў XVII ст.



**ІХ МАГЛА ТРЫМАЦЬ У РУКАХ КАРАЛЕВА СОФ'Я. Манэты часоў Вальдэмара I і Вальдэмара II.**

# Фабіян! Фабіян!..

**УЛАДЗІМЕР СОДАЛЬ**

Ад дачкі легендарнай Зоські Верас Галіны пачуў: за два-тры дні да скону яе матуля ўжо нічога ня памятала, толькі трызьніла, паўтарала, гукала:

— Фабіян! Фабіян! Фабіян!

Дачку Зоські Верас Галіну, ды ня толькі яе, уразіла, што яе матуля падчас трызьненьня гукала не сваіх дзяцей, не матулю сваю, урэшце, не свайго мужа Антона Войціка, зь якім пражыла 22 гады, а менавіта Фабіяна. Хто такі гэты Фабіян?

Адказ знаходзім ва ўспамінах Зоські Верас, а дэталі — у яе пакуль не апублікаванай перапісцы. Гаворка ідзе пра Фабіяна Гіляравага, сына Шантыра, літаратара, грамадзкага і палітычнага дзеяча. І першага — грамадзянскага — супружанца Зоські Верас, тады яшчэ Людвікі Савіцкай.



Зоська Верас перажыла свайго першага мужа Фабіяна Шантыра на семдзесят гадоў.

Пазнаёмілася яна зь неардынарным юнаком Фабіянам у 1915 г., неўзабаве пасьля таго, як прыехала ў Менск з Гарадзеншчыны. Фабіяну было 28, а Зосьцы Верас — 23.

«А жылі мы па-ваеннаму, — згадвала Зоська Верас, — ня разам, а асобна, і «езьдзілі да сябе ў госьці» ды пісалі амаль кожны дзень. Што перажылося — гэтага не раскажаш, не апішаш. Было ўсяго: і добрага, і благога. То сходзіліся, то разыходзіліся… Бачыце, папала каса на камень. Я не была з тых мяккіх натураў, якімі можна кіраваць, мела сваю волю, свае погляды. Да таго ж вельмі рознае выхаваньне, рознае паходжаньне… Але гэта не перашкаджала: цанілі адзін аднаго. А я і шмат выбачала, калі было патрэбна…»

У двух лістах да мяне Зоська Верас якраз згадвае пра свае сустрэчы з Фабіянам у Бабруйску, пра тагачасныя палітычныя ўмовы ў горадзе на Бярэзіне: «Ён, як ваенны, выехаць адтуль ня мог, а я не хацела кідаць свае працы ў Камітэце помачы ахвярам вайны. І вось мы час ад часу езьдзілі да сябе ў адведзіны на дзень, найбольш на два... Шпіталь на 600 ложкаў зьмяшчаўся ў крэпасьці, там жа жыў мой муж... Грубыя муры, панурыя вузкія калідоры. Але салі (залі. — **Аўт.**) хворых і пямяшканьні пэрсаналу сьветлыя, зь вялікімі вокнамі…

Першы раз я там была ў красавіку 1917 году. Паехала разам з трупаю Ф.Ждановіча, якая мела выступіць у Бабруйску на просьбу Ф.Шантыра (маю яго ліст у гэтай справе) — са спэктаклем «У зімовы вечар» Э.Ажашковай…

Прыяжджаючы на які дзень, я часта памагала мужу ў шпітальных рахунках — шасьцьсот хворых гэта ня жарты! — або езьдзілі глядзець заарандаваныя для шпіталю сенажаці і г.д... Быў нейкі добры клюб, дзе выступала беларуская трупа Ждановіча, а артыстаў на начлег і вячэру ўладкавалі ў самім шпіталі. Вячэрай я займалася пры помачы салдата… Была там моцная бел. арганізацыя — Бел. сац. грамада, мітынгі, зьбіралася па 300 асоб. Часта лекцыі-вечарыны з выстаўкамі бел. кніг і іх прадажай. Ладзілі Купальле…».







**КНІГА, якую Фабіян Шантыр падпісаў Зосьцы Верас: «На памяць лепшаму прыяцелю ў знак супольнага шчырага каханьня Бацькаўшчыны Людвіцэ С. Аўтар».**

У канцы 1918 г. Зоська Верас пакінула галодны ды халодны Менск, паехала на радзіму сваіх дзядоў на Сакольшчыну: цяжка захварэла маці.

З Фабіянам дамовіліся, што праз нейкі час, як толькі будзе мажлівасьць, прыедзе туды і ён. Неўзабаве пасьля прыезду на Сакольшчыну, прыгадвае Зоська Верас, нарадзіўся сынок… А ў даволі хуткім часе — вестка праз газэты аб сьмерці Фабіяна Шантыра. Але то была не натуральная сьмерць. Яго, 33-гадовага няўрымсьлівага экс-камісара БССРаўскага ўраду, расстралялі бальшавікі.

Больш даверліва Зоська Верас пра свае стасункі з Фабіянам Шантырам распавяла Вандзе Лявіцкай-Лёсік. І гэта зразумела: Ванда Лёсік і Зоська Верас — даўнія сяброўкі. То з кім, як ня з Вандаю, зашчыраваць, расказаць ёй самае патаемнае, чаго іншаму — ні-ні:

«Дарагая мая, мілая Вандачка!

Цікавішся, як зляжылася маё жыцьцё? Ну што ж, пачну «споведзь», хоць крыху баюся, што асудзіш мяне, а мо і прыязьнь Твая да мяне аслабне…

Мушу пачаць з апошніх месяцаў у Менску 1918 г. Ты, пэўна, помніш, што я мела выходзіць замуж за Ф.Шантыра. Ён прасіў згоды маёй мамы, быў у ксяндза Гадлеўскага, каб даведацца, якія патрэбны дакумэнты і г.д. Але тут умяшаўся Р.Зямкевіч. Паехаў спэцыяльна ў Бабруйск і нагаварыў, што я вяду сябе немаральна, маю каханкаў. Ш. мне гэта выказаў, але закончыў, што ён усё ж такі жаніцца не адмаўляецца. Я, абураная, адказала, што ласкі не патрабую. Прайшоў час. Апошнія месяцы ў Менску былі для мяне страшэнна цяжкія. Мама мая хварэла, ляжала ў шпіталі, а я чулася такая загубленая, адзінокая. Хоць, праўда, Фальскі і Ксеня Сьцяпанаўна ні на хвіліну мяне не пакідалі і мамай маёй апекаваліся.

Я вельмі тужыла па сямейным жыцьці, з зайздрасьцю глядзела на кожнае дзіця на вуліцы… Якраз тады я ізноў некалькі разоў спаткалася з Ш. Ну і — сталася…

Я выехала не адна — у 1919 г. радзіўся сын, ужо ў Горадні. Прозьвішча свайго бацькі ён дастаў пры хрысьце. Вось мой грэх. Строга судзіш? Што ж, мо і варта…»

(Зь ліста Зоські Верас да Ванды Лявіцкай ад 15 жніўня 1964 году.)

Фабіян Шантыр стаў першай бальшавіцкай ахвярай з так званай беларускай намэнклятуры. Зоська Верас праз усё жыцьцё лічыла Шантыра сваім першым мужам — бацькам свайго сына.

Таму нядзіўна, што Зоська Верас на сконе жыцьця адзіна гукала Шантыра:

— Фабіян! Фабіян! Фабіян!

**Ілюстрацыі са збору Віталя Скалабана**

ЗАГАДКА АДНЭЙ КАРТАЧКІ

# Таямнічая госьця зь мінулага

На артыкул «Палута ці Ларыса» ў «НН» адгукнуўся чытач з Горадні. Ён паведаміў, што бачыў запаветную фатаграфію ў гарадзенскім Музэі Максіма Багдановіча ў экспазыцыі, прысьвечанай Ларысе Геніюш. Дырэктарка музэю Алена Гайко пацьвердзіла нам гэта. Але ўпэўненасьці ў тым, што на фота сапраўды Геніюш, ня выказала. Такім чынам, арыгінальны здымак знойдзены! Ён датаваны 1927 г.

Аналіз вопраткі пацьвярджае, што здымак адносіцца да 20-х гадоў ХХ ст. Для тае пары была характэрна свабода формы. Адзеньне не абцягвае цела. Мяккія тканіны маскіруюць натуральныя лініі фігуры. На той час модная кароткая стрыжка, ярка нафарбаваныя губы, рэзка падкрэсьленай формы бровы, вочы з апушчанымі вейкамі. Характэрны для тагачаснай моды капелюшы-званы, якія цалкам закрываюць валасы, або шыракаполыя капелюшы, але таксама глыбока пасаджаныя на галаву.

Фатаграфія трапіла ў музэй ад Данута Бічэль-Загнетавай, якая асабіста знаюся з паэткай і атрымала ад яе фатаздымак у падарунак у 1982 г. Фатаграфія, паводле слоў спн.Дануты, была зроблена ў праскі пэрыяд жыцьця паэткі (пры канцы 1930-х), калі яна магла сабе дазволіць апранацца адпаведна эўрапейскай модзе, была маладой і прывабнай жанчынай і, магчыма, яшчэ ня мела звычкі падціскаць вусны пры фатаграфаваньні, калі пазавала перад фатакамэрай.

Думкі, што на здымку Ларыса Геніюш, прытрымліваецца таксама Пятро Рашэтнік, які пазнаёміўся з паэткай у савецкім канцлягеры і сябраваў з Геніюшамі да канца іхнага жыцьця.

Дасьледаваньне гэтай гісторыі на старонках «НН» не засталося без увагі кандыдата гістарычных навук Міхася Чарняўскага, які браў непасрэдны ўдзел у стварэньні зэльвенскага помніка паэтцы. На яго думку, малаімаверна, што на здымку-паштоўцы Ларыса Геніюш. Надпіс «Ваша Ларыса» цалкам мог быць, паводле меркаваньня гісторыка, жартоўным. Вочы, нос, вусны, прапорцыі рысаў твару не стасуюцца зь іншымі вядомымі здымкамі паэткі.



**Можна сцьвярджаць, што гэта не Ларыса Геніюш (95%) і не Палута Бадунова (80%)**

Падобнай думкі трымаецца і беларуская паэтэса, журналістка радыё «Свабода» Валянціна Аксак. На спрэчным здымку, паводле яе слоў, без сумневу, выява не Ларысы Геніюш. У паэткі на ўсіх вядомых фатаздымках сьціснутыя, расьцягнутыя вусны. Нідзе няма пачуцьцёвых, рамантычных рыс — наадварот, фатакарткі паэткі прэзэнтуюць твар мужнай, мэтанакіраванай жанчыны, падкрэсьлены, да таго ж, валявым падбародзьдзем.

А што думае Анатоль Сідарэвіч, які дасканала ведае гісторыю беларускай сацыял-дэмакратыі? Ён упэўнены, што на здымку дакладна не Палута Бадунова.

Архівістка Аляксандра Гесь трымаецца такога самага меркаваньня. Ня ведае, чаму зьявіўся гэты здымак у кнізе «Краіна Беларусь», і Ўладзімер Ляхоўскі, які рыхтаваў фотаматэрыялы з найноўшай гісторыі Беларусі для гэтага выданьня. Вядомы гісторык аўтарытэтна сцьвярджае, што гэта не Палута. На думку сп.Уладзімера, іканаграфія гісторыі Беларусі ўвогуле слаба распрацаваная, і выпадкаў, калі аўтары ці рэдактары робяць памылкі ў анатацыях да фатаздымкаў, ня так ужо і мала.

Што ж мы канстатуем? Мы маем здымак нявыяўленай асобы, апазнаць якую няма магчымасьці. Больш-менш дакладна можна сцьвярджаць, што гэта не Ларыса Геніюш (95%) і не Палута Бадунова (80%).

Будзем шукаць далей.

**Арцём Лява**

# Шляхам Валконскай

18 сьнежня 1947 г. ваенны трыбунал войск МУС Маскоўскай акругі прыгаварыў мяне па арт. 58–1а да 25 гадоў зьняволеньня.
Сьвет перавярнуўся, падзяліўся на дзьве часткі: мінулае, дзе было 29 гадоў жыцьця, і будучыня, якой ужо фактычна не было, бо ўперадзе чакала турма. Лягер, краты, празь якія можна было бачыць толькі кроплю белага неба... Успаміны 86-гадовага **Ўладзімера Лялькова**, былога настаўніка, выхадца з Кармянскага раёну.

## Масква—Інта—Мінлаг

Усё, чым жыве чалавек, — вера, надзея, любоў — зьнікла ў адначасьсе. Праваліласа ў бездань, пакінуўшы звонку толькі фізычнае існаваньне.

Наскрозь спустошаны, змораны фізычна і маральна, абыякавы да ўсяго навакольнага, высадзіўся я ў тую зіму на архіпэлягу ГУЛАГ.

Інта сустрэла нас — мяне з сотняй іншых зьняволеных, што прыбылі этапам з Масквы, — саракаградусным марозам, мэтровым сьнегам, брэхам ваўкадаваў, што кідаліся на нас, і злым канвоем з аўтаматамі напагатове: «Крок управа, крок улева лічым уцёкамі, страляем без папярэджаньня».

Страляць яны ўмелі, іх вучылі гэтаму амаль зь дзяцінства, вучылі праз «Варашылаўскага стралка», ДТСААФ, ГТО і г. д., вучылі не дабрыні, не чалавечнасьці, не спагадзе ды міласэрнасьці, а забойству, што прарастала шматлікімі Курапатамі на ўсёй сталінска-берыеўскай прасторы.

Мінэральны лягер, куды нас прывезьлі, налічваў восем ці дзевяць лягпунктаў, прызначаных для здабычы каменнага вугалю са шматлікіх шахт, тэрыконьнікі якіх падпіралі неба вакол сталіцы Комі і іншых яе гарадоў.

Шосты лягпункт, дзе знаходзіўся я, лічыўся перасыльным, сюды амаль штотыдзень прыбывалі этапы з розных краёў Саюзу, тут яны крыху адпачывалі, сартаваліся і накіроўваліся на працоўныя лягпункты.

Асобным пунктам была Абезь — «пагост», як сумна называлі яе вязьні. Сюды адсылалі старых, зьнядужаных, прызнаных непрацаздольнымі. Адсюль ужо амаль ніхто не вяртаўся. Зямля там хавала ў вечнай мерзлаце самую інтэлігентную частку зьняволеных — артыстаў, музыкантаў, пісьменьнікаў, вучоных, якія, трэба сказаць, найцяжэй пераносілі лягернае жыцьцё. Менавіта там знайшлі сабе магілу многія знакамітыя беларусы, пахаваныя за «нацдэмаўшчыну».

Зь лягпунктаў на шахты зьняволеных вадзілі калёнамі пад узмоцненым канвоем з сабакамі. Калі калёны сустракаліся, тых, хто ішоў назад, зводзілі з дарогі, саджалі ў сьнег, на зямлю, сурова загадваючы «не вертухацца».

Вядомы расейскі паэт Яраслаў Сьмелякоў, які ў той час «адпачываў» у Інце, даволі вобразна абмаляваў такія сустрэчы:

Когда встречаются этапы
Вдаль по дороге снеговой,
Овчарки рвутся с жарким храпом
И злее бегает конвой.

И на ходу колонне встречной,
Идущей в свой тюремный дом,
Один вопрос тот самый вечный,
Сорвавши голос, задаём.

Он прозвучал нестройным гулом
В краю морозной синевы:
Кто из Смоленска? Кто из Тулы?
Кто из Орла? Кто из Москвы?

И слышим выкрик деревенский,
И ловим отклик городской,
Что есть и тульский, и смоленский,
Есть из поселка под Москвой...

Ах, вроде счастья выше нету,
Сквозь индевелые штыки
Услышать хриплые ответы,
Что есть и будут земляки...

## Сталіца палітзьняволеных

На працягу 1951—1952 г. Мінлаг стаў цалкам лягерам палітзьняволеных. Бытавікоў паступова адсюль вывезьлі, а рэжым узмацнілі да неймавернасьці. За найменшае парушэньне вязьняў зьмяшчалі ў БУР — барак узмоцненага рэжыму — на голыя нары, на хлеб і ваду.

На вокны ў жылых бараках паставілі краты, дзьверы на ноч замыкаліся на замкі. Кожнаму вязьню на бушлат сьпераду і ззаду прышылі нумары. Быў да гэтага зьняволены Пятроў ці Паўлаў — стаў зьняволены нумар 147 ці 148. Гэтым нас абязьлічылі, зрабілі безыменнымі рабамі. Далі зразумець, што выратаваньня для нас няма, што быць нам за кратамі да скананьня.

Хадзілі чуткі, што гэтаму папярэднічала паўстаньне зьняволеных недзе ў Варкуце ці Пячоры. Палітычныя быццам абяззброілі ахову, пасадзілі ў падвал адміністрацыю, увялі ў лягеры свае парадкі. Трымаліся яны там досыць доўга, пакуль ня зьнікла апошняя лыжка харчу.

Трэба сказаць, што ў Мінлагу зьняволеныя таксама не былі зусім абыякавымі і безыдэйнымі да таго, што рабілася. Тайна стваралiся гурткі і ячэйкі аднадумцаў, адшуквалася, дзе толькі было магчыма, сякая-такая «зброя» — жалезныя пруткі, пікі, сякеры, якія пільна хаваліся ў надзейных месцах. «На ўсякі выпадак», — дзялiўся са мною думкамі былы ваеннапалонны, франтавік-палкоўнік Канавалаў, які меў 25 гадоў за тое, што застаўся жывым у нямецкім палоне. «Новая вайна магчыма ў любы дзень і гадзіну, тады



берыеўцы пастараюцца нас зьнішчыць, ведаючы, якую пагрозу іх існаваньню прадстаўляем мы — некалькі мільёнаў палітасуджаных. Менавіта таму нас і сабралі ў асобыя лягеры. А тут пачалі трымаць за двайнымі кратамі — так зручней і бясьпечней расстрэльваць. Дарэчы, у мінулую вайну, дзе пад пагрозай немцаў НКВД не пасьпявала вывезьці палітычных з турмаў ці лягераў, іх неадкладна расстрэльвалі. Чакаць іншага ад гэтых нелюдзяў мы ня маем права».

Зазначу, што самымі арганізаванымі і аб’яднанымі ў інцінскім лягеры былі заходнія ўкраінцы — бандэраўцы — ды «лясныя браты» — літоўцы.



**Я нечакана ўбачыў яе ў натоўпе такіх жа маладзенькіх сяброўак. Убачыў перш за ўсё вочы. Вялікія, сьветла-карыя. Бяздонныя. Зь лёгкім смуткам. З заваражальнай пяшчотай. Зь цікаўнасьцю, дапытлівасьцю, даверлівасьцю.**

Маё лягернае жыцьцё зь цягам часу неяк «наладзілася», я прымірыўся з абставінамі, працуючы ў КВЧ — культурна-выхаваўчай часьці, меў досыць вольнага часу, у які мог нават нешта пісаць, тварыць. Але хутка і тут жыцьцё «зьехала з рэек».

## «Якая ў яе была ўсьмешка»

Начальнік КВЧ маёр Шаладонаў аднойчы, калі я зьбіраўся ісьці «дадому», прапанаваў затрымацца.

— Кім вам прыходзіцца Клімовіч? — спытаў ён і, убачыўшы мой устрывожаны ці разгублены твар, паясьніў: «Клімовіч Сафія Мікалаеўна на мінулым тыдні была ў Інце. Яна шукала вас. Прыехала сюды бяз пропуску і дазволу. Яе адправілі назад у Беларусь».

Ці трэба казаць, наколькі гэтая навіна ўстрывожыла і занепакоіла мяне. «Значыць, Соня не паслухалася мяне, — разважаў я. — Яна не адраклася. Ня выйшла замуж і, пэўна, яшчэ любіць мяне…»

Я ня мог заснуць у тую ноч і ўсё ўспамінаў нашу апошнюю сустрэчу.

— Лёс разьдзяліў нас, мы ніколі ўжо ня зможам быць разам, ты маладая, прыгожая, ня маеш права губіць сваё жыцьцё, — пераконваў я. — Тым больш жыцьцё нашага сынка. Ні ты, ні ён не павінны быць сваякамі «ворага народу». Наш шлюб не зарэгістраваны, цябе ня будуць перасьледаваць, палюбі другога, вартага цябе, і я буду за гэта вечна табе ўдзячны.

Нечаканае паведамленьне Шаладонава надоўга вывела мяне з раўнавагі, прымушала думаць і думаць пра жонку. Ярка паўстала перад вачыма наша першая сустрэча.

Ішоў другі дзень вайны. Соня зь Менску, дзе яна вучылася ў мэдтэхнікуме, толькі што прыбегла ў Балочу да маці, пераадолеўшы басанож за паўсутак 60 кілямэтраў шляху.

Увечары я нечакана ўбачыў яе ў натоўпе такіх жа маладзенькіх сяброўак. Убачыў перш за ўсё вочы. Вялікія, сьветла-карыя. Бяздонныя. Зь лёгкім смуткам. З заваражальнай пяшчотай. Зь цікаўнасьцю, дапытлівасьцю, даверлівасьцю.

Некалькі хвілін яна неадрыўна глядзела на мяне, і, толькі калі сяброўка са сьмехам: «Ты што застыла?» — штурхнула яе пад локаць, яна адвяла вочы і ўсьміхнулася.

Якая гэта была ўсьмешка! Уся літаратура ня мае слоў, якімі можна было б апісаць тую ўсьмешку…

Мы не сказалі тады адно аднаму ніводнага слова, але зразумелі, адчулі сэрцам, што нашы шляхі сышліся, што мы належам адно аднаму і што пражыць паасобку ўжо ня зможам ні аднаго дня.

## Прыезд Соні

Нябесным громам прагучала ў лягеры паведамленьне аб сьмерці «самага вялікага і мудрага». Людзі не маглі схаваць сваёй радасьці, яны кідалі работу, зьбіраліся ў натоўпы, маліліся Богу за збаўленьне ад крывавага цмока. Мастак Андропаў, імпульсіўны ад прыроды, які меў 25 за тое, што намаляваў Сталіна з рагамі і хвастом, нібы зусім зьдзяцінеў: ён бегаў на вуліцы, скакаў, крычаў ва ўсё горла: «Кат памёр! Жыве свабода!» Ні наглядчыкаў, ні іншага начальства доўга не было відаць; калі ж яны зьявіліся да вячэрняй праверкі, дык былі вельмі прыціхлыя, прышыбленыя, разгубленыя.

Гэта падалося нам некім знакам добрых зьмен. І яны не змарудзілі пачацца. Ужо к канцу месяца з вокнаў зьнялі краты, зь дзьвярэй замкі. З бушлатаў зрэзалі паганскія нумары, дазволілі перапіску і атрыманьне перадач і пасылак, а неўзабаве і сустрэчы з роднымі і блізкімі.

Пра гэтыя навіны я неадкладна напісаў бацькам і сястры, а яны маланкава паведамілі Соні.

Якія ж былі мае зьдзіўленьне і радасьць, калі праз месяц мне паведамілі, што прыехала жонка і нам дазволена трохдзённая сустрэча. Расказваць пра тыя тры дні няма патрэбы. Сапраўднае шчасьце, найвышэйшая асалода, райскае забыцьцё — вось найлепшыя эпітэты для тых дзён. Да нас заходзілі сябры, знаёміліся з жонкай, дарылі ёй свае лягерныя «прэзэнты», захапляліся яе шчырасьцю і адважнасьцю. Тут былі вядомы беларускі кампазытар і дырыжор Клаўс, выдатны ўкраінскі паэт Іван Савіч, маскоўскі прафэсар мастацтвазнаўства Васіленка, таленавіты мастак з Ерэвану Грант і шмат хто іншы. Усе яны глядзелі на Соню як на раптоўную пасьлядоўніцу вялікай Валконскай.

Жонка расказала мне пра свой першы драматычны прыезд у Інту. Гэта было пасьля таго, як у 1951 г. яна выпадкова сустрэлася ў Менску з маёй сястрой Воляй. Апошняя паведаміла ёй маё становішча: 25 гадоў зьняволеньня, Крайняя Поўнач, Інта, 6-ты лягпункт.

## Сёньня трэба кіравацца розумам

Раздумваць жонка ня стала ніводнага дня. Завёзшы сына да бацькоў у Лапічы, яна на злом галавы памчала ў Інту. На вакзале пачала распытваць, дзе знаходзіцца шосты лягпункт.

— Хадземце са мной. Я пакажу дарогу, — прапанаваў ёй міліцыянэр, пачуўшы яе запытаньне.

Дарога, вядома, вяла не ў лягпункт, а ў КГБ. «Таварыш капітан! Затрымаў на вакзале, — паведаміў міліцыянэр дзяжурнаму,

**УЛАДЗІМЕР ЛЯЛЬКОЎ** — у 1940—1941 дырэктар Балоцкай няпоўняй сярэдняй школы Пухавіцкага раёну. У 1942—1944 дырэктар Мар’інагорскай народнай гімназіі. У 1947—1956 вязень Інцінскага лягеру. З 1956-га пэнсіянэр. Інвалід 1-й групы.



АРЦЕМ ЛЯВА

што сядзеў за сталом. Пытаецца пра лягпункт ЖЧ-6».

Соня расказала, што прыехала зь Менску да зьняволенага мужа. Хоча зь ім сустрэцца.

— Якое вы мелі права сюды ехаць?! — закрычаў капітан. — Тут асобая зона! Дзе ваш пропуск, дазвол? Няма?! Я вас арыштую.

На лаянку капітана расчыніліся дзьверы суседняга пакою. Увайшоў пажылы, крыху паўнаваты вайсковец. «Што тут за крык, Мясьнікоў?» — ціха спытаў ён, аглядаючы Соню.

— Ды вось, таварыш палкоўнік, самавольна прыехала ў Інту, шукае лягпункт ЖЧ-6, каб сустрэцца з асуджаным.

— Вось як, — неяк неакрэсьлена, зь цікаўнасьцю зазначыў палкоўнік. — Зайдзіце, калі ласка, да мяне, — шырэй адчыніў ён дзьверы перад Соняй. — Сядайце і расказвайце, хоць бы коратка, пра сябе, пра мужа, прыезд… Ён паказаў на крэсла, што стаяла каля стала.

Слухаў ён Соню ўважліва, не перапыняючы яе, і, калі яна спынілася, яшчэ колькі хвілін задуменна маўчаў.

— Вы малайчына, — нарэшце прамовіў ён. — Ваш муж павінен ганарыцца вамі, але цяпер ня час Валконскіх. Дарэчы, вы чыталі пра яе?

— Не, ня ведаю, — прызналася Соня. — А хто яна такая?

— Графіня. Жонка князя Валконскага, паўстанца супраць Мікалая I. Кінула ўсё сваё багацьце і паехала ў Сібір да мужа-катаржаніна.

— Значыць, моцна любіла, — не ўтрымалася заўважыць Соня.

— Як і вы, — усьміхнуўся палкоўнік. — Але ж тое было даўно, быў іншы час, іншыя людзі. Цяпер, Сафія Мікалаеўна, акрамя любві трэба кіравацца яшчэ і розумам.

— Дзе ёсьць сапраўдная любоў, розум ужо бясьсільны! — горача заўважыла Соня.

— Гэта дрэнна, — пасур'ёзьнеў палкоўнік. — Вы вось паехалі, кінулі ўсё і не падумалі, што спатканьня вам не дадуць. Ня могуць даць. Забаронена. Паслухайцеся маёй парады. Я мо ў тры разы старэйшы ад вас і шчыра жадаю вам дабра. Вяртайцеся дамоў.

— Не пабачыўшы Валодзечкі, не магу, — залілася сьлязьмі Соня. — Хоць бы пабачыць здалёк, праз агароджу, праз калючкі…

Палкоўнік мо з хвіліну з сумам глядзеў на Соню.

— Пасядзіце тут адна. Я хутка прыйду, — падняўся ён з-за стала. — Ды вось вам, прабачце, цукеркі, — дастаў ён з шуфляды дзьве жмені шакаладных «Мішак». — Калі ласка, ешце, не саромцеся…

Вярнуўся ён хвілін праз дзесяць—дванаццаць.

— Я гутарыў з начальнікам КВЧ, дзе ваш муж. Яго вельмі хваляць. Працуе культоргам. Вясёлы. Здаровы. Мо хутка і будзе дазвол на сустрэчу з роднымі. Цяпер жа гэта немагчыма. Паверце, нават я — даволі вялікі тут начальнік — ня маю права гэта дазволіць. Дарэчы, у вас ёсьць грошы на зваротны білет? — спытаў ён у Соні і, яшчэ не пачуўшы адказу, зьняў тэлефонную трубку:

— Веракса? Зайдзіце да мяне.

Праз хвіліну ў пакой увайшла маладая жанчына ў вайсковым убраньні.

— Маргарыта Пятроўна! — кіўнуў ён на Соню. — Даручаю вам вось гэтую прыгажуню. Едзьце з ёй на вакзал, вазьміце ёй білет і пасадзіце на маскоўскі цягнік… Вам жа, — ледзь чутна дакрануўся ён пальцамі да Сонінай рукі, — жадаю быць шчасьлівай і разумнай. У вас маленькі сын. Яму трэба маці. Усяго вам найлепшага.

### Побач у лягеры

Тры дні, што мы былі разам з Соняй у Мінлагу, я не задумваючыся памяняў бы на тры гады нашага разьяднальнага жыцьця на волі.

Дарэчы, поўнай волі не было нідзе. Быў амаль той жа лягер зь вялізнай тэрыторыяй, ад Берасьця да Камсамольску, ад Касьпійску да Мурманску.

— Не сумуй, я хутка сюды вярнуся. — сказала мне Соня на разьвітаньне. — Уладкуюся тут на працу, хоць бы прыбіральшчыцай, абы быць разам.

— Якое разам, любая, — пярэчыў я, — бачыш, якая калючая сьцяна пралегла паміж намі. Дый сустрэчу могуць не дазволіць.

— Дазволяць! Я сёньня бачыла сон, — абняла яна мяне, — што мы будзем разам. І не за дротам. На волі. Вось убачыш…

Які той быў сон, Соня мне не расказала, але, на шчасьце, зьдзейсьніўся ён вельмі хутка. Нам паведамілі, што тым, да каго прыедуць жонкі, будзе дазволена пражываньне за зонай.

Тут ужо спрыт праявіў я. Не чакаючы ніводнага дня, напісаў жонцы пісьмо з гэтай ашаламляльнай навіной. Прыедзе ці не — ня думаў, не гадаў. Знаў, што прыедзе, бо вельмі ўжо моцнымі былі абдымкі, вельмі гарачымі пацалункі пры нядаўнім спатканьні.

Соня, атрымаўшы пісьмо, відаць, ня ехала, а ляцела да мяне на нябачных крылах, бо ўжо ў тым жа сьнежні яна была ў Інце.

Тут трэба сказаць, што лягернае начальства ў гэты час ужо было іншым, чым да 5 сакавіка. Многія з былых начальнікаў звольніліся, пераехалі туды, дзе іх ня ведалі, тыя ж, што засталіся, сталі больш чалавечнымі, лагоднымі, нават ветлівымі і прыхільнымі да «ворагаў народу». Гэта асабліва кідалася ў вочы пасьля расстрэлу галоўнага «апекуна» ГУЛАГу Лаўрэнція Берыі.

Нам з Соняй адразу ж прапанавалі невялічкі пакойчык у былым складзе за зонай лягеру. Зь цяжкасьцю ўціснулі мы туды жалезны аднаспальны ложак, пакалечаны, на трох нагах стол, нешта падобнае на шафку ды пару зэдлікаў.

Але ўжо гэта была раскоша, шчасьце, калі пра лепшае не хацелася нават думаць. Яшчэ лепш стала тады, калі мяне прызначылі загадчыкам вячэрняй школы, далі добрую зарплату, а Соня пачала працаваць бухгальтаркай аддзелу культуры Інцінскага райвыканкаму.

### На Поўначы слова «вораг народу» не было

Ні вялізныя анкеты, ні падрабязныя аўтабіяграфіі, ні прадбачлівыя характарыстыкі не патрабаваліся тады на Поўначы ад тых, хто паступаў на працу. На іх не глядзелі з падазрэньнем і недаверам пільныя саўковыя кадравікі. Словы «нацыяналізм», «контрарэвалюцыя», «антысавеччына», «вораг народу» ці «здраднік радзімы» на Поўначы наагул выйшлі з ужытку. Лепшым, чым дзе-небудзь у іншым месцы Саюзу, было і сацыяльнае становішча, і грамадзкі парадак, і нават крымінагенная абстаноўка. Уся бандыцкая ды зладзейская брыдота, як і прафэсійныя стукачы і даносчыкі, хабарнікі і кар'ерысты, сюды ехаць баяліся, бо чулі нюхам, што гэтыя «клімат» не для іх. Тут быў яшчэ давер чалавека чалавеку, было модным сяброўскае слова, былі ў пашане праўда і шчырасьць. Тут умелі піць неразбаўлены сьпірт (ён прадаваўся ва ўсіх крамах) і гуляць так, што «трэслася неба і зямля»…

Памятаю, як мы сустракалі новы 1956 год. Соня нафаршыравала вялізную воблу, напякла капусных і (нават!) бульбяных пірагоў. Госьці, якіх было спачатку толькі пяць, а к 12-ці гадзінам стала восем, нанесьлі розных падарункаў, сьпірту і цэлы сьцягняк засмажанага аленя. Пілі, гулялі, пелі — пелі ня толькі «Шумеў чарот», а і беларускую «Лявоніху», украінскую «Бандуру», нават нешта габрэйскае, бо прысутнічаў вельмі добры і здольны габрэй — паэт Варзін. Жанчын, праўда, было толькі чатыры — мая Соня, яе дзьве новыя сяброўкі з бухгалтэрыі ды жонка мастака Пачыталіна Марыя. Дарэчы, ён ажаніўся зь ёй ужо ў Інце, калі рашэньнем генпракуратуры яна была вызвалена з-пад варты.

Гулялі амаль да раньня, бегалі па вуліцы, скакалі, качаліся ў сьнезе, бо мароз, на дзіва, зьмякчыўся да 20 градусаў.

Ніколі да гэтага, ды ўжо ніколі і пазьней, я не сьвяткаваў так радасна, так па-юначы шчыра і непасрэдна Новы год.

### Дахаты

Каб прывабіць на Поўнач рабочую сілу, тут пачалі пасьпешліва будаваць жыльлё, адчыняць крамы, наладжваць бытавое абслугоўваньне. Нам з Соняй таксама выдзелілі асобную кватэру — вялікі пакой зь печчу нейкай камяцкай канструкцыі пасярэдзіне — з плітой, духоўкай, пячуркай. Паліва не было, і я за кожным наведаньнем зоны прыносіў адтуль поўны партфэль вугалю. Гарэў ён палымяна і горача, так што асабліва холаду ў сваёй хібары мы не адчувалі. Паступова пачалі абжывацца, набылі нейкую мэблю, кухонныя рэчы. Я, апрач школы, пачаў супрацоўнічаць у газэце «Інта-вугаль». Прыбавілася грошай, і мы ўжо змаглі купіць крыху больш прыстойнае адзеньне і абутак.

Дзіва, але і Соня, ужо такая, здаецца, сьпешчаная ад роду, пачала прывыкаць да суровых умоў жыцьця, вучылася весьці гаспадарку, эканомна расходавала вялікія для нас, ізгояў, паўночныя грошы.

Жыцьцё ішло, але чым далей, тым больш смутак заўважаў я ў ейных вачах, а калі-нікалі бачыў нават старанна хаваныя сьлёзы. Прычыну адгадаць было няцяжка.

— Добра, — сказаў я Соні, — возьмем сынка сюды. Цяжка яму будзе спачатку. Холадна, няўтульна. Але прывыкне. Затое будзеш спакойная.

Напісалі пісьмо ў Лапічы. Соніны бацькі — маці Варвара Васілеўна, бацька Мікалай Фёдаравіч — катэгарычна паўсталі супраць. «Ці не адурэлі вы там, — пісалі яны. — Ён тут дома, выдатна вучыцца, гуляе ў шахматы, ходзіць у гурток сьпеваў, а там змарнее ад холаду і галечы. Ды і мы ўжо ня зможам безь яго».

Што было рабіць?

Выйсьце знайшлося само па сабе. 26 траўня 1956 г. зьявілася пастанова Камісіі Вярхоўнага Савету СССР: Лялькова Ўладзімера Кандратавіча датэрмінова вызваліць з-пад варты са зьняцьцем судзімасьці і пазбаўленьня праву».

Шлях на Радзіму быў адкрыты. Права на чалавечае жыцьцё дазволена.

Чым гэта абярнулася, якім чынам праходзіла — гэта ўжо другое апавяданьне.

# Зброя Амэрыкі

Лёс **Кастуся Вайцяхоўскага** нетыповы для паваеннай хвалі беларускай эміграцыі. Тысячы адукаваных і таленавітых суайчыньнікаў, сутыкнуўшыся ў чужых краінах з новымі ўмовамі жыцьця, не змаглі рэалізаваць сваіх здольнасьцяў. Нярэдка інтэлігенцыя, навукоўцы займаліся фізычнай працай... Адзінкі, якім пашанцавала самарэалізавацца, прынесьлі нямала карысьці новай радзіме. Герой гэтага інтэрвію дабіўся выдатных посьпехаў ня толькі ў навуцы, але і ў бізнэсе. З Кастусём Вайцяхоўскім гутарыць Аляксандар Адзінец.



**КАСТУСЬ ВАЙЦЯХОЎСКІ** ў часе апошняга наведаньня роднай Стаўпеччыны ў 1994 годзе.

**— Сп.Кастусь, раскажыце, калі ласка, пра Ваша дзяцінства, дзе нарадзіліся, асяродзьдзе, у якім выхоўваліся.**

— Нарадзіўся 23 ліпеня 1926 году на Стаўпеччыне, у вёсцы Стары Сьвержань. Мой далёкі сваяк пераехаў у Беларусь з Заходняй Польшчы яшчэ падчас падзелаў Рэчы Паспалітай, ажаніўся зь мясцовай кабетай, прыняў праваслаўе — і даў пачатак беларускаму роду Вайцяхоўскіх. Род амаль ужо зьнік.

Бацька, Ксенафонт Вайцяхоўскі, быў шчыры беларускі патрыёт — арганізаваў хор, удзельнічаў у тэатральных пастаноўках, падтрымліваў землякоў. Падчас нямецкай акупацыі браў удзел у арганізацыі Беларускай самапомачы, быў дэлегатам II Усебеларускага кангрэсу. Вось толькі да царквы даверу ня меў, нечым яго сьвятар пакрыўдзіў. Я ж, наадварот, да царквы хіліўся змалку.

## «Прыехаў з Расеі неадукаваны хамут»

**— У Беларусі Вы перажылі тры рэжымы…**

— За палякамі нам добра жылося: мелі буйную гаспадарку, жывёлу, рабілі ўсё сваімі рукамі. Бацька арганізаваў малачарню, сялянскую каапэрацыю. А за Саветамі мы сталі «эксплюататарамі рабочай клясы», страцілі ўсю ўласнасьць. Прыехаў з Расеі нейкі неадукаваны хамут і пагнаў бацьку з пасады.

Потым пачалося жыцьцё пад страхам: баяліся дэпартацыі ў Сібір. Перад прыходам немцаў у сьпісе на вываз апынуліся амаль усе нашы сваякі.

У 1941-м немцы распусьцілі калгасы і вярнулі людзям маёмасьць. І тут жа ні за што расстралялі майго калегу…

А потым распачалася партызанка. На вёску набегаў партызаны не рабілі, забіралі толькі харчы.

У 1942-м я паступіў у Баранавіцкі дарожна-будаўнічы тэхнікум. Немцы праз нейкі час захацелі ліквідаваць тэхнікум, але наша адміністрацыя дамагалася, каб вучоба працягвалася з умовай, што вучні будуць працаваць на нямецкім лётнішчы. Два тыдні — на лётнішчы, два тыдні — у школе. Цяжка прыходзілася, але што зробіш.

Потым я навучаўся ў настаўніцкай сэмінарыі ў Нясьвіжы, быў сябрам Саюзу беларускай моладзі. У Баранавічах і Нясьвіжы я ажыў душою. Калі глядзеў на калёны беларусаў пад бел-чырвона-белымі сьцягамі, якія сьпявалі «Мы бойкая моладзь, арлы маладыя!», сэрца білася куды хутчэй.

## «Зьбірайцеся на Радзіму»

**— Як Ваша сям'я апынулася на Захадзе?**

— Каб наша сям'я засталася ў Беларусі — няма сумневу, загінула б у савецкіх лягерах. Таму вырашылі ўцякаць. Бацька з калегамі арганізаваў калёну з вазамі. Забіралі ўсё, нават кароў да вазоў папрычаплялі. Паехалі ўпяцёх — я, бацька, мачыха (мама Надзя, калі мне было восем гадоў, памерла) ды сёстры Валя й Галя. Шмат нагледзеліся. Бачылі, як гарэў Мірскі замак. Урэшце прыехалі пад Беласток. Там браты Аўдзеі далі немцам сала — тыя дазволілі ехаць далей цягніком.

У Лодзі два тыдні прабылі ў Беларускім камітэце. Раптам вестка, што гестапаўцы расшукваюць уцекачоў дзеля прымусовай працы ў лягерах. Хуценька сабралі рэчы й уцяклі ў гараж, хавацца. Потым Аўдзеі дзесьці здабылі машыны, на якіх мы паехалі ў Судэты. Паколькі не было іншага выйсьця, уладкаваліся ў працоўны лягер, рабілі на фабрыцы.

Перад наступам савецкіх войскаў бацька здабыў фальшывыя паперы, што мы накіроўваемся добраахвотнікамі ў нямецкае войска. Так і ўцяклі ў Заходнюю Нямеччыну. На станцыі ў баварскім Рэгенсбургу спаткаліся зь Міхасём Міцкевічам, братам Якуба Коласа. Потым пераехалі ў мястэчка Ворт, дзе я працаваў на фэрме і дачакаўся прыходу амэрыканцаў і капітуляцыі Нямеччыны.

Аднойчы вяртаюся з працы, а рабіў я на кухні, і бачу перад хатай амэрыканскі аўтамабіль. Салдаты нам кажуць: «Зьбірайцеся, паедзеце дадому, на радзіму». Бацька і адказвае: «Прабачце, мы — былыя грамадзяне Польшчы, і рэпатрыяцыйныя дамовы нас не чапляюць». Дарэчы, тата перад уцёкамі на Захад набраў на працы стос афіцыйных блянкаў зь пячаткамі. І потым, запоўніўшы, раздаваў іх усходнім беларусам, каб тыя маглі пазьбегнуць прымусовага вяртаньня ў СССР. Пазначаў, што ўраджэнцы Заходняй Беларусі. Шмат каго ад сьмерці выратаваў.

## Супраць Кіма і Мао

***— Якія самыя галоўныя цяжкасьці напаткалі Вашу сям'ю ў Амэрыцы?***

— У ЗША мы адразу трапілі на плянтацыю бавоўны ў Арканзасе. Беларусаў сабралася каля 70 чалавек. Цяжэйшай працы цяжка прыдумаць: з шасьці раніцы да шасьці вечара поўзаеш на каленях і зьбіраеш вату. Жылі ў драўляных халупах, якія час ад часу затапляла Місысыпі. Сьпякота, машкара ў хату прэцца — расчараваньне страшэннае. Зараблялі каля даляра ў дзень. Сабраныя 100 фунтаў ваты каштавалі 2,5 даляра.

Прыехалі мы туды ў верасьні, а ў лістападзе я ўжо паехаў шукаць шчасьця ў Нью-Ёрк.

Уладкаваўся я на працу токарам, зарабіў няблага грошай ды адправіў частку бацькам. Гэта дазволіла ім у сьнежні 1949-га пакінуць цяжкую працу і пераехаць у Нью-Джэрзі.

**— Я ведаю, што Вы служылі ў Карэі.**

— У сьнежні 1949 г. атрымаў паперу з патрабаваньнем зьявіцца на прызыўную камісію. Там мне сказалі, што недзе праз год я буду мабілізаваны ў войска. Але падумаў: «Чаго чакаць?» — і згадзіўся служыць адразу. Накіравалі ў Каліфорнію танкістам.

Потым, калі войску спатрэбіліся дадатковыя танкавыя сілы, апынуўся ў Карэі. Дакумэнты мае разглядаліся ў Токіё.

Даведаўшыся, што я валодаю расейскай, польскай і нямецкай мовамі, прапанавалі службу ў вайсковай разьведцы. Зрабілі іспыт. Адным зь яго пунктаў была праца з захопленай савецкай тэхнікай. Падвялі да шыны і кажуць, каб прачытаў, што на ёй напісана. Чытаю: ЧТЗ. Пытаюць, што гэта значыць? Адказваю: Чэлябінскі трактарны завод. А дзе гэта? На Ўрале. Пераклаў зводку з Уладзівастоку на ангельскую мову і быў залічаны ў разьведвальны батальён. Але ж калі вайскоўцы даведаліся, што праз шэсьць месяцаў я звальняюся, накіравалі ў прыфрантавую паласу, у танкавы батальён.

Наша задача заключалася ў тым, каб раніцай выяжджаць у франтавую зону і зьнішчаць кітайскія бункеры, пабудаваныя ноччу. Ахвяр, на шчасьце, у нашым батальёне не было.

## У стратэгічнай галіне

**— У далейшым, пасьля звальненьня з войска й набыцьця рангу капрала, Вы дабіліся значных посьпехаў у галіне навуковых праектаў…**

— Пасьля заканчэньня ўнівэрсытэту я паступіў на працу ў буйную фірму, займаўся пытаньнем сыстэмы ахаладжэньня ракетных прылад. Працаваў у філіяле фірмы на экспэрымэнтальным атамным рэактары, вывучаў рэакцыю матэрыялаў, якія ўжываліся ў яго канструкцыі. Потым займаўся якасьцямі неметалічных матэрыялаў пры высокіх тэмпэратурах, затым працягваў гэтую ж працу, але перакваліфікаваўся на ракеты, што ўжываліся на падводных лодках. Усе гэтыя праекты былі сакрэтнымі — мяне, сваякоў і знаемых рэгулярна правяралі. Пасьля запуску савецкага спадарожніка ў 1957 г. амэрыканцы спужаліся, што Саветы валодаюць лепшымі тэхналёгіямі. Мне часта даручалі перакладаць выкрадзеныя савецкія дакумэнты. Але ў хуткім часе амэрыканцы зразумелі, што Саветы пераацэньваюць свае магчымасьці…

**— Вы наведвалі Савецкі Саюз?**

— Яшчэ задоўга да распаду я наведаў СССР як турыст. Перад выездам мяне, сакрэтнага работніка, выклікалі на інтэрвію і сказалі, што я магу гаварыць там усё, што лічу магчымым.

У Саюзе (а ўбачыў я і Расею, і Ўкраіну, і Беларусь) мы сутыкнуліся са страшэннай прапагандай, прамыўкай мазгоў. Нас агітавалі, каб мы дамагаліся ад Кангрэсу ЗША спыніць гонку ўзбраеньняў. Але больш за ўсё мяне зьдзівіла тое, што савецкія людзі цураліся нас, як заразнай хваробы…

Бываў я і ў незалежнай Беларусі, у 1994-м, якраз падчас прэзыдэнцкіх выбараў. Запісваў на дыктафон, фатаграфаваў і ўсюды чуў: «Нельга! Забаронена!»

## У далечыні ад беларускіх асяродкаў

**— Раскажыце, калі ласка, пра Вашу амэрыканскую сям'ю.**

— У 1961-м узяў шлюб з амэрыканкай настаўніцай Бэрдзі. Жывём у Сан-Дыега (Каліфорнія). Маем трох сыноў, дачку і дзевяць унукаў. Андрэй, Мікалай і Эрас — кампутарныя інжынэры. А дачка Каця — хатняя гаспадыня.

Пасьля працы ў дзяржустановах я займеў прыватны бізнэс, займаўся нерухомасьцю. Зарабіў грошай, але на пэнсію пайшоў дачасна, у 58 год — захварэў на рак гляндаў.

**— І як цяпер бавіце час?**

— Сан-Дыега, на жаль, знаходзіцца далёка ад беларускіх цэнтраў. Таму мой сёньняшні ўдзел у грамадзка-культурным жыцьці беларусаў ЗША не выходзіць за рамкі фінансавай дапамогі. Але ўжо калі выпадае магчымасьць, з асалодай бяру ўдзел у любым мерапрыемстве. Займацца беларушчынай перашкаджае і ўзрост — 78 гадоў, хоць навінамі з Бацькаўшчыны цікаўлюся.

Пік маёй амэрыканскай актыўнасьці прыпаў на паваенныя гады, калі мы аддана змагаліся за беларускую вольнасьць. Я быў адным зь лідэраў студэнцкага руху. А ў Сан-Дыега цяпер асноўную энэргію накіроўваю на царкоўнае жыцьцё, маю ў гэтым асяродку, тут дзейнічае амэрыканская праваслаўная царква, шмат сяброў.

# Праўда пра нацкамаў

Мой артыкул «Рызыкоўная барацьба намэнклятуры», як тое і чакалася, выклікаў бурную рэакцыю. Тэкст фактычна заклікаў да перагляду ацэнак развою беларушчыны ў 1920–х гадах, калі ішла кіраваная барацьба за беларускую Беларусь. За будаўніцтва сваёй краіны. З такога пункту гледжаньня абсалютна відавочна, што «СВБ» існаваў. Піша **Алесь Аркуш**.



ГЕНІК ЛОЙКА

Працуючы над артыкулам, я карыстаўся выключна агульнадаступнымі крыніцамі — кнігамі і публікацыямі ў пэрыёдыках. Мушу прызнаць, што пры канцы 1980-х — на пачатку 1990-х на гэтую тэму ў беларускім друку зьявілася шмат публікацый, якія да сёньня належным чынам не асэнсаваныя.

Чаму я зацікавіўся гэтай тэмай? Вывучаючы дзейнасьць суполкі полацкіх маладнякоўцаў, я зьвярнуў увагу на тое, што скрозьназіраўся досыць істотны супраціў беларусізацыі. Тая пострасейска-імпэрская інтэлігенцыя, якая засела ў большасьці дзяржаўных ўстаноў рэспублікі, і слухаць не хацела пра нейкую беларускую мову. Супраціў быў і ў самім апараце кіраўніцтва рэспублікі. Сяляне ж не маглі быць дзейнымі суб'ектамі гэтага дзяржаватворнага працэсу.

Ня цяжка заўважыць прыклады таемнай мэтанакіраванай дзейнасьці па каардынацыі працэсу беларусізацыі ў 1920-я гады. Ну, напрыклад, маладых выпускнікоў Белпэдтэхнікуму і чальцоў «Маладняку», згодна з паказаньнямі Алеся Дудара, якія ён даў ГПУ, адбіраў для камандзіраваньня ў рэгіёны партыйны дзеяч «сярэдняй рукі» Алесь Адамовіч. Прычым Адамовіч ніколі не працаваў у наркамасьветы, каб выконваць падобныя даручэньні ад кіраўніцтва рэспублікі. Значыць, нехта яму даручаў гэта рабіць па-за афіцыйнымі партыйнымі сувязямі. Хто даручаў? Ясна, што не Ластоўскі, Цьвікевіч, Смоліч. Нехта з партыйнага краўніцтва, хто мог надалей зацьвердзіць выбраныя надзейныя (у сэнсе нацпітаньня) кандыдатуры і накіраваць іх на «фронт» беларусізацыі. Ці ня сьведчаньне гэта арганізаванай дзейнасьці?

Дый самога Адамовіча накіроўвалі менавіта туды, дзе была патрэба ў «крутым» нацыянальным дзеячу, — на Калінішчыну, Полаччыну (памежныя тэрыторыі, нядаўна далучаныя да рэспублікі).

Ня варта разглядаць асноўную масу белнацкамаў як зацятых прыхільнікаў бальшавіцкай ідэалёгіі. Трэба меркаваць, большасьць зь іх мела цьмянае ўяўленьне пра дагматыку марксізму—ленінізму. Прычым ніхто асабліва і не імкнуўся навучаць камунізму моладзь (асабліва сваю, беларускай «гадоўлі»). Алесь Дудар згадвае: «За ўвесь час існаваньня «Маладняку» яго сябры толькі адзін раз пачулі даклад на палітычную тэму — гэта быў даклад Крыніцкага на 1-м зьезьдзе «Маладняку» ў лістападзе 1925 году».

Ня цяжка растлумачыць і тое, чаму ГПУ на чале «СВБ» ставіла менавіта дзеячаў БНР. Зь іх боку засьведчыць, што «СВБ» кіравалася людзьмі з партыйных кабінэтаў, — гэта фактычна прызнаць, што ўсе беларускія партыйныя вярхі — «ворагі народу». Маўляў, куды глядзелі? Гэта тое самае, што сказаць праўду пра сьмерць Кірава. Вораг павінен быць знадворны, зразумелы, выразна акрэсьлены.

Мае рацыю Анатоль Сідарэвіч, калі піша, што многія старэйшыя белнацкамы — Чарвякоў, Ігнатоўскі, Жылуновіч — былі абуджаныя да беларускай працы газэтай «Наша Ніва» і дзейнасьцю такіх адраджэнцаў ды палітыкаў, як Антон Луцкевіч. Яны практычна рабілі тое самае — стваралі нацыянальную краіну, але спрабавалі рушыць іншым, на іх думку, больш прагматычным і эфэктыўным шляхам.

У артыкуле «Трыюмвіры, або Помнік камісарам» сп.Сідарэвіч слушна згадвае, што Антон Луцкевіч называў Чарвякова і Жылуновіча «праўдзівымі беларусамі». Сам Чарвякоў на старонках часопісу «Полымя» (1928. №10.) залучае Цішку Гартнага (літаратурны псэўданім Жылуновіча. **— А.А.**) «да плеяды «нашаніўскіх адраджэнцаў» або тых удзельнікаў ды кіраўнікоў нацыянальна-рэвалюцыйнага беларускага руху, што ідэалам сваёй рэвалюцыйнай працы і змаганьня лічылі **дзяржаўнае адраджэньне Беларусі** (вылучана мной. **— А.А.**)». Менавіта так сам Чарвякоў фармулюе галоўную, першасную задачу, якая стаіць перад маладой рэспублікай.

Што тычыцца Антона Баліцкага. Пасьля ягонага зьняцьця з пасады наркама асьветы і азьвярэлага шальмаваньня ў друку Баліцкі зьяжджае зь Менску. Спачатку «ўладкаваўся на завод імя С.Ланцуцкага, потым настаўнічаў недалёка ад Гомелю (Н.Васіліўская. Абвінавачваецца ў нацыянал-дэмакратызьме. Менск: Навука і тэхніка, 1995). Таму, калі пачаліся арышты, Баліцкі аніяк ня мог быць сярод першых ахвяраў. Вядома, гэпэушнікам яго трэба было пашукаць. Ведаю прыклады, калі асобным «нацдэмам» удавалася ўцячы ў правінцыю і схавацца-выжыць. Так здарылася, напрыклад, з выкладчыкам Полацкага пэдтэхнікуму Іванам Шчасным, бацькам мастачкі Нінэль Шчаснай. Яго папярэдзілі добрыя людзі, і сям'я Шчасных адразу ўвечары, як толькі гаспадар пачуў перасьцярогу, села на цягнік і зьехала на Смаленшчыну, схавалася ў глухім мястэчку. Абышлося. Вядома, Шчасны не Баліцкі, і наўрад ці яго старанна шукалі.

Калі нават дапусьціць, што адбывалася звычайная барацьба ўнутры кіраўніцтва рэспублікі — «фракцыя беларусаў» (трэба прызнаць, досыць невялікая) змагалася за ўладу з прыхаднямі і паслугачамі-кар'ерыстамі, дык усё адно маем барацьбу за беларускую Беларусь. Толькі паўстаньне беларускай Беларусі гарантавала нацкамам устойлівую ўладу і дзяржаўнае адраджэньне Бацькаўшчыны. Гарантавала самую моцную зброю — удзел народу ў будаўніцтве сваёй краіны.

З такога пункту гледжаньня абсалютна відавочна, што «СВБ» існавала. Што мела свае пляны і задачы. Сваіх кіраўнікоў і шараговых чальцоў.

Справа цяпер за гісторыкамі — сказаць праўду пра нацкамаў.

# Ліст наўздагон

Я быў бы некарэктны перад чытачамі і гісторыкамі, калі б, пішучы пра «Саюз вызваленьня Беларусі», затаіў які-небудзь вядомы мне дакумэнт, датычны гэтай справы. Калі я пісаў нарыс «Трыюмвіры, або Помнік камісарам», увесь час меў на ўвеце ліст Антона Луцкевіча да Людмілы Краскоўскай — дачкі Івана Краскоўскага, які таксама праходзіў па «справе» «СВБ». Але так здарылася, што ліст, копію якога мне даў сп.Мікола Трус, я доўга ня мог знайсьці сярод папер. Знайшоў толькі на Сьветлым Тыдні.

І.Краскоўскі быў адным зь першых эмігрантаў, якія выехалі ў БССР. Мала таго, як вынікае з аднаго ліста Ўладзімера Жылкі да Луцкевіча, Краскоўскі, разьвітваючыся ў Празе з прэм'ер-міністрам БНР Аляксандрам Цьвікевічам, ужо ведаў, што і той з часам перабярэцца ў Менск. Можна меркаваць, што Краскоўскі быў пасрэднікам паміж урадам БССР і «групаю Цьвікевіча». Як вядома, ягоная дачка засталася ў Чэхаславакіі.

Ліст паказвае, што матэрыяльныя варункі жыцьця Луцкевіча надта пагоршыліся, што надыходзіў той пэрыяд у яго жыцьці, калі ён «проста галадаў» (Ян Станкевіч). І пры гэтым ня траціў чалавечае прыстойнасьці (сюжэт з шасьцю далярамі красамоўны).

Што ж да вэрсіі «справы» «СВБ», выкладзенай Луцкевічам паводле інфармацыі з трэціх рук, дык яна надта сумнеўная. Пачаць хоць бы з таго, што паміж Луцкевічам і Ластоўскім прабег чорны кот. Набраўшы вастрыні ў 1917 г., канфлікт між імі не ачах да канца іх дзён. Луцкевіч не забываў, што Ластоўскі выступіў супроць рэзалюцыі Віленскае беларускае рады аб разрыве дзяржаўных адносінаў з Расеяй, што спрыяў засыльцы ў кола беларускіх незалежнікаў у Менску нямецкага шпіёна (1918), што ў канцы 1918 г. перабраўся ў Коўна і ня браў удзелу ў беларускім дзяржаўным будаўніцтве, што, рэзка павярнуўшы ад кансэрватызму да эсэраўшчыны, стаў на чале альтэрнатыўнага ўраду БНР (13 снежня 1919 г.), што прызнаў правы Літвы на Вільню (Генуя, 1922)… Ластоўскі не хаваў варожага стаўленьня да Луцкевіча (вось яшчэ адна прычына, чаму ён ня мог стаць на чале «нацдэмаў»). Луцкевіч мог чытаць той нумар «Зьвязды», у якім апавядалася пра сход у Акадэміі напярэдадні звальненьня Ластоўскага з пасады яе неадменнага сакратара. Калі Ластоўскаму закінулі, што ён знаходзіўся ў цеснай сувязі з Луцкевічамі, акадэмік на ўвесь голас заявіў, што адзін з Луцкевічаў зьяўляецца яго асабістым ворагам.

Давайце канстатуем: Луцкевіч таксама быў слабы чалавек. Думаючы, што ён «бліжэй знае Ластоўскага», Луцкевіч з агаворкамі «зусім магчыма» і «магчыма» быў схільны паверыць у легенду, распрацаваную ГПУ. Тым больш што ў ёй прагучала і прозьвішча Эдмунда Зуэзміля — да Першае сусьветнае вайны настаўніка Пінскае гімназіі і нямецкага шпіёна, які потым быў цэнзарам газэты «Гоман» і ўвайшоў у цесны кантакт зь яе рэдактарам Ластоўскім. Гэта Зуэзміля пад прозьвішчам Кузьміцкага і з рэкамэндацыйным лістом Ластоўскага заслалі зь Вільні ў менскае кола незалежнікаў…

У гэтым варыянце гэпэушнай легенды (мусіць, дзеля сьціпласьці аўтара ліста) апушчана, што ўсіх эмігрантаў у БССР заслаў кіраўнік штабу «нацфашыстаў» Луцкевіч. Апрача таго, у гэтым варыянце няма сьцверджаньня, што «таемная арганізацыя» існавала да прыезду Ластоўскага ў Менск і што яе «ўзначальваў» Луцкевічаў памочнік ва ўрадзе БНР Сьцяпан Некрашэвіч. Новае ў гэтым варыянце — пра «амбасадарства» Канстанціна Езавітава. Тое, што да «справы» далучылі і яго, кажа пра адно: у генрала скончыўся пэрыяд зачараванасьці бальшавізмам, «беларусізацыяй» і г.д.

Калі б Луцкевіч чытаў бээсэсэраўскія газэты і часопісы, ён зразумеў бы, хто аўтар «ведамасьцяў», перададзеных яму «пэўным чалавекам», але пэрыёдыкі зь Менску ў Беларускі музэй — і тут пастаралася польская ўлада — траплялі нерэгулярна. Варта, аднак, зацеміць і тое, што ні ў газэце «Наперад!» (1929—1930), ні ў «Беларускім звоне» (1931—1932) Луцкевіч ані разу, наколькі я ведаю, ня ўсклаў віны за расправу 1930—1931 г. на Ластоўскага. Адна справа — дапушчэньні ў прыватным лісьце, другая — публічнае абвінавачаньне. Для яго (і Луцкевіч гэта разумеў) ня мелася дастатковых падстаў.

**Анатоль Сідарэвіч**

## АНТОН ЛУЦКЕВІЧ

### Ліст да Людмілы Краскоўскай

Паненачка!

Толькі цяпер прачытаў я Вашую адкрытку, бо прыйшла яна якраз пасьля майго выезду на вёску і ляжала на маім пісьменным стале ў горадзе па сягоньняшні дзень. Даўно я дапытываўся Ваш адрас, бо хацеў пераслаць Вам $6 за трумо, якое прадаў пры ліквідаваньні сваей кватэры па Віленскай вул. Трумо гэтае пакінуў у мяне на перахоў Ваш бацька, але я ўжо ня меў дзе далей хаваць, бо займаю цяпер з маімі хлопцамі адзін пакой, дык свае мэблі мусіў распрадаць. Выбачайце, што ня шмат удалося выручыць, але аправу паеў шашаль, дык мела вартасьць толькі адно шкло. Думаю, што і гэтая дробязь прыдасца Вам ці Вашым.

Усё чакаю вестак аб лёсе Ів<ана> Ігн<атавіча> і іншых, ды іх няма. Буду вельмі Вас прасіць, калі даведаецеся што новага, чыркніце мне пару слоў.

У справе арышту Ів<ана> Ігн<атавіча> і др. маю я ведамасьці ад вельмі пэўнага чалавека. Іх усіх «пасадзіў» Ластоўскі, які, прыехаўшы ў Менск, заявіў — на падставе інсьпірацыі ведамага Зуэзміля, — што хутка мае быць ваенная інтэрвэнцыя ў СССР і дзеля гэтага нацыянальна сьведамыя беларусы мусяць стварыць свой тайны цэнтар, які будзе прызнаны «белымі» за ўладу «вызваленае» Беларусі. На гэту вудачку і пайшоў цэлы рад людзей. «Амбасадарам» групы быў Езавітаў, «камунізуючы» і жанаты з партыйнай камуністкай. Ну, і вынік акцыі быў ясны: усё сталася ведамым ГПУ, каторае ўчыніла разгром беларускіх культурных сіл, так ці інакш зьвязаных з Ластоўскім. Асоба майго інфарматара не выклікае сумліву ў праўдзівасьці яго апавяданьня. Усё гэта — зусім магчыма і не прадстаўляецца дзіўным для таго, хто бліжэй знае Ластоўскага. Бальшавікі вельмі хочуць зьвязаць гэту акцыю Ласт<оўскага> з польскім урадам, бо ведама, што перад «пакаяньнем» і выездам у Менск Л<астоўска>га прыяжджаў ад яго імя ў Варшаву да міністэрства ўнутраных спраў (да п.Сухэнка) той самы Зуэзміль. Аб чым там вяліся перагаворы, — няма ведама. Але магчыма, што з гэтага і завязалася ўся гісторыя.

Пішу Вам гэта, бо, можа, ведамасьць аб гэтым будзе Вам неяк патрэбна.

Шчыра Вас вітаю

Ант.

Вільня, 15.VII.<19>31

**Падрыхтаваў да друку А.Сідарэвіч**

# Быў Сыс



Працяг са старонкі 1.

Выступаючы ва Ўкраіне, Сыс у «Маналёгу «Тутэйшага» замяніў Купалу Шаўчэнкам:

ДЫ ПАКУЛЬ ТЫ ЯШЧЭ ЖЫВЕШ,
ЗАПАЛІ ПРАД ШАЎЧЭНКАМ СЬВЕЧКУ,
ПРАЧЫТАЙ І СПАЛІ МОЙ ВЕРШ,
А ВАНДАЛАМ СКАЖЫ:
Я ВЕЧНЫ!

І высек сьлёзы з вачэй сівавусых дзядзькоў-галічанаў. Ён мог з п'янымі ў зюзю сябрамі заваліцца да знаёмага паэты-пачаткоўца, зірнуць нечакана асэнсаваным позіркам і сказаць: «Я прыйшоў цьвярозы слухаць твае новыя вершы». Прычым маркетынгавы, так скажам, аспэкт творчасьці яго цікавіў мала. Сыс мог абклейваць сьцены бару Дома літаратара чырвонцамі — ганарарам за кніжку. Колькі тут бажавольля, колькі сьвядомага блазенства? Богу разьбірацца. Цяпер дзяржвыдавецтвы плацяць ганарары аўтарам асобнікамі іх жа ўласных кніжак. Скончыліся чырвонцы.

У паэзіі Сыса надзвычай багата агню — «ня попел і ня прысак», «на дне агню танцуюць саляманды», «гарадзь камяні ў маім вогнішчы» — агнём атрымаў ён паганскае хрышчэньне пры нараджэньні. Вершам пра тое, як цяжарная маці, апёкшыся на пажары, яго нарадзіла, пачынаецца тая самая, культавая кніжка Сыса «Пан Лес». Рэцэнзаваў яе славянафіл Іван Чарота.

Правесьці паэта на Гомельшчыну, у родны Гарошкаў, у менскім Доме літаратара сабраліся шэсьць дзясяткаў чалавек. Каля труны стаялі Віктар Івашкевіч, якому Сыс прысьвяціў некалі верш, Юры Хадыка. Быў паэтаў сябар, былы дыктар БТ Алесь Байкоў. А найбольш — таварышы паэта па згуртаваньні «Тутэйшыя». Ціхая і чынная цырымонія кантраставала з палкімі вершамі, якія гучалі ў галовах тых, хто яго ведаў і чуў.

Вёў паніхіду Алесь Пашкевіч. Прамоўцы складалі слова да слова, нібыта зьбіраючы паэту торбу ў далёкую дарогу. Мастак Аляксей Марачкін, які афармляў апошні зборнік паэта «Сыс», выдадзены коштам амэрыканкі Валі Якімовіч, пераказаў адзін з апошніх вершаў. Сыс чытаў яго Марачкіну па тэлефоне за дні да сьмерці: «Жыцьця ўсяго на тры сьняжынкі…»

Кіраўнік Беларускага ПЭНцэнтру Лявон Баршчэўскі ўспомніў першы мітынг на Дзяды, у Менску ў 1987 годзе. Як выступаў Сыс. «Ён думаў, што трох радкоў, трох строф геніяльных, якія мог ён напісаць, хопіць, каб абудзіць чэрствыя сэрцы ў многіх людзей».

Дырэктар Беларускага ліцэю Ўладзімер Колас згадаў шумныя баляваньні Сысовы ў кавярні Дому літаратара. «Я Сыс. Ты тут можаш нічога не баяцца», — з гэткімі словамі ён мог падсесьці за любы столік.

Пра такіх, як Сыс, не паведамляюць бравурныя дзяржаўныя СМІ, таму пра грамадзянскую паніхіду мала хто ведаў. Але, што сымбалічна, да труны прыйшлі пераможцы конкурсу маладых літаратараў імя Караткевіча, што якраз сабраліся ў Менску на выходныя.

У той жа дзень труну павезьлі ў Гарошкаў — родную вёску Сыса. Туды, дзе ён застаўся ў памяці добрым, але «шабутным хлопцам», які спаў да самай восені на сенавале ў хлеўчуку, любіў выпіць, езьдзіў у Сібір вывучаць жыцьцё. Згодна з звычаем, паэта ўсю ноч адпявалі бабкі. Пахаваньне прыпала акурат на Радаўніцу. Каб выкапаць магілу ў родавым куце, давялося сьпілаваць вялікую бярозу.

Разьвітацца з паэтам у Гарошкаве сабралося каля дзьвюх соцень чалавек. Зь Менску былі трое — пісьменьнікі Алесь Наварыч, Андрэй Федарэнка ды Эдуард Акулін. З Гомелю — выкладчыкі ўнівэрсытэту, дзе ён вучыўся. Магілу паэта пакрылі бел-чырвона-белым сьцягам. На труну сьцяг не паклалі — каб не закопваць.

**Андрэй Скурко, Аркадзь Шанскі**

## Макмілін пра Сыса

Брытанскі дасьледчык беларускай літаратуры Арнолд Макмілін назваў Анатоля Сыса «раздражняльным, дэпрэсіўным і надзвычай магутным паэтам», зазначыўшы: «У краіне, якая адпакутавала больш, чым спрычынілася да пакутаў, якая мае шмат прычынаў да стогну, усе, хто любяць беларускую паэзію, павінны пачуць іншага кшталту стогн — адроджанага натхненьня Анатоля Сыса».

## Народжаны ў пажар

АНАТОЛЬ СЫС нарадзіўся ўначы 26 кастрычніка 1959 году ў вёсцы Гарошкаў Рэчыцкага раёну Гомельскай вобласьці. Гэта на беразе Дняпра, адно з самых старажытных пасяленьняў чалавека ў Беларусі. Ён быў найменшы з чатырох дзяцей у сям'і Марыі і Ціхана Сысоў.

Калі маці, настаўніца пачатковых клясаў, была ім цяжарная, яна, дапамагаючы надвячоркам суседцы падліць газы ў запаленую лямпу, праз неасьцярожнасьць зрабіла пажар. Маці абгарэла. У тую самую ноч нарадзіўся Анатоль.

У школьныя гады захапляўся літаратураю, гісторыяй. Асабліва цікавілі яго раскопкі старажытнага гарадзішча ў Гарошкаве. У студэнцкія гады ён бараніў гэтае гарадзішча ад вынішчэньня — калі адтуль пачалі браць пясок на будоўлю, зьвярнуўся ў музэй, да ўладаў. Яго паслухалі: паставілі ахоўны знак. У 1977 паступіў на гісторыка-філялягічны факультэт Гомельскага ўнівэрсытэту імя Ф.Скарыны, які скончыў у 1982. Два гады адслужыў сувязістам у Польшчы. Затым працаваў у веткаўскай раённай газэце «За бальшавіцкія тэмпы». У 1985 пераехаў у Менск, рабіў старэйшым спэцыялістам на Беларускім тэлебачаньні.

Дэбютаваў у 1986, у 26 гадоў, падборкай вершаў у часопісе «Маладосць». У 1987 разам з Адамам Глёбусам заснаваў творчае аб'яднаньне «Тутэйшыя». Аўтар трох паэтычных зборнікаў: «Агмень» (1988), «Пан Лес» (1989), «Сыс» (2002).

Пасьля выхаду другой кнігі А. Сыс звольніўся з працы, жыў на пэнсію — ён быў хворы на страўнік.

**Зь нявыданай кніжкі «Пчаліная матка»**

***

Шрыфтам Брайля па калядным сьнезе
Птушкі вершы пішуць.
А чытаю — рукі зьмерзьлі.
Свае руны мне ня вышыць.

Я асьлепнуў.
Я аглухнуў.
Птушак не здагнаў — сьпяшаю,
А вясновы сьнег пажухнуў.
Часу — тры сьняжынкі маю.
А памру —
Паэт мо прыйдзе,
Разгадае сьляды птушак.

Ох, ты лёс мой!
Ох, ты злыдзень!
Дзе салома? Дзе падушка?
Падаў зь печы! Падаў зь неба!
Не падклаў мне Бог саломы,
Паддурыў скарынкай хлеба
Ды баршчом ад сьлёз салоным.

Падаў зь печы! Падаў зь неба!
Бог
Пусьціў мяне па сьвеце,
Торбу даў,
Бы горб, за плечы.
Так я кануў у сівай Леце,
А сканаю — паэт прыйдзе…

*8 сакавіка 2005 г., раніца, пахмельле. Першы верш за апошнія сто гадоў.*



**У ГАРОШКАЎ. Труну зь целам Анатоля Сыса выносяць з Дому літаратара.**

## Вінцук Вячорка: Яго рукою вадзіў гегелеўскі дух

Сваёй галавакружна таленавітай паэзіяй ён даў пакаленьню тых, хто ўваходзіў у беларушчыну на пераломе 1970-х — 1980-х, доказ і надзею: Беларусь жыве й жыцьме. Хлопец з Гомельшчыны, наіўны й таму ўпэўнены, ствараў такія тэксты, як быццам ягонаю рукою вадзіў гегелеўскі дух. Вершы «З чаго пачаць» і «Пацір», якія сам Анатоль тады любіў дэклямаваць і рабіў гэта па-майстэрску, сталі для нас паэтычнымі гімнамі, а першая кніга «Агмень» (ён пачуваўся сваім у паганскім пантэоне, пры гэтым глыбока прыватна ўмовячыся з хрысьціянскім Богам) — культавай.

Анатоль шчыра й даткліва шукаў праўды, а таму вельмі натуральна й рана знайшоў для сябе Беларусь. Увайшоў у гомельскае кола нацыянальна сьвядомае моладзі як адзін зь яго лідэраў. Быў актыўным удзельнікам стратэгічнае нарады прадстаўнікоў моладзевых беларускіх арганізацый узімку 1984 году ў Смольні ля Мікалаеўшчыны, якую ладзіла «Група «Незалежнасьць» і на якой было вырашана ствараць сетку арганізацый па ўсёй краіне. Так узьнікла Канфэдэрацыя беларускіх суполак, якая, у сваю чаргу, сталася галоўным арганізацыйным апірышчам Беларускага народнага фронту.

Анатоль Сыс перадусім быў выдатным паэтам ад Бога. Але доля не пашкадавала яму і якасьцяў трыбуна. Ён стаў адным з заснавальнікаў «Тутэйшых», першым прамовіў у адроджаны дзень Дзядоў у 1987 годзе, сваёй энэргетыкай натхняў моладзь і старэйшых пазбыцца страху.

Ён любіў па-добраму пахваліцца сваім родным Гарошкавам, ля якога археолягі знайшлі гарадзішча жалезнага веку, і ўзводзіць свой радавод да тых старадаўніх волатаў-беларусаў. Хай жа будзе пухам табе, Анатоль, родная зямля.

**Вінцук Вячорка, старшыня Партыі БНФ**

## Хворы хлопчык з цацкай

Хворы хлопчык з цацкай лёд на шыбе ліжа,
да шчакі прымерзла сіняя сьляза,
гэткі ціхі хлопчык, гэткі хлопчык рыжы,
быццам я ці брат мой дваццаць год назад.

Чаму хмурны, хлопчык? Чаму сумны, хлопчык?
Рана табе думу асьвятляць сьлязой.
адвядзі на цацку, калі ласка, вочы —
лёд расьце на шыбе, вострыя як лязо.

## Дух

…ды слова не прагняві,
Бо слова належыць Духу,
Кіньце слова гайні —
І паляціць пацяруха.
Змоўчыць абражаны Дух,
Новае слова народзіць,
Спыніць натоўпу рух,
Каб гаварыць аб народзе.
Зноў прыляціць гайня,
Выйдзе зь яе плюгавы:
«Дух — гэта, людзі, Я!» —
Скажа, а сам з рагамі.
Людзі разявяць рот —
Як жа ж, такія словы:
«З намі — увесь народ!
Шлях — да адзінай мовы!»
Людзі закрыюць рот,
Кожны сябе спытае:
«Гэта ж і я — народ —
Лёс такі прычакаю?»
Людзі закрыюць рот,
Людзі апусьцяць вочы…
Вось табе і народ,
Думаць прывыкнуў моўчкі.
З думай такой і вы:
Выжыве Дух-заступнік,
Знойдзе для нас правы,
Зьнішчыць пасад наш кутні…
Выжыве — гэна так!
Знойдзе… І вам на тацы
Медны падасьць пятак:
«Вось вам на хлеб, засранцы!»

## Забойства ў Нью-Ёрку

Далоні ў крыві, мая Ёка, японская жрыца.
Жанчыны на вуліцах плакалі, як па сваім.
О, гэтая зорка з пуцінай над прорвай у жыце…*
На веях Амэрыкі сьлёзы пашкодзілі грым.

«Лятучая мыш, незвычайная пеўчая птушка»,
Эвангельлем ад сябе асьвятляла натоўп пусты.
Нямы музыкант на аматарскіх кінастужках
Адзін-адзінюткі абраньнікам кулі застыў.

Нью-Ёрк быў заўсёды тваім улюбёным домам…

* Забойца не зьбіраўся ўцякаць. Ён спакойна запхнуў рэвальвэр у кішэню нагавіцаў, дастаў з другой кішэні кніжку «Над прорвай у жыце» Сэлінджэра і ціха апусьціўся ў чытаньне.

## Памяць пра яцьвягаў

…ані табе мовы,
ані табе сьцягу…
памяць пра яцьвягаў —
помста за яцьвягаў…

Выстудзілі хату…
Памяць адубела…
бы яцьвяг кудлаты —
шэрая кудзеля.



**СЬВЯТЛО ГАРЭЛА ТРЫ ДНІ. Акно Сысовай кватэры на вуліцы Чарвякова.**



СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

Кашляе крывёю
выстылая хата…
страшна… за сьпіною
здань — яцьвяг кудлаты.

Азірнуўся тройчы: вочы…
лістасьць просяць.
Белы ветах ноччу
зоркі ў небе косіць.

І галосяць зьнічкі
над пустою хатай…
Ветах — серп крывіцкі —
…кроў… яцьвяг кудлаты.
Азірнуся: вочы!
Гэта ж вочы брата!

…Мала зорак ноччу
над маёю хатай.
………..
І галосяць зьнічкі,
па жывых галосяць,
гэта люд крывіцкі
чорны ветах косіць.

## Вяпрук

Вяпрук пад шатамі дубоў
вадзіў зьнясіленых сяброў,
на паляўнічых не зважаў,
яго стралялі — ён ляжаў,
галодным быў — карэньне рыў
і думаў: голад паўбяды,
былі і горшыя гады,
пустыя, быццам жалуды.
Вяпрук пад шатамі дубоў
галодны думаў пра любоў,
пра тое, што ўсё жыцьцё
ён чуў адно — сяброў ныцьцё:
маўляў, паганы гэты лес,
савіны ды вужыны спрэс.
І каб ня ныў яго народ,
ёнікламі ўгрызаўся ў лёд,
запэўніваў, што жалуды
у іхнім лесе не бяды,
што недародкі ёсьць паўсюль,
калі ж не каштавалі куль —
ідзіце ў свой прывідны лес,
там сьцежкі паляўнічых спрэс,
а я сьцяжынаю вужоў
пайду на голас мудрых соў
галодны, з думай пра любоў,
пайду, знайду Зялёны Дуб
сярод лядзяных, сьнежных гурб
дыікламі ўгрызуся ў лёд
і зьненавіджу свой народ.

## Маналёг «Тутэйшага»

*Ахвярую Максіму Танку*

Люцыян, уяві, ты адзін,
ты застаўся адзін на Славяншчыне,
і нікога няма, паглядзі,
і нічога з Купалававай спадчыны,

і забралі жанчыну тваю,
віна налілі ёй атрутнага,
загадалі: адпі за сям'ю,
а да дна — за радзіму акрутную,

і сканала жанчына твая,
і памерла радзіна апошняя,
і паглохлі зязюлі ў гаях,
а ў нябёсы ўсмакталіся коршакі,

захлынуўся крывёю пярун,
зразумеўшы ў запозьненым плачы,
як сваёю крывёю Гарун
і ягоную кроў прадбачыў,

і зьліліся ў адну раку
і атрута, і кроў, і сьлёзы,
і на выспу, як на руку,
селі коршакі,
як залозы.

А ў тваім, Люцыян, Дняпры,
што жывіў спакон веку гоні,
тры русалкі, славянкі тры
янычаравых мыюць коней,

а ў тваім, Люцыян, Сажы
на грудзёх з камянём пудовым
твой апошні паэт ляжыць,
бы ў труне — у Сажы лядовым.

Ты адзін, ты адзін, ты адзін,
ты застаўся адзін на Славяншчыне,
і Радзіма твая, паглядзі —
русакосая Янычаршчына,

а калісьці ты гаварыў,
а калісьці ты нават кляўся:
не патухне Зьніч на Гары!
Ён патух. Ты яму пакайся

за ягоны пакутны прах,
за Радзіму сваю нявінную,
янычары яе ў палях
крумкачам ды ваўкам пакінулі,

ты пакайся за свой спакой,
што зубамі ня грыз вяроўку,
бо здушыўся і ты на ёй
ад жывёльнага поту мокры,

кайся, кайся за свой жывот,
не забудзься і пра Купалаў,
бо цяпер ты адзін — народ,
быцам храм на шляху вандалаў.

ДЫ ПАКУЛЬ ТЫ ЯШЧЭ ЖЫВЕШ,
ЗАПАЛІ ПРАД КУПАЛАМ СЬВЕЧКУ,
ПРАЧЫТАЙ І СПАЛІ МОЙ ВЕРШ,
А ВАНДАЛАМ СКАЖЫ:
Я ВЕЧНЫ!!!

АДАМ ГЛЁБУС



# Сучасьнікі

## Сыс і рай

У кватэры паэта вісіць густы і цяжкі дух чалавечай крыві. «Вось тут ён ляжаў. Бачыш плямы? Сястра замывала, але не замыла», — суседка Ала ня можа адвесьці вачэй ад цемных плямінаў на жаўтавата-залацістым лінолеюме. Праходжу зь вітальні ў пакой. «Хаваць будзем на Раданіцу, бо 10 траўня, на Раданіцу, брама ў рай адчыненая; і наш Цішка пойдзе адразу ў рай. Цішка… У нашым Гарошкаве Сысаў многа, таму нас клікалі Цішкамі. Бацька наш — Цішка, і мы ўсе ягоныя Цішкі, а ня Ціханавічы», — твар сястры паэта — Валянціны — зморшчваецца ад пакутлівай горычы, і яна пачынае плакаць. Іду на кухню, састаўляю пад стол пустыя бутэлькі з-пад гарэлкі і віна. Куру. Сыходжу. Па дарозе дамоў пішу разьвітальны верш:

Вядро віна цябе заўжды чакае.
Ты п'еш, бадзяешся, бууяніш, п'еш,
А геніяльная душа твая сьпявае
За добрым вершам новы лепшы верш…

Здарожаны, зьнясілены пакутнік —
Ты зачыняешся ў захламлены пакой,
Дзе ў змроку тытунёва-каламутным
Бясконца п'еш любімы свой напой.

Кроў з горла выцякае на падлогу.
Кроў выцекла, зьмяшаная зь вінном.
Ты — чысты — выпраўляешся ў дарогу,
У сьветлы і празрысты, райскі дом.

# Ножыкі

навэля



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## УЛАДЗІМЕР СЬЦЯПАН

*Борхесу прысьвячаецца*

Калі б мне давялося складаць сьпіс рэчаў, якімі ў дзяцінстве ці падлеткавым узросьце захапляўся і якія хацеў мець, то сьцізорыкі, нажы, ножыкі займалі б ці ня першыя радкі. У герархіі сапраўдных каштоўнасьцяў халодная зброя значна пераўзыходзіла кніжкі, асадкі-самапіскі, модную вопратку, ровар, прыёмнік «Сьпідолу», скураны футбольны мячык, гадзіньнікі…

На старэйшых сяброў-знаёмых, тых, у каго меліся добрыя нажы, глядзеў з прыхаванай павагай, з захапленьнем і зайздрасьцю.

Нож — сьвятое. Такая тады, пры канцы семдзясятых і на самым пачатку восемдзясятых, у маім гарадзкім пасёлку была мода. Няма сапраўднага нажа — ты не чалавек. Нажамі хваліліся, ганарыліся, забаўляліся, палохалі…

Віцька зь Лёнькам у свае сямнаццаць баяліся, можа, толькі міліцыі…

1982 год. Чэрвень. Бераг возера, а насамрэч — вялікай копанкі.

Жыцьцё за дзесяць гадоў, пакуль Лёнькі не было ў г.п., моцна зьмянілася. Знакамітай танцпляцоўкі ў парку ня стала — дошкі згнілі, іржавую агароджу разабралі. Ліпы, каштаны ды клёны вырасьлі. Падшыванцы зрабіліся хлопцамі, дзядзькі — дзядамі. У Віцькавай малодшай сястры за дзесяць гадоў — трое дзяцей. Лёнькавы бацькі пайшлі з жыцьця. Спачатку бацька на сваім сінім мапэдзе трапіў пад колы рэйсавага аўтобуса. Дожджык папырскаў — асфальт сьлізкі, вось мапэд і панесла на скрыжаваньні вуліцы і шашы. А праз тры гады маці не стала. Пайшла зранку па хлеб — самлела на вуліцы пад крамай. Сьпёка стаяла, парыла перад навальніцай — сэрца і спынілася.

Ён распытваў пра знаёмых, я адказваў, калі ведаў. Ён смактаў з рыльца піва і глядзеў на возера, быццам там у вадзе нешта адбывалася.

Лёнька гаварыў зь ледзь заўважнай, амаль няўлоўнай грэблівасьцю да свайго мінулага: «…у мяне быў нож.

І ў майго стрыечнага брата Віцькі быў нож.

Мы іх разам зрабілі. Стараліся. Сабе ж…

У мяне з чорным вузкім лязом і касьцянымі тронкамі, зь цьвёрдага ласінага рога. Зграбны такі ножык атрымаўся. А Віцькаў — зь лязом шырокім, на два пальцы, бліскучым, як тое люстэрка. Пры вялікай ахвоце паглядзецца ў халоднае жалеза можна, а пры жаданьні — зайчыкаў у вочы пускаць. Віцька на паўгалавы за мяне вышэйшы, і рукі ў яго, вядома ж, даўжэйшыя. А мяне і тады, і потым Малым клікалі. Я свой так навастрыў, што правядзеш па руцэ ледзь чутна — кропелькі крыві праз імгненьне высыпаюць. А Віцькавым паперу можна было кроіць — такі вострыя. У майго нажа лязо на два кулакі, а ў Віцькавага — на паўтара. Мералі ўсё, ці дастане да сэрца…

Схапіліся з братам стрыечным за танцпляцоўкай у парку. Вясной. Пры канцы траўня. Танцы яшчэ з Палацу культуры ў парк не перайшлі. Вечар. Выпілі віна. Слова за слова. Як заўсёды і пачынаецца… Я не хацеў… Ён першы пачаў. Сказаў, каб я да яго сястры ня лез, не чапаў. Казаў так, нібыта і ня ведаў, што ў мяне зь ёй даўно ўсё было. Мне ж сямнаццаць, а ёй шаснаццаць…

Віцька выхапіў свой бліскучы ножык, махануў мне перад тварам, секануў паветра. Як нос не адцяў… Я ж гэтаксама свой чорны выцягнуў. Кажу яму, каб суняўся і ня лез, — дзе там… Кажу, што з малой ягонай мы безь яго парад разабрацца зможам. А ён не — насядае, лезе. З твару зьбялеў, як той сыр зрабіўся, адно вочы чарнеюць. Кідаецца на мяне — у горла пацэліць хоча. Я, вядома ж, адскокваю. Крычу, каб ён суняўся ды супакоіўся, падла. Дзе там! Віцька ж шалёны. Калі што не па-ягонаму — адразу біцца лезе. Натура такая, кроў гарачая. Не глядзіць, хто перад ім — стары ці малы, яму бяз розьніцы. Каб я тады ўцёк — не зразумелі б… Як тады жыць? Свае і засьмяюць. Адыходжу. А ён хрыпіць, зыркае, як мяне ня бачыць ці не разумее, хто я такі. Ножыкам сваім бліскучым паветра сячэ… Бух! А за сьпінаю пруты жалезныя — агароджа танцпляцоўкі. Няма куды далей сунуцца. Віцька перакрываіўся радасна, як пад нагамі знайшоў нешта каштоўнае. Прыгнуўся і на мяне кінуўся. Я хоць і худы тады быў, але не настолькі, каб праз пруты ржавыя працмяліцца.

Мой нож па самыя вусы ў Віцькаў жывот увайшоў. Лязо ж вузкае, як той палец… А ён мне сваім бліскучым плячо разваліў, да самай косткі раскроіў…

Тут усе крычаць пачалі. А Віцька захроп. Мяне абшчапіў і плача. Кажа, што яму зусім не баліць. А можа, і ня гэта казаў — вакол крыку на ўвесь парк. Зь яго, потым чуў, і крыві не цякло. А зь мяне раўчуком лілася. Рукаво і бок — мокрыя. Чорныя, ліпкія… Я зьбег. Ножык свой схаваў. Потым на допыце сказаў, што ў возера закінуў. Шукалі. А каб і закінуў, то не знайшлі б. Глей тут на дне. Сам ведаеш… А ножык цяжкі.

Раніцай мяне і ўзялі.

Раніцай Віцька і памёр…

На суд ні яго бацькі, ні мае не прыйшлі. І Віцькава сястра не прыйшла — не пусьцілі, відаць, малую.

Толькі мой старэйшы брат сядзеў пад акном закратаваным і на мяне глядзеў. Непрыемна так пазіраў, як на хворага здаровы. Я яшчэ яму ўсьміхнуўся: свой жа, брат родны. А ён адно галавой пакруціў. Асуджаў… Заля была поўная — моладзі сабралася, усе знаёмыя. Усім цікава на забойцу паглядзець, а яшчэ цікавей, колькі гадоў уваляць. Дзясятку адхапіў. Адседзеў цалкам. Ніякая амністыя, а іх хапала, мне не дапамагла…»

У мяне ёсьць той нож з чорным вузкім лязом і касьцянымі тронкамі. Лёнька схаваў яго пад шыфэрным дахам чырвонацагляных старых, ці не даваенных, хлявоў, побач з возерам. Там ён і праляжаў дзесяць гадоў, пакуль гаспадара не было. Іржа лязо паела. Зрабіла шурпатым, няроўным, крыху шчарбатым. Лёнька яго дастаў, агледзеў, абсалютна без усялякіх эмоцый на худым твары, і аддаў мне. Яму той нож быў без патрэбы. Сэнтыментальных пачуцьцяў да мінулага ён ня меў, а можа, удала навучыўся хаваць, не паказваць, не выстаўляць навідавок.

Яму той шчарбаты нож быў без патрэбы.

Больш нікога ён забіваць не зьбіраўся.

Другі раз Лёнька сеў на чатыры гады.

Каму б іншаму такая бойка сышла з рук. А Лёнька іншым ня быў. Крымінальнае мінулае зрабіла сваю справу. За бойку на аўтобусным прыпынку з камандзіровачнымі мулярамі атрымаў напоўніцу. На той час ён пасьпеў ажаніцца, а жонка пасьпела нарадзіць дачку, здаецца — Анютай клікалі. Ні дзіця малое, ні жонка маладая дапамагчы яму не маглі. Яны засталіся ў бацькоўскай кватэры на першым паверсе старога, абшаляванага бараку. Старэйшы Лёнькаў брат на той час жыў зь сям'ёй асобна, на суседняй вуліцы, у белым каапэратыўным доме. Ён пачаў заходзіць да братавай і пляменьніцы — дапамагаць: дзе кран наладзіць, замок адрамантуе, дзе лямпачку заменіць, цукеркай ці яблыкам пляменьніцу пачастуе… Карацей, закруціліся адпаведныя адносіны… На зону да Лёнькі калі і езьдзіў, то паасобку, а каб разам — дык ніколі.

Далей я магу адно ўявіць…

Лёнька выйшаў датэрмінова на некалькі тыдняў. Яго ніхто не сустракаў і ніхто не чакаў. Ноччу, самым апошнім аўтобусам, прыехаў у г.п.

Канец траўня. Цёплая ноч. Бэз, язьмін, каштаны ў квецені, гронкамі бялеюць. Хрушчы, як кулі, носяцца, гудуць, пад ліхтарамі круцяцца. Ён прайшоў побач са сваім домам. Паглядзеў на цёмныя вокны бацькоўскай, яго, жончынай кватэры. Фіранкі на вокнах былі тыя ж, у дробныя кветачкі-ягадкі. Можа, каб ён убачыў дачку ці жонку з дачкой на руках, усё б склалася інакш. Ня ўбачыў… Спалі. Нават моладзь і тая той цёплай ноччу па вуліцах ня швэндалася.

Прыйшоў да старэйшага брата. Дзе была жонка зь дзецьмі, чаму дома не аказалася — ня ведаю, але старэйшы, якому раніцай на завод, сустрэў брата радасна. Селі піць гарэлку. Лёнька з сабой прывёз. Пляшку не дапілі. Лёнька схапіў са стала нож. Звычайны такі нож — самаробны. На заводзе ў сьлясарным такія і робяць. Шырокае лязо зь нержавейкі, наборная ручка стракатая. Такім і хлеб добра кроіць, і бульбу абіраць…

Лёнька сам міліцыю і выклікаў. Патэлефанаваў і растлумачыў, што да чаго, каб сумненьняў ня мелі. Сеў на падлогу, запаліў і стаў чакаць, пакуль па яго прыедуць.

А нож на стале ляжаў. Лязом пабліскваў.

Самы звычайны нож. У кожным доме такі ёсьць.

*Менск. 2005, красавік*



УЛАДЗІМЕР СЬЦЯПАН (нар. у 1958 у г. Касьцюкоўка на Гомельшчыне) — паэт, празаік, мастак. Аўтар кніг прозы «Вежа», «Сам-насам». Жыве ў Менску.

# За кітайскім мурам

Сухая статыстыка пратаколаў, гэтая ўлюбёная мужчынская чытанка за сьняданкам, ня здольная адэкватна адлюстраваць маштаб падзеі: у Беларусі склаўся свой пазнавальны, відовішчны стыль настольнага тэнісу. Піша **Андранік Антанян**.



**ВІКТОРЫЯ ПАЎЛОВІЧ** увайшла ў васьмёрку найлепшых тэнісістак плянэты.

З 30 красавіка да 6 траўня ў Шанхаі праходзіў чэмпіянат сьвету па настольным тэнісе. Асноўная інтрыга спаборніцтва, як і меркавалася, заключалася ў тым, колькі мэдалёў спартовыя ўлады КНР дазволяць ўзяць прадстаўнікам іншых краінаў. Дазволілі ня так і шмат. За межы Паднябеснай выехала ўсяго пяць мэдалёў, зь іх — ніводнага залатога.

## Саступілі мацнейшым

Вынікі выступленьняў беларускіх спартоўцаў можна трактаваць па-рознаму. Нейкіх вонкавых прычынаў для гонару за нашых спартоўцаў для шараговага заўзятара нібы й не назіраецца. Нязьменны лідэр беларускага тэнісу Ўладзімер Самсонаў, які ўпэўнена пачаў турнір, а ў 1\16 фіналу ў прыгожым стылі 4:0 перамог легендарнага швэдзкага тэнісіста Яна Увэ Вальднэра, што нягледзячы на свае вельмі паважныя для вялікага спорту гады (трыццаць дзевяць!) застаецца небясьпечным супернікам. Але ўжо ў наступным этапе Самсонаў ва ўпартай барацьбе (4:3 лік па партыях) прайграў у матчы за выхад у лік васьмі наймацнейшых будучаму мэдалісту Ох Сан Юню з Паўднёвай Карэі.

Маладыя Андрэй Чумакоў і Павал Платонаў спынілі выступленьні яшчэ на стадыі кваліфікацыйнага адбору, ня здолеўшы канвэртаваць свае спартовыя амбіцыі ў прыкметныя вынікі.

Найлепшай з жаночай паловы каманды была Вікторыя Паўловіч, якая здолела ўвайсьці ў лік васьмі найлепшых тэнісістак плянэты. Яе сястра Вераніка не змагла прайсьці далей за трэці круг спаборніцтваў, саступіўшы адной з асноўных прэтэндэнтак на мэдалі Гуо Янь з Кітаю.

Тацяна Кастраміна, паказаўшы годную гульню, на тым жа этапе спатыкнулася ў матчы з узыходзячай зоркай японскага настольнага тэнісу 16-гадовай Аі Фукухары.

За такія лічбы ў афіцыйных пратаколах спаборніцтва ў Міністэрстве спорту і турызму не выпісваюць прэмій, кіраўнік краіны ня выдзеліць і хвіліны на сустрэчу зь імі, а твары спартоўцаў ня будуць фігураваць на рэклямных шчытах у Менску. Але сухая статыстыка пратаколаў, гэтая ўлюбёная мужчынская чытанка за сьняданкам, не зусім адэкватна адлюстроўвае маштаб падзеі.

## Двойчы на пік формы не выходзяць

Вядома, упэўненая перамога Ўладзімера Самсонава на чэмпіянаце Эўропы, што праходзіў месяц таму ў дацкім Орхусе, давала беларускім заўзятарам права спадзявацца на яго посьпех і ў Шанхаі. Але заўзятары толькі дзякуючы веры ў перамогу і жывуць. У спорце цягам аднаго месяца двойчы выйсьці на пік формы — задача звычайна нерэальная. Цуд не адбыўся і гэтым разам.

Выступленьне ж беларусак у Шанхаі дазваляе рабіць больш аптымістычныя высновы. Вядома, тое, што Вікторыя Паўловіч была адзінай прадстаўніцай некітайскай школы настольнага тэнісу, якой удалося на гэтых спаборніцтвах прабіцца ў лік васьмі мацнейшых, і прайграла ў матчы за выхад у паўфінал лідэру толькі сусьветнай кваліфікацыі і будучай пераможцы Жан Інін, — безумоўна, вялікі посьпех і яе, і трэнэраў нацыянальнай каманды Аляксандра і Тацяны Пяткевічаў. Ацаніць яго могуць толькі тыя, хто разумее, да якой ступені жаночы кітайскі настольны тэніс вырваўся наперад у параўнаньні з астатнім сьветам.

## Гульня ў першасным значэньні

Назіраючы за выступленьнямі беларусак, я заўважыў прыемныя прыкметы таго, што ў Беларусі склаўся свой пазнавальны, відовішчны (і пакуль што непаўторны) стыль настольнага тэнісу. Сутнасьць яго палягае ў даволі лягічным, але ў сучаснай гульні рэдка практыкаваным прынцыпе — унівэрсалізьме. Аддаючы ініцыятыву ў розыгрышы праціўніцы, паралізуючы яе атаку магутнымі падрэзкамі і блытаючы іх тым, што мячы вяртаюцца з розным вярчэньнем, пры першай жа магчымасьці беларускі хутка і дакладна атакуюць па месцы. Такая гульня, з доўгімі розыгрышамі, калі на першы плян выходзяць не адпрацаваныя да аўтаматызму дзеяньні каля стала, сэнс якіх як мага хутчэй перайсьці ў атаку і першым ходам згуляць на перамогу, але гульня ў яе першасным значэньні, калі кожны розыгрыш цягнецца звычайна не адзін дзясятак хадоў, калі ініцыятыва неаднаразова пераходзіць з рук у рукі і калі само валоданьне ініцыятывай не азначае роўна нічога. Калі ані шараговы глядач, ані адмысловец ня можа з пэўнасьцю сказаць, чыёй перамогай скончыцца той ці іншы розыгрыш. Гэтай гульнёй беларускія спартоўкі ўразілі шматлікую аўдыторыю аматараў настольнага тэнісу, якая назірала за спаборніцтвамі ў Шанхаі.

Такая гульня з доўгімі розыгрышамі можа цягнуцца не адзін дзясятак хадоў, калі ініцыятыва неаднаразова пераходзіць з рук у рукі і калі само валоданьне ініцыятывай не азначае роўна нічога.

Адыход ад клясычнага абароннага стылю, калі ў задачу тэнісісткі ўваходзіць толькі чаканьне памылкі з боку праціўніцы, дазволіў нашым тэнісісткам стаць аўтаркамі прыкметнай сэнсацыі. На вялікі жаль, прыгожыя аблокі яшчэ не прынесьлі дажджу. Цудоўна разумею, што мы столькі разоў чулі пра важнасьць ўдзелу, а не перамогі, што ўжо немагчыма паверыць у тое, што толькі праз аналіз паразаў і няўдачаў уласна і палягае шлях да перамогі. Але ў спорце інакш не бывае.

## Папялушка беларускага спорту

Пісаць пра перамогі лёгка і проста. Прыводзіш вынікі і дадаеш на свой густ неабходную колькасьць клічнікаў, ну і картачку пераможцы апублікаваць не зашкодзіць. Аднак нават тое, што Ўладзімер Самсонаў стаў сёлета ў трэці раз чэмпіёнам Эўропы ў настольным тэнісе ў асабістым разрадзе (а калі ўлічыць яго перамогі ў парных і камадных спаборніцтвах, то гэты залаты мэдаль быў ужо шостым у фэерычнай спартовай кар'еры беларуса), ня выклікала асаблівага ажыятажу на старонках агульнанацыянальных выданьняў.

Такія «дробязі» бягучага спартовага жыцьця, як срэбны мэдаль, заваяваны ў парным разрадзе Вікторыяй Паўловіч разам з аўстрыйцам Чэнам Вісінам, і «срэбра» ў парных спаборніцтвах Уладзімера Самсонава разам з грэкам Калінікасам Крэангам мала хто палічыў важкай інфармацыйнай нагодай.

Пытаньне: «а чаму?» тут абсалютна будзе дарэчы. Ці шмат відаў спорту зь ліку тых, якія культывуюцца ў нашай краіне, рэгулярна прыносяць краіне мэдалі з эўрапейскіх спаборніцтваў? Калі ў краіне існуе культ біятлёну, то ўзьнікае пытаньне: а колькі ж людзей зь ліку адэптаў гэтага культу бегала па лесе на лыжах з дробнакалібэрнай стрэльбай за сьпінай і як часта яны падобным чынам бавяць свой вольны час? Слаба верыцца ў тое, што іх у разы больш, чым тых, хто хоць аднойчы трымаў у руках ракетку.

## СЬЦІСЛА

### Чацьверты гол Кутузава

У 35-м туры італьянскай сэрыі «А» форвард «Сампдорыі» і нацыянальнай футбольнай зборнай Віталь Кутузаў спрычыніўся да разгрому «Лечэ» (3:0). Беларускі легіянэр правёў другі мяч у гульні, і цяпер на рахунку Кутузава чатыры мячы ў гэтым сэзоне. За тры туры да фінішу «Сампдорыя» дзеліць чацьвертае-пятае месца з «Удынэзэ». Каманды адстаюць ад «Інтэру», што ідзе трэцім, на шэсьць пунктаў.

### Посьпех Хэнлана

Нацыянальнай зборнай Беларусі не ўдалося прабіцца ў чвэрцьфінал чэмпіянату сьвету па хакеі. У вырашальным матчы ў панядзелак беларусы саступілі зборнай Швайцарыі зь лікам 0:2. Нягледзячы на гэта, выступ у Аўстрыі падапечных Глэна Хэнлана можна прызнаць пасьпяховым. Яны ня толькі захавалі месца ў эліце, але і трапілі ў дзясятку мацнейшых. Дарэчы, таксама можна лічыць удалым і выступ усіх постсавецкіх камандаў. З 12 зборных, што прадоўжылі барацьбу за мэдалі, пяць належаць да былога СССР: Украіна, Расея, Латвія, Казахстан, Беларусь.

Чвэрцьфіналы — у чацьвер, паўфіналы — у суботу, фінал — у нядзелю.

### Чужое сьвята

Няўдала выступіла зборная Беларусі на юнацкім чэмпіянаце Эўропы па футболе (узрост гульцоў да 17 год) у Італіі. Выхаванцы Пятра Міхеева дзьве сустрэчы прайгралі з буйным лікам — ангельцам (0:4) і туркам (1:5), адну выйгралі — у зборнай Італіі (1:0). У паўфінал з нашай групы трапілі зборныя Італіі і Турцыі.

### Літоўскі фінал

Самым каштоўным гульцом маскоўскага баскетбольнага «Фіналу чатырох» Эўралігі ULEB стаў абаронца тэль-авіўскага «Макабі» літовец Шарунас Ясікявічус. У паўфінале ізраільскі клюб перамог грэцкі «Панацінаікас» (91:82), а ў фінале — басцкі «Таў» (90:78). Ясікявічус набраў у фінале 22 пункты. Самага каштоўнага гульца вызначалі галасаваньнем журналістаў падчас фіналу. Адзначым таксама, што адным з найлепшых у складзе «Таўгрэса» быў іншы літоўскі легіянэр — Арвідас Мацiяўскас, які зрабіў найбольшы ўнёсак у перамогу ў паўфінале над маскоўскім ЦСКА.

**AP**

ІНФАРМАТАР

# Сталічныя басэйны

**«Алімп»**
вул.Я.Коласа, 2
231-07-11, 239-18-01

**Алімпійскі спартовы комплекс**
вул.Каліноўскага, 111
264-94-55; 264-00-06

**«Арляня»**
вул.Кахоўская, 74
233-65-71

**Басэйн**
вул.Кабушкіна, 86А
214-13-99

**Басэйн**
вул.Філімонава, 55/2
264-55-52

**Басэйн БДУІР**
вул.П.Броўкі, 10
232-49-61

**Басэйн БНТУ**
вул.Б.Хмяльніцкага, 9
296-65-74

**Басэйн гімназіі №14**
вул.Васьняцова, 10
245-04-51

**Басэйн ПК чыгуначнікаў**
вул.Чкалава, 7
225-51-78

**Басэйн Прафэсійна-тэхнічнага каледжу**
вул.Ваўпшасава, 23
296-35-25

**Басэйн СДЮШАР па сучасным пяцібор'і**
вул.Сталетава, 1
235-26-52

**Басэйн СШ №137**
вул.Каліноўскага, 50/2
264-21-30

**Басэйн СШ №201**
вул.Кунцаўшчына, 20а
258-85-04

**«Блакітны»**
вул.Казлова, 17а
239-08-47, 239-09-32

**«Бурштын»**
вул.Л.Чайкінай, 12
217-93-00

**«Гарызонт»**
вул.Куйбышава, 41
239-48-59, 284-78-62

**«Даўгалецьце»**
вул.Жудро, 40
255-39-82

**«Дэльфін»**
вул.Чарнігаўская, 46
277-40-26

**«Кропелька» (басэйн СШ №1)**
вул.Чкалава, 3а
224-88-34

**«Нэптун»**
вул.Любімава, 29
272-44-50

**Палац воднага спорту**
вул.Сурганава, 2а
280-27-05

**Палац воднага спорту для дзяцей і юнацтва**
вул.Нікіфарава, 49
260-32-07

**«Серабранка»**
пр.Ракасоўскага, 44
247-11-55, 248-70-57

**«Сонечны зайчык»**
вул.П.Панчанкі, 30
213-98-96

**Спартовы клюб Узброеных сіл**
вул.Чырвонаармейская, 3
227-77-14

**Спартовы комплекс**
пр. газэты «Известия», 6а
207-92-98

**«Спорт-сэрвіс»**
вул.Даўгабродзкая, 37
238-65-91

**«Старт»**
вул.П.Глебкі, 30а
255-60-16, 255-60-57

**«Трактар»**
238-65-91
Даўгабродзкая, 37

**Фізкультурна-аздараўляльны комплекс імя П.Машэрава**
пр.Машэрава, 23,
226-68-66

**«Хваля»**
вул.Фабрычная, 18,
227-85-59

ПАРТЫЯ З ГРОСМАЙСТРАМ



Чытачы й гросмайстар разьмяняліся: 17…Cg4:f3 18. Фb3:f3. Незаўважна партыя перацякла ў мітэльшпіль, прычым у пазыцыі чорных намецілася слабіна: пешка f7. Наагул, фігурна-пешачны кулак белых выглядае даволі ўнушальна, чаго ня скажаш пра расстаноўку чорных фігур. Пра атаку марыць не выпадае, аднак, здаецца, рэзэрвы абароны ня вычарпаныя. Вашых ходаў чакаем да панядзелка, 19:00.

E-mail: nn@promedia.by («Каіса»), он-лайн: bychess.narod.ru.

**З. Лыбін – чытачы «НН». Ход чорных.**

КАІСА

# Хто на Харкаў?

Беларускія гульцы надоечы вярнуліся з Харкава, дзе ў сёмы раз пад дахам Нацыянальнай юрыдычнай акадэміі імя Яраслава Мудрага ладзіўся Кубак рэктара. Гэтае спаборніцтва, што звычайна прыцягвае моцных маладзёнаў — расейцаў, украінцаў і беларусаў — чарговае пацьверджаньне таго, што з шахматамі ва Ўкраіне збольшага ўсё ў парадку. Нездарма летась украінцы заваявалі «золата» на Алімпіядзе, а ў рэйтынгсьпісе ФІДЭ іх краіна па сукупнасьці вынікаў займае другое месца (пасьля Расеі). Беларусь жа ў тым сьпісе вылецела з другога дзясятка.

Праўда, і ў нашай памаранчавай суседцы здараюцца недарэчнасьці. Так, ледзь не ў апошні момант з траўня на верасень быў перанесены буйны міжнародны турнір у Кіеве. Арганізатары «патлумачылі»: у траўні пройдзе «Эўрабачаньне», ня хочам накладак. Нібыта сярод музыкаў ды іхніх фанатаў бракуе шахматыстаў, і наадварот…

У сёлетнім Кубку рэктара бралі ўдзел Іна Раманава, Віктар Купрэйчык, Юры Ціханаў. Гросмайстарка Іна файна згуляла ў жаночай лізе — сярод дванаццаці ўдзельніц заняла 3-е месца з 7 баламі, зачапіўшыся за стодаляравы прыз.

Што да мужчынаў, то сп.Віктар, найстарэйшы ўдзельнік турніру, аказаўся толькі сёмым, затое сп. Юры — чацьвертым. Напорыстасьць менчука зь Нямігі дала плён: пяць перамог, тры паразы, тры нічыі (як ні дзіўна, адзін зь яго партнэраў, 15-гадовы хлопец-расеец, зьвёў унічыю ўсе 11 гульняў — і варта было дзеля гэтага так далёка ехаць?).

Паглядзіце партыю віцэ-чэмпіёна Беларусі, дзе чорныя аказаліся разьбітымі ў дваццаць хадоў. Гросмайстры — таксама людзі.

Ю. Ціханаў, мм, Беларусь (2466) — А. Зубараў, мг, Украіна (2514)

1. d4 g6 2. Kf3 Cg7 3. g3 c5 4. c3 Kf6?! 5. dc a5? 6. Ka3 Ka6 7. Фd4! O-O 8. Cg2. Кампэнсацыі за пешку няма, а адыграць яе цяжка — на 8…Kh5 магчыма 9. Фc4 Фc7 10. Ce3. І чорныя доўжаць сваю авантуру, аддаючы другога латніка: 8…b6 9. cb Cb7 10. O-O Ke4 11. Фe3 Kac5 12. Kd2 d5 13. Ke4 Ke4 14. Td1 Фe8 15. Ce4 de 16. Фc5 Ca6 17. Cg5 Ce2 18. Фe7! Ахвяра якасьці за пешку — адна зь любімых фішак Ю. Ціханава. Ён фарсіруе пераход у безнадзейны для суперніка эндшпіль. 18…Cd1 19. Фe8 Tfe8 20. Td1 h6 21. Ce3 a4 22. b7. Чорныя здаліся: пасьля 22…Tab8 23. Td7 Ce5 24. Kc4 пешка b каштавала б ім занадта дорага.

**ВР**

Як бы вы згулялі?



**І. Раманава, мг, Беларусь (2242) — Н. Баднарук, мф, Расея (2198). Харкаў, 2005. Ход белых. Знайдзіце слабое зьвяно ў «грознай» пабудове чорных.**

Адказ: 1. Кс6! і белыя выйграюць якасьць.

ВАРТА БАЧЫЦЬ

## Пятніца, 13 траўня

**АНТ, 21.05**

«Невыносная жорсткасьць».

ЗША, 2003, рэж. Этан Коэн, Джоэл Коэн.

Рамантычная камэдыя.

Пасьпяховы адвакат, які займаецца скасаваньнем шлюбаў, зьвязваецца зь пекнай жанчынай, прафэсія якой — шлюбная афэрыстка. «Бітва полаў» пачынаецца…

Іранічныя браты Коэны вырашылі пазьдзекавацца зь велікасьвецкіх камэдый: сэнтымэнтальнае шчасьце, на радасьць масаваму гледачу, перамагло. Гэта не адмяняе атрутна-трапных дэталяў карціны (чаго варты адзін астматык-кілер), але арт-хаўс у «Невыноснай жорсткасьці» здымае капялюш перад замілаваньнем і жаночымі сьлязамі.

У ролі адваката — белазубы Джордж Клуні, а драпежную зазнобу грае Кэтрын Зэта-Джонз.

**«Лад», 22.20**

«Знойдзены час».

Францыя—Італія—Партугалія, 1999, рэж. Рауль Руіс.

Драма паводле раману М.Пруста.

Экранізацыя славутага твору, зробленая сусьветным клясыкам чылійцам Раулем Руісам («Гісторыя злачынства», «Калёквіюм сабак»). У ролі Адэты — Катрын Дэнёў, Джыльбэрту іграе Эмануэль Бэар, Джон Малкавіч — барона Шарлюса.



Карціна намінавалася на галоўную ўзнагароду Канскага кінафэстывалю, Эмануэль Бэар атрымала прэмію Кабурскага МКФ як найлепшая актрыса, узнагародай быў прывечаны апэратар Рыкарда Арановіч.

Тэлеканал «Лад» звычайна агучвае францускія фільмы на беларускую мову.

**АНТ, 23.30**

«Каляс назаўжды».

Італія—Францыя—Гішпанія, 2002, рэж. Франка Дзэфірэлі.

Драма.

Марыя Каляс — легенда опэры і кіно. Дзэфірэлі быў сябрам опэрнай сьпявачкі, яны разам ставілі «Тоску» ў «Ковэнт Гардэне».

Карціна «Каляс назаўжды» — даніна памяці актрысе й апавядае пра апошнія яе дні. Да гераіні, якая страціла свой каштоўны голас, зьвяртаецца прадусар (Джэрэмі Айранс) зь незвычайнай прапановай — зьняць фільм-опэру зь яе ўдзелам.

Ролю Каляс выконвае Фані Ардан. Карціна выклікала супярэчлівыя водгукі — ад захапленьня да абурэньня.

## Субота, 14 траўня

**СТВ, 23.30**

«Вясна, лета, восень, зіма... і зноў вясна».

Паўднёвая Карэя—Нямеччына, 2003, рэж. Кім Кі Дук.

Паэтычная драма-прыпавесьць.

Вясной стары манах у храме ля возера раскажа хлопчыку пра абавязкі і веру, летам шаснаццацігадовы юнак спазнае каханьне й пакіне настаўніка, увосень трыццацігадовы вучань вернецца, а ўзімку саракагадовы мужчына будзе чакаць вясны, калі пачнецца новы цыкл і аднаўленьне жыцьця…

Фільм — паэтычная і тонкая карціна паўднёвакарэйскага рэжысэра Кім Кі Дука («Востраў», «Берагавая ахова», «Пусты дом»).

Карціна прывечаная вялікай колькасьцю ўзнагарод — на кінафэстывалі ў Лякарна, на МКФ у Сан-Сэбасьцьяне, у Паўднёвай Карэі і г.д.

**АНТ, 23.55**

«Адзін прапушчаны званок».

Японія, 2003, рэж.Такашы Міікэ.

Містычны трылер з іранічнымі элемэнтамі.

Эпатажнік і правакатар Такашы Міікэ вырашыў прэпараваць сучасныя японскія фільмы жахаў.

Кіно атрымалася страшным: у герояў зьвіняць мабільнікі і яны чуюць уласныя перадсьмяротныя хрыпы, што мусяць прагучаць праз некалькі дзён. Прывіды, цені, чорныя валасы, грукат, ажыўлены труп і адсечаная рука, што набірае нумар на тэлефоне.

Кіно хавае ў сабе іронію: шматлікія цытаты-запазычваньні, гераіня з нажом і чырвоная цукерка-ледзянец. Некаторыя гледачы будуць у разгубленасьці.

Фільм дэманстраваўся ў Менску ў кінафармаце «4х4».

## Нядзеля, 15 траўня

**СТВ. 7.55**

«Каралеўства крывых люстэркаў».

Расея, 1963, рэж.Аляксандар Роў.

Казка.

Дзяўчынка Оля трапляе за люстэрка — у краіну, дзе кіруе тыран Йагупап, міністры Абаж і Нушрак. Гераіня — разам са сваім двайніком-адлюстраваньнем — мусіць вызваліць хлопчыка Гурда.

Густоўная рэжысура, яркія касьцюмы, бліскучыя акторы (Лідзія Вярцінская, Георгі Міляр) і пекная гісторыя для дзяцей, якую не сапсавалі нават абавязковыя для савецкага кіно клясавыя канфлікты.

**СТВ, 22.10**

«Памерці за...».

ЗША, 1995, рэж. Гас Ван Сэнт.

Гераіня карціны Сьюзан (Ніколь Кідман) пойдзе на ўсё, каб стаць зоркаю на тэлевізіі. Але ёй перашкаджае муж (Мэт Дылан), які разьлічвае на простае сямейнае шчасьце. Гераіня спакушае дуркаватага школьніка, каб той забіў яе мужа…

Іранічная й атрутная драма Гаса Ван Сэнта («Джэры», «Мой асабісты штат Айдаха»). Але іронія, асабліва ў фінале, ня кожнаму гледачу спадабаецца; а прыхільнікі «чыстага кіно» будуць нездаволеныя зразумела расказанай гісторыяй.

**Андрэй Расінскі**



# ЗОРКА ВАСІЛЯ

**13 траўня**

ПРЭЗЭНТАЦЫЯ

У пятніцу ў Дольнай залі касьцёлу сьвятых Сымона і Алены адкрыецца мастацкая выстава і пройдзе прэзэнтацыя альбому «Васілёва зорка (мастакі — Васілю Быкаву)», што пабачыў сьвет дзякуючы народным ахвяраваньням. Альбом складаецца з твораў 25 мастакоў - удзельнікаў жнівеньскага пленэру на радзіме пісьменьніка ў вёсцы Бычкі. Увайшлі таксама ў выданьне вершы В.Іпатавай, П.Ламана, Г.Ліхтаровіча, П.Зьмітрука, Д.Сімановіча і выказваньні дзеячаў культуры і саміх мастакоў.

**Пачатак у 17.00**

## ВЫСТАВЫ

### Лесдрэўтэх

**З 17 да 20 траўня** ў выстаўным павільёне НВЦ «Белэкспа» на Я.Купалы, 27 пройдзе VI Спэцыялізаваная выстава «Лесдрэўтэх».

### Milex

**З 17 да 20 траўня** ў выстаўным павільёне НВЦ «Белэкспа» на Машэрава, 14 пройдзе III Міжнародная выстава ўзбраеньняў і ваеннай тэхнікі «Milex-2005».

### 1+1=1

У Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (малая заля; пр.Ф.Скарыны, 47) **да 25 траўня** працуе выстава Антаніны Слабодчыкавай і Міхаіла Гуліна «1+1=1». Квіткі: 2 000.

## ІМПРЭЗЫ

### Адлюстраваньне першатвору

**16 траўня** а 19-й у Доме літаратара адбудзецца прэзэнтацыя новай кнігі пісьменьніка Пятра Васючэнкі «Адлюстраваньне першатвору». Чакаюцца выступы герояў літаратурнай крытыкі аўтара — пісьменьнікаў У.Арлова, З.Вішнёва, А.Глёбуса, Л.Дранько-Майсюка, Л.Рублеўскай, В.Трэнас, А.Федарэнкі, В.Шніпа, музычных гуртоў «Брама», «Джамбібум», «Жаба ў каляіне».

### Мірзаян

**16 траўня** ў актавай залі філфаку БДУ (К.Маркса, 31) адбудзецца навуковы сэмінар «Паэзія, аўтарская песьня і расейская нацыянальная ідэя». Сэмінар правядзе Аляксандар Мірзаян. Пачатак а 18-й. Квіткі: ад 3 000.
**17 траўня** тамсама пройдзе канцэрт Аляксандра Мірзаяна. Пачатак а 19-й. Квіткі: ад 8 000.

### Монтэ-Касіна

**17 траўня** а 18-й гадзіне ў гістарычнай майстэрні (вул.Сухая, 25) адбудзецца прэзэнтацыя фільму «Забытыя героі Монтэ-Касіна».

### Напалеон Орда

**19 траўня** а 18-й гадзіне тамсама — вечарына «Напалеон Орда. Мастак, музыка, змагар». Выступоўцы: Леанід Акаловіч, Ігар Гатальскі, Анатоль Валахановіч.

### Streetracing

**21 траўня** ў Салігорску пройдзе фэстываль «Streetracing» з правядзеньнем заездаў на 1/4 мілі, выстаўкамі аўтатэхнікі і конкурсамі.

## ТЭАТРЫ

### Опэра

**14** (сб) — «Мадам Батэрфляй».
**15** (ндз) — «Сэвільскі цырульнік».
**19** (чц) — «Кармэн».
**20** (пт) — «Набука».
**21** (сб) — «Іяланта».

### Тэатар беларускай драматургіі

**12** (чц) — «Нязваны госьць».
**13** (пт) — «Адэль».
**14** (сб) — «Валянціна».
**15** (ндз) — «Чорны квадрат».
**17** (аўт) — «Понці Пілат».
**20** (пт) — «Містэр Розыгрыш».
**21** (сб) — «Чорны квадрат».
**22** (ндз) — «Адэль».

### Тэатар-студыя кінаактора

**12** (чц) — «Міленькі ты мой».

### Музычны тэатар

**12** (чц) — «Юнона і Авось».

### Моладзевы тэатар эстрады

**12** (чц) — «Эстрадны кактэйль».

### Тэатар імя Горкага

**12** (чц) — «Анджэла і іншыя».

### Новы драматычны тэатар

**12** (чц) — «Чай з вэрблюдам».

### Тэатар імя Янкі Купалы

**12** (чц) — «Паўлінка».

### Моладзевы тэатар

**12** (чц) — «Вясельлю быць, ці З хлусьні мыты не бяруць».

### КЗ «Менск»

**16** (пн) — «Цудоўны мужчына».

## ФІЛЯРМОНІЯ

### Вялікая заля

**12** (чц), 18.00 — дзяржаўны камэрны аркестар РБ, хор «Пунсовыя ветразі».
**14** (сб), 19.00 — фэстываль памяці Эдзі Рознэра «Залатая труба».
**15** (ндз), 16.00 — юныя музыкі ў канцэрце «Мой маленькі джаз».
**15** (ндз), 19.00 — фэстываль памяці Эдзі Рознэра «Залатая труба». Jazz Family і аркестар Symphonic Drive Orchestra.

### Заля камэрнай музыкі

**12** (чц), 19.00 — скрыпічная музыка.
**13** (пт), 19.00 — канцэрт камэрнай музыкі.
**14** (сб), 19.00 — арганная музыка.

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Bronx** (288-10-61, GSM «Velcom»: 103 і 105)
**12** (чц), 22.00 — «Cigar Deluxe Party №2»: джаз, Іскуі Абалян.
**13** (пт), 22.00 — жывая музыка: «Крама» / dj Laurel.
**Белая вежа** (284-69-22, 239-16-00)
**14** (сб), 23.00 — жывая музыка: «Acoustic Band» / dj Mihel, dj Alex.
**15** (ндз), 23.00 — жывая музыка: «Acoustic Band» / «Gold Party»: dj Alex, dj Antonov, гіты 1960—1990-х.
**Графіці** (8-029-758-40-54)
**12** (чц), 20.00 — канцэрт Настасьсі Вайцяшонак.
**19** (чц), 20.00 — канцэрт Цімафея Скарэнкі.

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Царства нябеснае» (прэм'ера, 2с): **13** (пт) 15.00, 17.50, 20.40; **14, 15** (сб, ндз) 12.00 (іл), 15.00, 17.50, 20.40.
«Бой зь ценем»: **13** (пт) 18.30, 20.50; **14, 15** (сб, ндз) 13.30, 16.00, 18.30, 20.50.
**«Берасьце»** (272-87-91)
«Уцёкі»***: **13** (пт) 18.50 (іл), 21.00; **14, 15** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.30, 18.50, 21.00.
«У жніўні 44-га» (да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі): **13** (пт) 11.00.
**«Дружба»** (240-90-13)
«Сахара» (2с): **14** (сб) 18.40.
«Ад 180 і вышэй»: **13** (пт) 18.20, 20.00; **14** (сб) 16.00 (іл), 20.30; **15** (ндз) 19.30, 21.00.
«Чароўная краіна»: **13** (пт) 15.00.
**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Царства нябеснае» (прэм'ера, 2с): **13** (пт) 15.30, 18.10, 21.00; **14, 15** (сб, ндз) 15.30 (іл), 18.10, 21.00.
**«Масква»** (203-14-48)
«Царства нябеснае» (прэм'ера, 2с): **13—15** (пт—ндз) 18.10, 21.00.
«Глыбокая плынь» (да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі): **13—15** (пт—ндз) 14.30 (іл), 16.30 (іл).
**«Мір»** (288-22-33)
«Ад 180 і вышэй» (2с): **13—15** (сб, ндз) 17.00, 19.00, 21.10.
«Правілы здыманьня: Хітчаў мэтад»: **13** (пт) 16.00, 18.20, 20.40; **14, 15** (сб, ндз) 18.20, 20.40.
«Чароўная краіна»: **14, 15** (сб, ндз) 16.00 (іл).
**«Перамога»** (203-77-66)
«Жаніх напракат»: **13** (пт) 15.00, 17.00; **14** (сб) 14.00 (іл); **15** (ндз) 15.00 (іл).
«Турэцкі гамбіт»: **13** (пт) 18.50.
«Месяцавая Літва» (фэстываль эўрапейскага кіно): **14** (сб) 17.00.
«Няверная» (фэстываль эўрапейскага кіно): **14** (сб) 19.00.
«Жорны лёсу» (фэстываль эўрапейскага кіно): **15** (ндз) 19.00.
«Цішыня» (фэстываль эўрапейскага кіно): **15** (ндз) 21.00.
**«Піянер»** (227-64-87)
«Давайце патанчым»: **13** (пт) 19.00; **14, 15** (сб, ндз) 15.10, 19.00.
«Летуценьнікі»***: **13—15** (пт—ндз) 21.00.
«Выбух на досьвітку» (да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі): **13** (пт) 17.00; **14, 15** (сб, ндз) 17.10.
**«Цэнтральны»** (200-34-16)
«Ад 180 і вышэй» (2с): **13** (пт) 13.30, 19.00 (сэанс зь сюрпрызам ад «Fruiting»); **14, 15** (сб, ндз) 11.00 (іл), 16.00.
«Званок-2»***: **13** (пт) 21.00; **14, 15** (сб, ндз) 18.30, 21.00.
«Чырвонае неба. Чорны сьнег» (да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі): **13** (пт) 11.00; **14, 15** (сб, ндз) 13.30.
«А гэта ж было, ці Споведзь Вовы Сьвярдлова, колішняга вязьня дзіцячага лягеру» (д/ф, клюб дакумэнтальнага кіно): **13** (пт) 16.00 (творчая сустрэча з рэжысэрам Л.Слобіным).

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

### Тэатар юнага гледача

**12** (чц) — «Тарас на Парнасе».
**14** (сб) — «Неймаверныя прыгоды Мішуткі і яго сяброў у краіне Казак».
**15** (ндз) — «Гісторыя каханьня Паласатага Ката і сэньярыты Ластаўкі».
**15** (ндз) — «Маленькі лорд Фаўнтлерой» (экспэрымэнтальная сцэна).
**17** (аўт) — «Рыцар Ордэна Сонца».
**18** (ср) — «Натуры злой належнія плён».

### Тэатар беларускай драматургіі

**15** (ндз) — «Воўк-марапла-вец».

### Опэра

**22** (ндз) — «Пітэр Пэн».

## КІНО ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**«Аўрора»**
«Шалёныя скачкі»: **13** (пт) 14.30; **14, 15** (сб, ндз) 11.30.
**«Берасьце»**
«Супэрсямейка»: **13** (пт) 15.00; **14, 15** (сб, ндз) 11.30.
**«Дружба»**
«Алёша Паповіч і Тугарын Зьмей»: **13** (пт) 11.00, 13.00; **14** (сб) 13.00.
«Андрэ»: **14** (сб) 11.00.
**«Масква»**
«Сем'янін» («Выхадны — усёй сям'ёй!»): **15** (ндз) 12.00.
**«Мір»**
«Шалёныя скачкі»: **13** (пт) 15.00; **14, 15** (сб, ндз) 13.00, 15.00.
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **14, 15** (сб, ндз) 14.00.
**«Перамога»**
«Шчаўкунок»: **14** (сб) 12.00; **15** (ндз) 13.00.
**«Піянер»**
«Пінокіё-3000»: **13** (пт) 12.00; **14, 15** (сб, ндз) 10.00, 13.30.
«Зачараваная Эла»: **13** (пт) 14.00; **14, 15** (сб, ндз) 11.40.

## КІНО НА DVD

MASTER RECORDS

**«Ля мора»**
Біяграфічная драма, ЗША—Вялікабрытанія, рэж. **Кевін Спэйсі.**
У ролях: **Кевін Спэйсі, Кейт Басуорт.**
Кевін Спэйсі апавядае пра рок-музыканта Боба Дэрына. Рэальнасьць, інтрыгі, успаміны й музыка сплятаюцца разам.

**«Усё пра каханьне»**
Трылер, Данія—ЗША—Японія, рэж. **Томас Вінтэрбэрг.**
У ролях: **Клер Дэйнз, Хаакін Фэнікс, Шон Пэн.**
У 2021 годзе, калі парушаны законы прыроды, героі мусяць захаваць каханьне...
Кісялёва, 12, Менск, т.643-21-08.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Скачкі ўмелай зэбры



«Шалёныя скачкі» («Racing Stripes»)
ЗША—ПАР, 2005, каляровы, 84 хв.
**Жанр:** кінакамэдыя для ўсёй сям'і
**Адзнака:** 5 (з 10)

Калі вы згубілі свой цырк і выхоўваліся на фэрме, калі вас не пускаюць да багатых суседзяў і з вас сьмяюцца чыстапародныя скакуны — толькі таму, што вы зэбра, — у вас усё роўна ёсьць шанец выйграць скачкі на іпадроме. Для гэтага трэба быць упартым, вучыцца, слухаць парады сяброў — і мець добрае сэрца.

Зэбраня Палосік, якое адстала ад свайго цырку, знаходзіць на фэрме Нолана (Брус Грынвуд) любоў і ласку дзяўчынкі Чэйні (Хейдэн Панэцьеры). У Ноланавай сям'і калісьці адбылося няшчасьце: маці Чэйні загінула на скачках. Пасьля гэтых падзей фэрмэр, які быў калісьці выдатным трэнэрам, адышоў ад коннага спорту. Але ягоная дачка мае мару. Мае мару і зэбраня.

Сямейная кінакамэдыя бэльгійца Фрэдэрыка Дзю Шо зробленая паводле ўсіх правілаў і з акуратным выкарыстаньнем кампутарных тэхналёгій. Жывёлы ў фільме (як у папярэдніх амэрыканскіх камэдыях коцікі, сабачкі, сьвінкі) размаўляюць, дэманструючы ўсё багацьце чалавечае мімікі й дасьціпнасьць (асабліва гаваркімі зьяўляюцца дзьве гнаявыя мухі-рэпэркі, ад якіх дастаецца адмоўнаму герою — каню-моцарталюбу).

Дабро перамагае, а кепская цёця-іпадромшчыца, якая змагаецца за чысьціню конскай крыві, ідзе адмывацца.

Антырасісцкі патас карціны, зробленай пры ўдзеле Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі, увасоблены ў форму нясумнага й простага відовішча.

Сябры Палосіка — казачныя характары-маскі. Мудрая каза, дасьведчаны мул, прыдуркаваты певеньгадзіньнік і прыблудны пэлікан, гангстэр і выхваляка. Усе яны — і нават мухі-рэпэркі — шчыруюць на ніве выхаваньня сапраўднага перамоўцы (якім можа стаць кожны, хто мае спагадлівае й добрае сэрца — і волю змагацца за сваю мару).

Гэтае кіно не хапае зорак зь неба; яно саступае бліскучаму «Ў пошуках Нэма», але фільм «Шалёныя скачкі» зроблены прафэсійна, лёгка й годна.

**Андрэй Расінскі**

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Хачу быць Падполіем!

Тапанімічныя забабоны ўладаў — не суб'ектыўны капрыз, як сьцьвярджае апазыцыя, а заранак культурнай рэвалюцыі. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Калдырна, што і казаць, адрэагавала наша грамадзкасьць на зьмену назваў цэнтральных праспэктаў сталіцы. Дружна сьпісалі навацыі на эгацэнтрызм кіраўніка дзяржавы, быццам бы яму недаспадобы езьдзіць па праспэкце імя Машэрава.

Я разумею нашых інтэлектуалаў. Пакуль яшчэ цяжка без эмацыйнага ступару асэнсаваць згаданыя рэформы. Фэномэну вандруючых назваў вуліц гісторыя яшчэ ня ведала. Калі такая ратацыя будзе працягвацца і далей, то да 2045 году праспэкт Скарыны пераедзе на Вэлясыпэдны завулак.

Між тым, сэнс тапанімічнай рэформы куды больш маштабны. Дэ-факта гаворка ідзе пра новы падыход да партызанскай спадчыны. Цяпер яна, відавочна, трактуецца ўжо не як эпізод (нават супэргераічны эпізод) гісторыі, а, выкарыстоўваючы тэрміналёгію Яспэрса, як нацыянальны «восевы час». Час, калі ў беларусаў прабудзілася нейкая калектыўная рэакцыя на знадворныя геапалітычныя раздражняльнікі.

Натуральна, узьнікае крамольная думка: калі партызанскі рух быў самай маштабнай праявай беларускай справы, то чаму б яго інстытуты не адаптаваць да сучаснасьці? Чаму, напрыклад, не замяніць адмінвэртыкаль партызанскай вэртыкальлю? Наверсе павінен знаходзіцца камандзір брыгады, які без усялякіх падзелаў паўнамоцтваў аддае загады. За выкананьне якіх, па законах вайсковага часу — чытай, залатога веку беларускай гісторыі, — «піфпаф». Сапраўды, вельмі эфэктыўны грамадзкі мэханізм, зь якім можна лёгка вырашаць праблему падваеньня ВУП.

І натуральна, можна і трэба паставіць пытаньне пра ролю вэрбальнай формулы і лінгвістычнай адзінкі ў працэсе вяртаньня да партызанскіх вытокаў нацыі.

Гэта заўважыў яшчэ Канфуцый, які на пытаньне кіраўніка царства Вэй, што б ён зрабіў, прыйшоўшы да ўлады, у першую чаргу, адказаў: «Абавязкова выпраўлю імёны… калі імёны ня выпраўленыя, то мова не ідэальная; калі мова не ідэальная, то ў справах няма посьпеху; калі у справах няма посьпеху, то рытуал не карыстаецца аўтарытэтам — у такім разе пакараньні не дасягаюць мэты». Як вынік — рэзультат: «Народ зьбіты з толку і ня ведае, што рабіць».

Іншымі словамі, мова (і перш за ўсе, назвы) — стратэгія адміністрацыйнага кіраваньня, мэта якога — канструкцыя этычных паводзін.

Праблема палягае ў тым, што прысутнасьць новай тапанімікі вельмі фрагмэнтарная і, калі не перанесьці новыя павевы ў штодзённае жыцьцё, экспэрымэнт можа накрыцца бумбаўлітаўскім тазікам.

Таму фіналам сучаснай кампаніі за правільныя назвы павінна быць нешта падобнае да рэформы імёнаў у Турэцкай Рэспубліцы. Каб давесьці сьвецкі характар дзяржавы, прэзыдэнт Мустафа Кемаль загадаў усім туркам выбраць новыя імёны, якія не нагадвалі б пра асманскае мінулае. Натуральна, падчас гэтага шапачнага разбору Кемаль адхапіў сабе самую «пятку», выбраўшы імя Атацюрк, што ў перакладзе азначае «бацька ўсіх турак».

Чым мы, беларусы, горшыя — няхай кожны выбера сябе новае імя, зьвязанае з часамі ВАВ. Напрыклад, я б без балды з задавальненьнем узяў сабе імя Падполі, а калі б быў кабетай — Вялікая Зямля. Ну а Яму сам бог загадаў перахрысьціцца ў «Бацьку ўсіх партызан» (БУП).




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ФАЛЬШ, ЦЫНІЗМ І АФІЦЫЁЗ. Сьвяткаваньне Дня Перамогі.** **Старонкі 4, 5.**

Запрашаем у падарожжа

**22 траўня**

**Менск—Смургоні—Залесьсе—Солы—Жупраны—Гальшаны—Баруны—Крэва—Менск.**

Кошт: 20 тысяч рублёў

**Т.: 279-05-85, 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер), 364-12-38, 776-24-35 (Павал)**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КАСТЫНГ

**Сумесны праект «НН» і «Навінкі»** абвяшчае кастынг на галоўныя ролі ў фатакоміксе. Патрэбныя хлопцы і дзяўчаты 18—24 гадоў. Кантакт: greens@tut.by.

### КАНТАКТЫ

**Дзеля аб'яднаньня** маладых пэрспэктыўных беларускамоўных перакладнікаў, падтрымкі іх пасьля заканчэньня ВНУ ініцыявана стварэньне Згуртаваньня маладых перакладнікаў.

29 траўня ў Менску мае адбыцца Ўстаноўчы сход арганізацыі. Арганізатарам выступіла ўстанова «Цэнтар моладзевай інфармацыі і дакумэнтацыі». Да ўдзелу запрашаюцца студэнты старэйшых курсаў лінгвістычных/філялягічных факультэтаў ВНУ (4—5 курс), а таксама маладыя спэцыялісты.

Заяўку на ўдзел можна сьцягнуць тут: http://adukacyja.info/download/application.doc. Запоўненыя заяўкі дасылайце на адрас: cyid@euro26.by

### ВІТАНЬНІ

**Шаноўная спадарыня Марыя Сафро!** З Днём народзінаў! Здароўя, аптымізму, шчасьця проста жыць на зямлі! Выпускнікі 1954 году, Пінск

**Віншуем Віктара Шляхціна** з Днём народзінаў. Віцебскі «Малады фронт»

### КНІГІ

Буду ўдзячны таму, хто прадасьць 4-ты том «Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі». Т.: 288-14-52, 328-56-78. Аляксей

**Дапамагу** знайсьці патрэбную кнігу. Т.: 753-91-96

**Прадам кнігі**: «Творы» Гётэ, «Творы» К.Каліноўскага, «Змагарныя дарогі» К.Акулы, «Ад родных ніў» Л.Геніюш, Прага, 1942 г., факс. выд., «Армія Краёва на Беларусі» Я.Сямашкі ды інш., багаты выбар кніг па гісторыі, архітэктуры, паэзіі, мастацве, археалёгіі. Т.: 8-029-753-70-05

**Прадам кнігі**: энцыкляпэдыю «Археалёгія і нумізматыка Беларусі», «Тэўтонскі ордэн» А.Краўцэвіча, «Кароткая гісторыя Беларусі» В.Ластоўскага, факс. выд. 1910 г. «Белорусское народное зодчество» ды інш. Т.: 753-70-05

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17-й. Т.: 235-18-72. Юры

### СПАЧУВАНЬНЕ

**Жонцы і дачкам** з прычыны сьмерці мужа, таты, журналіста й гісторыка Яўгена Гарэліка. Супрацоўнікі «Нашай Нівы»

Прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

### КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на стар. 24

**Рэклямныя расцэнкі:**
— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.
За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль)— 4000 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 650 руб.
Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.
Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764. На зваротным баку блянку паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».
Даведкі праз т. (017) 284-73-29

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3431. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 20.00 11.05.2005.

Замова № 2711.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а